ЛіМ

Літаратура і мастацтва

газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

31 МАЯ 2002г. № 21 - 22/4155 - 4156 КОШТ 295 РУБ.

ВЯСКОВАЯ ПРАЎДА

Нататкі Уладзіміра МІХНО

5

А КРЫНІЦЫ БРУЯЦЦА...

Павел МІСЬКО — пра чарговы зборнік "Бібліятэкі часопіса "Маладосць"

6—7

НОВЫЯ ВЕРШЫ

Васіля ЗУЁНКА

8

КАВА ДЛЯ ДАМАВІКА

Апавяданне Раісы Баравіковай

9

НАВУЧЫЦЬ ПРАФЕСІІ ТВОРЦЫ

Роздум Рычарда СМОЛЬСКАГА пра беларускую мастацкую школу, яе надзеі і перспектывы

10—11

ВІЛЕНСКІЯ МРОІ НАПАЧАТКУ ДВАЦЦАЦЬ ПЕРШАГА СТАГОДДЗЯ

Эсэ Уладзіміра СОДАЛЯ

14—15

БУДЗЬМА РАЗАМ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 2002 ГОДА!

Шаноўныя чытачы!

Падпіска на "ЛіМ" на другое паўгоддзе будзе цягнуцца да 20 чэрвеня. Пастарайцеся да гэтага часу схадзіць у любое паштовае аддзяленне, каб пасля не шкадаваць, што засталіся без "ЛіМа". Кошт індывідуальнай падпіскі на адзін месяц — 1 950 рублёў, на тры — 5 850 рублёў, на паўгоддзе — 11 700 рублёў.

Індывідуальны індэкс — 63856.

Кошт ведамаснай падпіскі на адзін месяц — 3 500 рублёў, на тры — 10 500 рублёў, на паўгоддзе — 21 000 рублёў.

Ведамасны індэкс — 63857.



Фота Ю. ЗАХАРАВА

Вольнаму — воля...

КОЛА ДЗЁН

24 мая Праваслаўная царква ўшаноўвала памяць святых Кірылы і Мяфодзія. У гэты ж дзень мы адзначалі Дзень славянскага пісьменства і культуры. Першаму святу — сотні гадоў, другому — пайшоў другі дзесятак. Але гэтыя святы для нас аднолькава светлыя, як вясновае сонца ў чыстым небе над Айчынай, бо яны нашы. А заўтра будзе лета — час адпачынкаў і вандровак...

ВІЗІТ ТЫДНЯ

Візіт у Мінск дэлегацыі Масквы на чале з яе мэрам Юрыем Лужковым стаў чарговым рэальным крокам ва ўмацаванні супрацоўніцтва паміж нашай краінай і расійскай сталіцай, якая з'яўляецца стратэгічным гандлёвым партнёрам Беларусі. У першым квартале 2002 года тавараабарот паміж рэгіёнамі Беларусі і акругамі Масквы ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года вырас амаль на 10 працэнтаў і склаў 734,3 мільёна долараў.

ДАТА ТЫДНЯ

25 мая ў Полацку прайшлі ўрачыстасці з нагоды Дня горада. Полацк з'яўляецца самым старажытным беларускім горадам (упершыню згадваецца пад 862 г.) і сёлета адзначае 1140-годдзе. Згодна з рашэннем гарвыканкама, святкаванні Дня горада ў Полацку з гэтага часу будуць ладзіцца ў апошнюю суботу мая.

ВЫСТАВА ТЫДНЯ

У штаб-кватэры ЮНЕСКА ў Парыжы адкрылася выстава, прысвечаная 200-годдзю з дня нараджэння выдатнага навукоўца і педагога, грамадскага дзеяча, ураджэнца Беларусі і нацыянальнага героя Чылі Ігнація Дамейкі (1802—1889 гг.). Выстава наладжана сумеснымі намаганнямі Беларусі, Літвы, Польшчы, Францыі і Чылі — краінамі, з якімі былі звязаны жыццё і дзейнасць І. Дамейкі.

ПЛАНЫ ТЫДНЯ

Урад нашай краіны плануе з восені ўвесці для аўтааматараў плату за праезд па трасе Брэст—Мінск—Масква. Цяпер плата за праезд па гэтай трасе не збіраецца з дзвюхвосевага грузавога транспарту і з легкавых аўтамабіляў. Колькі трэба будзе плаціць за праезд — яшчэ не вызначана, але, мяркуецца, што аплата будзе нязначнай ды абавязковай для ўсіх уладальнікаў аўтатранспарту.

УЗНАГАРОДЫ ТЫДНЯ

Галоўны прыз 55-га Канскага кінафестывалю — "Залатую пальмавую галінку" — атрымаў фільм французскага рэжысёра Рамана Паланскі "Піяніст". Другую па значнасці прэмію — Гран-пры журы фестывалю атрымала сацыяльная камедыя фінскага рэжысёра Акі Каўрысмякі "Чалавек без мінулага". У асноўнай конкурснай праграме было прадстаўлена 25 фільмаў з 15 краін, уключаючы шэдэўр расійскага рэжысёра Аляксандра Сакурава "Рускі каўчэг", пра які шмат хвалебнага гаварылася на расійскім тэлебачанні, і, на жаль, толькі гаварылася...

ПЕРСПЕКТЫВА ТЫДНЯ

На сённяшні дзень ільготамі на праезд у пасажырскім транспарце карыстаюцца 65 працэнтаў пасажыраў. Страты, якія панеслі транспартнікі ў мінулым годзе, склалі каля 80 мільярдаў рублёў. Толькі 25 працэнтаў гэтай сумы былі кампенсаваныя дзяржавай. Асноўнай праблемай транспартнікаў з'яўляецца зношанасць рухомага саставу, які складае 75 працэнтаў. Для яго аднаўлення ў Мінтранса няма сродкаў. Вырашыць гэтую праблему можна толькі праз закупку пасажырскага транспарту ў беларускіх вытворцаў па лізінгу. Ужо падрыхтаваны праект указа Прэзідэнта, згодна з якім 50 працэнтаў аўтамабільных збораў павінны будуць выкарыстоўвацца на набыццё тэхнікі ў лізінг.

НАВІНА ТЫДНЯ

Новы цягнік фарміравання Беларускай чыгункі пачынаючы з 3 чэрвеня будзе курсіраваць па напрамку Мінск—Таллінн. Праўда, не кожны дзень, а два разы ў тыдзень па панядзелках і пятніцах. Адпраўляцца з Мінска ў сталіцу Эстоніі цягнік будзе ў 11 гадзін 33 хвіліны. Цана білета ў плацкартным вагоне складзе 41 300 рублёў, а ў купэйным — 63 750 рублёў. Словам, калі ў вас ёсць справы ў Эстоніі, то купляйце білеты ўжо сёння...

САЦЫЯЛОГІЯ ТЫДНЯ

Закрытае акцыянернае таварыства "Сацыяльныя і экалагічныя даследаванні" па заказе грамадскага аб'яднання "Жаночы незалежны дэмакратычны рух" у красавіку гэтага года правяло апытанне, падчас якога былі апытаны 1000 рэспандэнтаў ва ўзросце 15—49 гадоў і 103 чалавекі — ад 50 да 65 гадоў. Пытанне было адно: "Ці плануеце павелічэнне сваёй сям'і?". Большасць — 53 працэнты — апытаных сацыёлагамі жыхароў нашай краіны не плануюць павелічэнне сваіх сям'яў за кошт нараджэння дзяцей. 31 працэнт хочуць, каб іх сям'я павялічылася. 16 працэнтаў апытаных пакуль канчаткова не вызначыліся ў гэтым пытанні. Асобы, якія не плануюць нараджэння дзяцей, спасылаюцца ў першую чаргу на ўзрост (" не той узрост" — 41 працэнт). 37 працэнтаў апытаных матывуюць свой адказ матэрыяльнымі цяжкасцямі. 29 працэнтаў адказалі, што ў іх сям'і ўжо дастаткова дзяцей. Мяркуючы па тым, што ў нас большасць сем'яў маюць аднаго ці дваіх дзяцей, то перспектывы з колькасцю насельніцтва ў нашай краіне не вельмі вясёлыя...

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ТЫДНЯ

26 мая ў Нацыянальным аэрапорце "Мінск" адбылася прэзентацыя кіпрскай авіякампаніі "Аэратранс". З 28 мая два разы на тыдзень "Аэратранс" стала ажыццяўляць рэйсы па маршруце Мінск—Ларнака (праз Кішынёў). Білеты не танныя, але пасажыраў не так ужо і мала...

РАШЭННЕ ТЫДНЯ

З 1 ліпеня па рашэнні Мінгарвыканкама пасажыраў сталічнага транспарту чакае змяненне відаў праязных — яны будуць падзяляцца выключна на наземныя і метрапалітэнаўскія.

Слова Купалы да творчасці кліча

Святая зямля Янкі Купалы... Славутыя Акопы, дзе маладому Янку дыктаваў геніяльныя строфы сам Бог. Менавіта тут два дні доўжыўся пяты злёт маладых паэтаў Міншчыны пад патранажам абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна. І гасцінныя гаспадары з Лагойска, і дырэктар бібліятэкі Наталля Чуева стварылі ўсе ўмовы для маладых творцаў, якія з'ехаліся літаральна з усіх раёнаў Міншчыны.

Гэтым разам тут плёна працавалі два семінары, якімі кіравалі Раіса Баравікова і Алесь Пісьмянкоў, Галіна Каржанеўская і Віктар Шніп, а назаўтра да пачаткоўцаў прыехалі Эдуард Акулін і Людміла Рублеўская. Прыемна адзначыць, што семінарысты паказалі даволі высокі ўзровень майстэрства, што і засведчыў пяты выпуск калектыўнага зборніка "Слова Купалы да творчасці кліча". Дарэчы, лепшыя творы семінарыстаў будуць змешчаны ў традыцыйным лімаўскім "Дні паэзіі".

Закончыўся злёт прыгожым святам, дзе ўрачыста і годна гучалі беларускае слова і беларуская песня.

Сымон КАНІЦКІ
Фота С. ЛУК'ЯНАВА

Адкрыццё свята

У лагойскіх майстроў

Аўтограф паэткі

За маладымі — будучыня!

Тыдзень культуры ў Францыі

Прайшоў Тыдзень культуры Рэспублікі Беларусь у Парыжы. Гэтая знамянальная падзея была арганізавана Міністэрствам культуры пры падтрымцы Пасольства Рэспублікі Беларусь у Францыі і пад патранажам вядомага французскага куцюр'е і мецэната, Пасла добрай волі ЮНЕСКА П'ера Кардэна.

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатра імя Якуба Коласа прадставіў гледачам спектакль "Шагал, Шагал..." у пастаноўцы заслужанага дзеяча мастацтваў рэспублікі В. Баркоўскага. Гэты спектакль адзначаны прызамі на Міжнародным Эдынбургскім фестывалі і на Міжнародным тэатральным фестывалі "Белая вежа" ў Брэсце.

Увазе аматараў выяўленчага мастацтва былі прапанаваны 72 работы сучасных беларускіх мастакоў і скульптараў розных пакаленняў і творчых накірункаў і стыляў, што адлюстроўваюць характэрныя рысы беларускай школы выяўленчага мастацтва.

Спецыяльна да адкрыцця Тыдня культуры па ініцыятыве П'ера Кардэна на вернісажы былі выстаўлены 7 работ Марка Шагала.

Наведвальнікі Тэатра П'ера Кардэна змаглі парадавацца майстэрствам ансамбля салістаў "Класік-авангард" Беларускай дзяржаўнай філармоніі, вядучых салістаў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы Т. Трацяк, В. Пятрова, С. Франкоўскага і лаўрэата міжнародных конкурсаў цымбаліста М. Лявончыка.

Інфармацыю пра Тыдзень культуры і яго мерапрыемствы змясцілі на сваіх старонках такія выданні, як "Фігара", "Фігараскоп", "Парыскоп", "Пары-Панам".

У цырымоніі адкрыцця Тыдня прынялі ўдзел міністр культуры Рэспублікі Беларусь Леанід Гуляка, Генеральны дырэктар ЮНЕСКА Каішыра Мацуура і П'ер Кардэн, а таксама прысутнічалі кіраўнікі і супрацоўнікі дыпламатычных прадстаўніцтваў шэрагу краін, акрэдытаваных у Парыжы.

У прывітальнай прамове Генеральны дырэктар ЮНЕСКА назваў правядзенне мерапрыемства "паспяховай ініцыятывай, якая дазволіць парыжскай публіцы адкрыць для сябе і бліжэй пазнаёміцца з своеасаблівай і багатай культурай Беларусі".

У рамках Тыдня Леанід Гуляка правёў шэраг дзелавых сустрэч і перамоў, у тым ліку з Каішыра Мацуура, які пацвердзіў свой намер наведаць з візітам Рэспубліку Беларусь у ліпені гэтага года.

Н. К.

Святкаванне ў Ізяслаўлі

Гурт беларускай культуры "Зорка Венера" правёў паэтычную імпрэзу, прысвечаную 120-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы. У актавай зале гарадской бібліятэкі сабраліся шматлікія аматары паэзіі. З дынамікаў гучыць запіс славутай "Спадчыны" ў выкананні ансамбля "Песняры", позіркі прысутных скіраваны на партрэт Янкі Купалы, пад якім на белым палотнішчы чырвонымі літарамі выпісаны словы з верша "Моладзі" — "На цябе, наша моладзь, надзея..." Над партрэтам — нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны.

Купалаўскія вершы чыталі дзесяцігадовая Алеся Мудрык, Сяржук Кастушэвіч, Алеся Мозуль, Яўген Дамброўскі, Аксана Галіч, Алесь Яравы, Юля Голік, Дзмітрок Франчук ды іншыя.

Завяршылася свята праглядам відэафільма "Мінск. Спатканне вясны", у якім файна паказаны ва ўсёй сваёй прыгажосці Купалаў парк, помнік Паэту...

Рычард ЯГЕЛОНЧЫК, сябра гурта беларускай культуры "Зорка Венера".
г. Ізяслаў, Украіна

У Саюзе беларускіх пісьменнікаў

На сустрэчы, прысвечанай 100-годдзю Язэпа Пушчы, што адбылася ў бібліятэцы СБП, прачулыя словы ў гонар выдатнага паэта, крытыка, перакладчыка сказалі Вольга Іпатава, Арсень Ліс, Уладзімір Гніламёдаў, Аляксей Рагуля, Алег Трусаў. Лідзія Іосіфаўна Барцэвіч — дачка паэта — падзялілася ўспамінамі пра бацьку. Эдуард Акулін і Валерыя Кустава выканалі свае песні. Вучаніца Навадворскай сярэдняй школы Вераніка Коршун прачытала вершы Язэпа Пушчы "Песні сэрца" і "Ветры ласкавымі сталі..."

●

Па хадайніцтве Саюза беларускіх пісьменнікаў і Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Францыска Скарыны адбылося адкрыццё памятнай дошкі Я. Лучыны ў Мінску па вуліцы, што носіць імя славутага паэта-дэмакрата. На ўрачыстасці прысутнічалі У. Мархель, В. Іпатава, Л. Уладыкоўская-Канаплянік, У. Содаль, прадстаўнікі выканкама Ленінскага раёна і Упраўлення культуры Мінгарвыканкама.

●

Кнігі беларускіх пісьменнікаў розных пакаленняў прывезла і перадала ў Дом культуры вёскі Глінішчы, радзімы народнага пісьменніка Івана Мележа, старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Вольга Іпатава.

●

Разгляду арганізацыйных пытанняў было прысвечана чарговае пасяджэнне Рады СБП.

●

Па добрай традыцыі пісьменнікі і прадстаўнікі грамадскасці сабраліся 25 мая ля помніка Максіму Багдановічу ў Мінску, каб ушанаваць памяць паэта, паразважаць пра заўтрашні дзень нашай літаратуры.

Н. Р.

ІМПРЭЗЫ

Ад вучэльняў — акадэміі

Сёлета свой юбілей адзначае Беларуская акадэмія музыкі. Яе 70-годдзе выклікала актыўны розгалас па краіне. Напрыклад, амаль з пачатку года ў Акадэміі музыкі адбываюцца святочныя канцэрты, аб'яднаныя ў серыю пад назвай "Фестываль музычных вучылішчаў".

Пры канцы сакавіка і ў пачатку красавіка павіншаваць Alma mater устаноў сярэдняга звяна музычнага навучання прыехалі прадстаўнікі Баранавіцкага і Лідскага музычных вучылішчаў. Канец красавіка быў адзначаны віншавальным канцэртам сімфанічнага аркестра Мінскага музычнага вучылішча імя М. Глінкі, а таксама выступленнем творчых калектываў Брэсцкага музычнага каледжа імя Р. Шырмы. На пачатку мая сваё шанаванне "юбіляру" выказалі Рэспубліканскі каледж пры БАМ і педагагічны факультэт Акадэміі музыкі, які працуе ў Магілёве.

Музычныя ўстановы Беларусі ўключалі ў праграмы канцэртаў сваіх лепшых прадстаўнікоў. Зацікаўленая публіка змагла пачуць самыя розныя творы ў выкананні харавых калектываў, сімфанічных аркестраў і аркестраў народных інструментаў, трыо баяністаў-акардэаністаў, а таксама квартэта. У якасці салістаў выступалі не толькі студэнты розных аддзяленняў — лаўрэаты міжнародных і нацыянальных конкурсаў, саліраваў і народны артыст Бурацыі, заслужаны артыст Расіі Барыс Пяцюк.

Удзельнікі фестывалю музычных вучылішчаў паставіліся да справы вельмі сур'ёзна, таму і канцэрты святочнай серыі парадавалі слухачоў цікавымі праграмамі, своеасаблівасцю атмасферы кожнай імпрэзы. Акрамя таго, сталічныя меламаны мелі рэдкасную магчымасць пазнаёміцца з творчым жыццём музычных асяродкаў, якія знаходзяцца па-за межамі Мінскай вобласці .

Музычнымі ўстановамі, пра якія тут ішла гаворка, зразумела, не вычэрпваецца іх кола на Беларусі. Таму будзем чакаць новых юбілейных сюрпрызаў, новых канцэртаў.

Марына МРАЧКО,
студэнтка II курса БАМ

Ці пагражае нам глабалізацыя ?

Адбылося пасяджэнне круглага стала "Дзяржава і культура", які быў ініцыяваны Нацыянальным навукова-асветным цэнтрам Францыска Скарыны. Па словах арганізатараў, сустрэча стала адным з этапаў падрыхтоўкі міжнароднага сімпозіума "Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі". Апошні мае адбыцца ўжо ў гэтым месяцы і пройдзе пад эгідай ЮНЕСКА. Мэта круглага стала — абмеркаванне праблем узаемаадносінаў дзеячаў культуры з дзяржавай на сучасным этапе.Да працы былі запрошаныя прадстаўнікі заканадаўчай і выканаўчай улады, навуковай грамадскасці, кіраўніцтва некаторых грамадскіх арганізацый і культурна-асветных асяродкаў. Арганізатары спадзяваліся параўнаць дэкларуемыя ЮНЕСКА прынцыпы з беларускай рэчаіснасцю. Як вядома, у адпаведным дакуменце гэтай сусветнай арганізацыі сцвярджаецца, што "захаванне і спрыянне культурнай разнастайнасці немагчымае толькі праз рынак". Галоўнай тут з'яўляецца дзяржаўная палітыка. Аднак не дзяржава сама па сабе, а супольнасць апошняй з прыватным сектарам і грамадскімі арганізацыямі. Таму натуральна, што ўдзельнікі круглага стала не толькі чарговы раз указалі на недахопы нацыянальнага заканадаўства, але і звярнулі ўвагу на адсутнасць прававой культуры.

Сённяшнія ўмовы развіцця чалавецтва вымушаюць, так бы мовіць, даганяць цывілізаваныя краіны, улічваць іх вопыт і ўжо сталыя тэндэнцыі. Пры гэтым даводзіцца сыходзіць з канкрэтнай беларускай сітуацыі. Зразумела, каб вырашыць увесь комплекс гэтых праблем, адной такой сустрэчы недастаткова, а таму яе арганізатары імкнуліся хаця б давесці сваю думку да уладных структур. Для тых, хто не застанецца абыякавым да праблем нашага нацыянальнага развіцця, выпрацаваны канкрэтныя прапановы і рэкамендацыі. Цікава, што ў іх не толькі даюцца парады, але і пэўным чынам крытыкуюцца творцы. Апошнія, па словах арганізатараў, не павінны замыкацца ў межах традыцыйнай культуры, абавязаны працаваць у новых накірунках.

На жаль, падзяліцца з журналістамі сваімі ўражаннямі пра пачутае пажадалі ўсяго некалькі ўдзельнікаў форуму. Так, прафесар Уладзімір Конан станоўча выказаўся наконт даклада Анатоля Зелянкова "Глабалізацыя: перспектывы дзяржавы і культуры". У ім навуковец сцвярджае, што глабалізацыя ёсць па сутнасці наступ Амерыкі на нацыянальныя культуры і выратавання варта шукаць выключна ў саюзе з Расіяй. Спадар Конан адзначыў, што хаця і не згодны з пунктам гледжання дакладчыка, аднак не можа адмовіць яму ў прафесійнасці. На думку прафесара, глабалізацыя не праблема выключна XX-XXI стагоддзяў, падобныя праблемы з'яўляліся і значна раней. Ён згодны, што сучасная глабалізацыя — гэта новая форма імперыялізму, аднак не ўпэўнены ў тым, што яна нейкім чынам пагражае Беларусі. Як бы тое ні было, сцвярджае Конан, няма ніякіх падстаў, кіраючы на працэс глабалізацыі, называць выбітных беларускіх дзеячаў сіяністамі ці яшчэ кімсьці.

З ім пагадзіўся і супрацоўнік Скарынаўскага цэнтра Юры Хацкевіч. У сваёй прамове, закрануўшы балючае пытанне суадносін дзяржавы і культуры, ён адкінуў саму магчымасць таго, што ўсё наша нацыянальнае павінна развівацца ва ўмовах рынку. "Нават вельмі моцныя культуры, якім нішто не пагражае (напрыклад, французская) абараняюцца на дзяржаўным узроўні адпаведнымі дакументамі", — сказаў ён. І тут як ніколі актуальнай уяўляецца Хацкевічу праблема цэнзуры. Фармальная адсутнасць апошняй у заканадаўстве, на яго думку, зусім не значыць, што гэтай заганнай з'явы не існуе ўвогуле."Культура не церпіць цэнзуры!"— заявіў супрацоўнік Скарынаўскага цэнтра, згадваючы некаторыя з апошніх падзей.

Аляксандр Краўцэвіч, старшыня Беларускага гістарычнага таварыства, парадаваўся магчымасці выказацца па-за межамі "беларускай субкультуры" і нейкім чынам апеліраваць да міжнароднай супольнасці. Што да ўражанняў ад круглага стала, то гісторык адзначыў, што прысутныя былі падзелены на дзве часткі не толькі адрознасцю ацэнак глабалізацыі, але і моўна. Характарызуючы ўсё той жа даклад спадара Зелянкова, Краўцэвіч сказаў, што прамоўца "плакаў па валасах калі адсякалі галаву. Там, дзе склаліся зусім іншыя адносіны паміж дзяржавай і культурай (Францыя і Германія), глабалізацыя сапраўды актуальнае пытанне. У нас найважнейшае іншае пытанне — асіміляцыя з боку Расіі. Пра гэта ў першую чаргу і трэба гаварыць". А таму для нас глабалізацыя (амерыканізацыя) можа нават разглядацца як станоўчы працэс, працэс супрацьдзеяння пэўным тэндэнцыям з усходу.

Як бачым, палохаюць зацікаўленых асоб розныя рэчы (адных —Амерыка, другіх — Расія). Аднак бясспрэчна адно — пагроза для нашай культуры існуе.

Вадзім ДОЎНАР

У рэдакцыю газеты "Літаратура і мастацтва"

Прашу паведаміць чытачам, што, канчаткова пераканаўшыся ў няўмеласці і непаслядоўнасці дзеянняў кіраўніцтва Саюза беларускіх пісьменнікаў у цяжкі для роднай літаратуры час, я не лічу магчымым заставацца ў складзе Рады СБП і заяўляю аб выхадзе з яе.

Генадзь БУРАЎКІН

20.V.2002 г.

АБСЯГІ

ГРОДЗЕНШЧЫНА...

Дыялог з сусветам

У Гародні прайшла творчая вечарына паэткі Дануты Бічэль. Вершы яе чаруюць біблейскай прастатой, вучаць любіць жыццё, нацыянальныя традыцыі, харастро роднай Гродзеншчыны, паэтызуюць народны побыт, нормы хрысціянскай маралі, спрадвечныя чалавечыя каштоўнасці. Глыбока філасофская, аналітычная па сваёй сутнасці, гэтая паэзія — своеасаблівы дыялог паэткі з прыродай, грамадствам, мінулым і сучасным Беларусі, увогуле — з усім сусветам. На вечарыну прыйшлі студэнты, вучні, выкладчыкі, паэты і празаікі, кампазітары і барды, сябры Дануты Янаўны.

Васіліса ПАЗНУХОВА

БРЭСТЧЫНА...

Піншчына святкуе юбілей

Якуб Колас амаль шэсць гадоў жыў і працаваў на Піншчыне. У 1912 годзе Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч быў прызначаны настаўнікам у трэцюю прыходскую вучэльню Пінска. Жыў на вуліцы Водаправоднай (зараз Івана Чуклая) у доме фельчара чыгуначнай станцыі калежскага рэгістратара Арсенія Балевіча. Гэта быў плённы перыяд і ў творчым жыцці песняра. Пінскія ўражанні знайшлі глыбокае мастацкае ўвасабленне ў коласаўскіх творах гэтага перыяду.

Пінчукі свята берагуць памяць пра выдатнага сына беларускага народа. На будынку былой прыходскай вучэльні па вуліцы Чыгуначнай і на доме, дзе жыў пісьменнік, устаноўлены мемарыяльныя дошкі. Ёсць у горадзе вуліца Якуба Коласа. У Пінскім музеі Беларускага Палесся захоўваюцца дзесяткі экспанатаў, звязаных з жыццём і творчасцю пісьменніка, сярод іх — кніга з аўтографам аўтара, пісьмо Якуба Коласа сялянам вёскі Пінкавічы з запрашэннем прыехаць на 70-годдзе...

Пінск актыўна рыхтуецца да 120-гадовага юбілею Якуба Коласа. Запланавана правядзенне выстаў і пленэраў, конкурс на лепшае выкананне музычных твораў на словы песняра. У кастрычніку адбудзецца свята паэзіі "Святлом жыцця і праўдаю сагрэты, гучыць у народзе голас песняроў".

Аксана КЛУНІНА

МАГІЛЁЎШЧЫНА...

Народаў дружная сям'я

На сцэне абласной філармоніі прайшлі Дні культуры народаў Беларусі, якія пражываюць у Магілёўскай вобласці. Было прадстаўлена самабытнае мастацтва армянскай, цыганскай, габрэйскай дыяспар. У свяце бралі ўдзел салістка абласной філармоніі Іскуі Абалян, армянскі харэаграфічны ансамбль "Эрыбуні", габрэйскі вакальны ансамбль "Тайбэле", народны цыганскі калектыў "Тэрнэ Бэрша". Беларускую культуру прадстаўляў народны ансамбль народнай песні, музыкі і танца "Магілёўцы" абласнога Цэнтра народнай творчасці. У рамках Дзён культуры былі наладжаны выставы фотамастакоў і народных майстроў прыкладнога мастацтва.

Святлана БУХЕЛЬ

Нам засталася спадчына

Спаўняецца дзесяць гадоў харавому ансамблю "Спадчына" гарадскога Цэнтра культуры і вольнага часу. Узначальвае калектыў выкладчыца Магілёўскай музычнай вучэльні Жанета Ялфімава. Сярод спевакоў "Спадчыны" — выкладчыкі музычных навучальных устаноў горада, рабочыя прадпрыемстваў, проста аматары харавога спеву. У рэпертуары ансамбля культавая і духоўная музыка розных канфесій, беларуская і замежная класіка, апрацоўкі народных песень, сучасная музыка розных гадоў.

Лідзія МАХІНА

У творах — душа мастакоў

У Горках, у мясцовай карціннай галерэі, адкрылася персанальная выстава магілёўскіх мастакоў Ігара і Галіны Бяспалавых. Творы Ігара маюць авангардны накірунак. Гэта пейзажы, кампазіцыі на тэму бытавой і рэлігійнай тэматыкі, нацюрморты і абстракцыі. А Галіна прадстаўляе батыкі. Як і Ігар, яна скончыла Віцебскі педінстытут (мастацка-графічны факультэт) і працуе ў школе пры мясцовым Доме мастацкай творчасці.

В. БЕЛАВУСАВА

ГОМЕЛЬШЧЫНА...

Дні Масквы

Гомель наведала дэлегацыі Паўднёва-Заходняй адміністрацыйнай акругі Масквы. У свой час паміж Гомельскім аблвыканкамам і кіраўніцтвам Масквы былі падпісаны пагадненні аб сяброўстве і супрацоўніцтве. У Гомель прыехалі прамыслоўцы, спартсмены, навукоўцы, дзеячы культуры. На лепшых сцэнах абласнога цэнтра выступілі Нацыянальны акадэмічны аркестр народных інструментаў Расіі імя Осіпава, народная артыстка Расіі Аляксандра Стрэльчанка, салісты Вялікага тэатра, артысты Маскоўскага дзяржаўнага цырка... Разам з гасцямі выступілі і гомельскія артысты. Адбыўся таксама і фестываль расійскага кіно.

Не хапае спецыялістаў

У Хойніцкім раёне прайшло пасяджэнне выязной калегіі Міністэрства культуры. Гаворка ішла пра недахоп спецыялістаў культуры ў пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы раёнах, пра шляхі вырашэння гэтай праблемы. Узначаліў калегію міністр культуры Л. Гуляка, а ў яе працы ўдзельнічалі рэктар Беларускага інстытута праблем культуры У. Скараходаў, рэктар Беларускай акадэміі мастацтваў Р. Смольскі, прарэктар Беларускай акадэміі музыкі А. Рашчупкін, старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў В. Іпатава.

Плён працы маладых

У карціннай галерэі абласной арганізацыі Саюза мастакоў прайшла выстава маладых творцаў Гомельшчыны. Свае работы выставілі студэнты Беларускай акадэміі мастацтваў, выпускнікі і навучэнцы мясцовай мастацкай вучэльні.

"Явару" — паўстагоддзя

Пяцьдзесят гадоў таму ў Мазыры быў створаны ансамбль народнай музыкі і танца "Явар". Калектыў, у складзе якога аматары традыцыйнага беларускага мастацтва, — пастаянны ўдзельнік самых прэстыжных фестываляў і конкурсаў.

Аляксей ШНЫПАРКОЎ

У гасцях у працаўнікоў сяла

Працягваецца фестываль "Майстры мастацтваў — працаўнікам вёскі", які летась абышоў дванаццаць раёнаў краіны — па два раёны ў кожнай вобласці. Мэта фестывалю — прапаганда беларускага мастацтва, літаратуры, дапамога сельскім установам культуры.

На гэты раз творчая дэлегацыя наведала Чашніцкі і Лепельскі раёны Віцебшчыны. У складзе яе былі намеснік міністра культуры Валерый Гедройц, паэты Навум Гальпяровіч і Анатоль Зэкаў, заслужаны дзеяч мастацтваў Валянціна Гладкая, заслужаная артыстка Беларусі Алена Цялькова, заслужаны работнік культуры, мастацкі кіраўнік народнага ансамбля "Крупіцкія музыкі" Уладзімір Гром, ансамблі "Свята", "Неруш", "Купалінка", "Камерата", "Церніца", спявачкі Аляксандра Гайдук і Алена Саўленайтэ, дыктар БТ-1 Ірына Смольская.

Урачыстае адкрыццё фестывалю адбылося ў Чашніках на цэнтральнай плошчы. Затым адбыліся сустрэчы пісьменнікаў з чытачамі ў гарадской бібліятэцы, гала-канцэрт у Новалукомлі ў Палацы культуры энергетыкаў.

Назаўтра ў летнім амфітэатры ў Лепелі на беразе маляўнічага возера ўдзельнікі дэлегацыі дэманстравалі сваё майстэрства перад шматлікімі гледачамі. Ішла зацікаўленая гаворка пра сённяшні стан літаратуры, пра ролю пісьменніка ў грамадстве. Паэты чыталі вершы, пародыі, адказвалі на пытанні прысутных.

А затым усе ўдзельнікі фестывалю раз'ехаліся па шасці гаспадарках раёна, дзе адбыліся творчыя сустрэчы з сяльчанамі.

Н. К.

II Узвышаўскія чытанні

Усе лепшыя пачынанні павінны мець свой працяг — такі нефармальны дэвіз супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва. На праведзеных у мінулым годзе I Узвышаўскіх чытаннях, прымеркаваных да 75-годдзя ўтварэння літаратурнага аб'яднання "Узвышша", узнікла ідэя правядзення штогадовых "Узвышаўскіх чытанняў".

І ў гэтым годзе, 24 мая, у памяшканні архіва-музея прайшлі II Узвышаўскія чытанні. На гэты раз яны былі прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння Язэпа Пушчы. Чытанні падрыхтавалі супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва і Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Распачаў чытанні начальнік аддзела навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі Нацыянальнага цэнтра па архівах і справаводстве Уладзімір Крук. Вяла вечарыну дырэктар БДАМЛіМ Ганна Запартыка. З прывітальным словам да прысутных звярнуўся дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Уладзімір Гніламёдаў.

На чытаннях прысутнічала дачка Язэпа Пушчы Лідзія Плашчынская. Яна выступіла з успамінамі пра бацьку. Ірына Багдановіч свой даклад "Язэп Пушча і паэтычны авангард 20-х гг." пачала з уласнага верша, прысвечанага ўзвышэнцам. Алеся Адамаўна Бабарэка распавяла гісторыю аднаго ліста, які атрымалі яе бацькі ад Язэпа Пушчы падчас ссылкі. Міхась Мушынскі выступіў з дакладам "Язэп Пушча і жанрава-стылёвая адметнасць пісьменніцкай крытыкі". Таццяна Кекелева распавяла пра архіўны фонд Язэпа Пушчы, які захоўваецца ў БДАМЛіМ. З дакладамі таксама выступілі: Уладзімір Конан, Яўген Гарадніцкі, Аляксандра Гесь, Алесь Пашкевіч і Віталь Скалабан.

Да 100-годдзя Язэпа Пушчы ў архіве-музеі была створана выстава "...І ўсё ж для роднай Беларусі хачу застацца я паэтам", адкрыццё якой адбылося напрыканцы чытанняў. Таццяна Кекелева прадставіла экспазіцыю, дзе сабраны дакументы, што тычацца жыцця і творчасці Язэпа Пушчы: аўтографы твораў, першыя выданні ("Раніца рыкае", "Песні на руінах", "Дні вясны"), перапіска з Адамам Бабарэкам, індывідуальныя фотаздымкі і ў групах з маладнякоўцамі і ўзвышэнцамі і інш.

Па матэрыялах чытанняў мяркуецца выданне зборніка.

III Узвышаўскія чытанні, якія пройдуць у наступным годзе, будуць прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння Тодара Кляшторнага.

Анастасія РУСЕЦКАЯ,
супрацоўнік БДАМЛіМ

КІНО

Ці то людзі, ці то "лялькі"...

На кінастудыі "Беларусьфільм" рэжысёр Дзмітрый Зайцаў ("Свабодная зона", "Гладыятар па найме", "Кветкі правінцыі") пачаў здымаць фільм "Лялька"(рабочая назва). Як паведаміў рэжысёр, каштарыс ягонай стужкі ў тры-чатыры разы менш за выдаткі на "Легенду аб Анастасіі Слуцкай", другую беларускую карціну, якая сёння рыхтуецца да запуску, хаця абодва фільмы лічацца гістарычнымі. Некалі сцэнарый вядомага кінадраматурга А. Зайцава (цёзкі па прозвішчы рэжысёра) быў прыняты экспертным саветам Міністэрства культуры, але потым доўга ляжаў (гэтаму праекту ўжо пяць гадоў). Нягледзячы на тое, што на "Ляльку"выдаткавана не шмат грошай, яе стваральнікі імкнуцца зрабіць так бы мовіць камерцыйны прадукт, які б добра "спажываўся".

Два гады таму ў гутарцы з карэспандэнтам "ЛіМа" рэжысёр Д. Зайцаў расказваў: "Чаму "лялька"? Так у ваенных спецшколах называюць прысуджаных да смяротнага пакарання людзей, якіх выкарыстоўваюць для навучання курсантаў. Падчас экзамена на абмежаванай тэрыторыі курсант павінен адшукаць "ляльку" і знішчыць яе. У адэскай школе адбыўся такі выпадак, калі "лялька" забіў курсанта і збег. Гэта рэальная гісторыя занатавана ў нашым фільме. Перадусім будзе паказана, што "лялькай" з'яўляецца былы разведчык, якога падставілі. Герой імкнецца даказаць, што ён не вінаўны. Ён выратоўваецца, шукае сваіх ворагаў, разлічваецца з імі, ў сваю чаргу яго шукаюць праваахоўныя органы, усе гэтыя сюжэтныя хады нанізваюцца, ствараючы дэтэктыў, нават трылер. Карціна пра чалавечую годнасць, пра адносіны людзей адзін да аднаго, пра каханне". Цяпер, калі "Лялька" пачала здымацца, даўнішні аповед рэжысёра можна дапоўніць. Прынамсі, дзеянне фільма адбываецца ў ваенныя і пасляваенныя часы ў Заходняй Беларусі. Былым разведчыкам з'яўляецца агент НКВД, засланы ў школу АБВЕРа. Што істотна, галоўны герой — "лялька" даказвае сваю праўду перад дзяржавай, перамагае. (Дарэчы, слухаючы цяпер рэжысёра, я падумала, што фільмы на некаторыя тэмы здымаюцца ў нашай краіне невыпадкова. Апошні нацыянальны кінапраект "У жніўні 1944..." быў прысвечаны "прыгодам" на тэрыторыі Заходняй Беларусі СМЕРШаўцаў. Цяпер — савецкага шпіёна, якога "свае ж" зрабілі "лялькай". Неўспадзеўкі ў беларускім кінематографе ўзнікае цень няпростага жыцця ў нашай цяперашняй краіне, у якой усе мы, здаецца, ці то людзі, ці то "лялькі"...)

Галоўную ролю ў фільме выконвае вядомы расійскі акцёр Я. Сідзіхін. Рэжысёр запрасіў гэтага акцёра не з прычыны камерцыйнага інтарэсу (раней Д. Зайцаў планаваў здымаць у сваёй стужцы вельмі моднага С. Бадрова). Беларускі рэжысёр лічыць Я. Сідзіхіна вельмі таленавітым акцёрам, а таксама цудоўным чалавекам. Прыемна адзначыць, што Я. Сідзіхін, нягледзячы на занятасць, упадабаў сцэнарый "Лялькі" і пагадзіўся здымацца ў новай беларускай карціне. Разам з расійскім акцёрам пад пільным вокам кінакамеры будуць працаваць нашы акцёры Г. Аўсяннікаў, А. Падабед, А. Кацянёў. (Дарэчы, акцёр А. Кацянёў адыдзе ў "Лялькі" ад амплуа станоўчага героя "ў пагонах" і сыграе паганца, здрадніка, які звар'яцее ад мукаў сумлення. Як расказаў рэжысёр, падчас прагляду першага здымачнага матэрыялу многія не пазнавалі ў грыме прыгажуна Кацянёва.) Упершыню на кінаэкране з'явіцца дачка вядучага праграмы "Тэлевізійны Дом кіно" С. Кац'ера Аляксандра Кац'ер. Рэжысёр

лічыць дзяўчыну знаходкай для фільма, кажучы, што ў яе знешнасці шмат ад таго часу.

Зараз стваральнікі фільма здымаюць натуру ў Альшанах, Гальшанах і Слоніме. Д. Зайцаў імкнецца да максімальнай праўды фактуры, каб не было недарэчнасцяў у дэталях (мяркуючы па фотаздымках у пакоі рэжысёра, натура выбіралася старанна, карпатліва). Здымкі стужкі будуць доўжыцца не больш за два месяцы, ужо ў кастрычніку "Лялька" павінна быць скончана.

Вольга БАРАБАНШЧЫКАВА

На здымку: кадр з кінафільма "Лялька" (рабочы матэрыял).

Фота А. ДЗМІТРЫЕВА

Творчая гасцёўня

Дзейнасць Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры вельмі разнастайная: новыя выставы, юбілейныя вечарыны, сустрэчы з цікавымі людзьмі, прэзентацыі кніг. А зараз традыцыйнымі сталі творчыя гасцёўні, ініцыятарам правядзення якіх з'яўляецца вядомая паэтка Валянціна Паліканіна. Арганізаваны яны пры Мінскім гарадскім савеце жанчын, а Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры заўсёды шчыра і ветліва прымае іх удзельнікаў. Ужо другі год працягваецца гэта сяброўства. Сустрэчы ладзяцца самыя розныя. Напрыклад, адбыліся прэзентацыі паэтычных кніг Артура Вольскага і Анатоля Аўруціна, вечарына, прысвечаная народнай артыстцы СССР Аляксандры Клімавай. Адна з сустрэч адбылася з таленавітай мастачкай Нінэль Шчаснай, на якой быў прадстаўлены яе альбом "Іскры майго жыцця". Побач з карцінамі мастачкі — партрэтамі вядомых пісьменнікаў — вершы, празаічныя радкі тых, каму прысвечаны мастацкія творы: Іван Шамякін, Вольга Іпатава, Генадзь Бураўкін, Ніл Гілевіч...

Нядаўна "Творчая гасцёўня" адзначыла свой юбілей. На гэтую сустрэчу былі запрошаны паэты Анатоль Аўруцін, Кастусь Цыбульскі, аўтар песень у выкананні гуртоў "Бяседа" і "Сябры", акцёр і літаратар Андрэй Душачкін-Клімаў, рэжысёр і журналіст Сяргей Гавенка, заслужаны артыст Беларусі Эдуард Гарачы і інш. Вечарына атрымалася па-сямейнаму добрай і шчырай, як сустрэча сапраўдных сяброў.

Вольга ГУЛЕВА

АДГАЛОСКІ

З вашай лёгкай рукі...

АРГАН У СТАЛІЧНАЙ ЗАЛЕ КАМЕРНАЙ МУЗЫКІ ЗАГУЧАЎ ЗНОЎ!

Праблема тэрміновага рамонту канцэртнага аргана сталічнай філармоніі абмяркоўваецца на старонках "ЛіМа" з мая 1998 г. Мы пісалі, нам адказвалі, а справа не рухалася. Мала таго: мінулай восенню давялося біць у званы з прычыны няспраўнасці ўжо т. зв. малога аргана, што ў Зале камернай музыкі на Залатой Горцы (касцёл Св. Роха). Пасля публікацый "Прыярытэты, або Пра што маўчала СТБ" (28.09.2001 г.) і "Фэст адмянілі. Ніхто не пацярпеў?" рэдакцыя атрымала афіцыйны ліст з Міністэрства культуры, пра што праінфармавала чытачоў ("З майстрам падпішуць дамову?", нумар за 21.12.2001 г.).

Рука можа быць лёгкай, а слова — моцным... Гэтак падумалася падчас нядаўняй "Мінскай вясны", калі 9 красавіка, прыйшоўшы на фестывальны канцэрт у Залу камернай музыкі, наш карэспандэнт пабачыў нягегларасцягнуты паміж парталамі кавалак зялёнай тканіны. Хтосьці з музыкантаў патлумачыў: незадоўга да канцэрта прыйшоў майстар, зняў з аргана трубы, пачапіў самаробную заслону: "Гэта — з вашай лёгкай рукі пачынаецца рамонт аргана".

Наш адзіны і незаменны арганны майстар Станіслаў Чарняўскі, якому дапамагае сын Генадзь, пачысціў інструмент ад скопішча пылу (ён "усмоктваўся" трубамі з 1983 года), зрабіў неабходны рамонт. І 22 мая арган у касцёле на Залатой Горцы слухала кампетэнтная камісія: яго памаладзелы, пасвяжэлы голас загучаў зноў!

Першы філарманічны канцэрт арганнай музыкі мае адбыцца тут 17 чэрвеня. Мы радуемся. І чакаем, калі "з нашай лёгкай рукі" пачнецца рэанімацыя і галоўнага аргана краіны — таго, што ў Канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі. З тым інструментам і праблем, і клопату больш.

Аддзел музыкі "ЛіМа"

Дзякуй за "рэкляму"

Апошнім часам увішныя спадары з "Нашай Нівы" палюбілі маё прозвішча. Я разумею, што Алесь Пісьмянкоў гучыць больш мілагучна і больш значна, чым, скажам, Андрэй Дынька. Так, так, па-беларуску пішыцца не Дынько, а Дынька, не Свірко, а Свірка, не Цвірко, а Цвірка, не Тычко, а Тычка, што, дарэчы, і робяць у адрозненне ад згаданага спадара нашы шаноўныя літаратары. Але я зусім не збіраюся ацэньваць філалагічныя здольнасці, тым больш вывучаць радавод і этымалогію прозвішча рэдактара "Нашай Нівы", а хочацца звярнуць увагу на іншую здольнасць Андрэя Дынькі — здольнасць рабіць дробнае паскудства: у адным з апошніх нумароў "Нашай Нівы" мне прыпісаны словы, якіх я ніколі не пісаў і не гаварыў — усё што пішу, я не саромлюся пазначыць сваім прозвішчам.

Мяркуйце самі: радкі са звычайнай рэдакцыйнай абвесткі "Будзьма разам", напісанай маім першым намеснікам Віктарам Шніпам, гучна названы "Цытатай тыдня" і змешчаны разам з маім шаржыраваным фотаздымкам. Калі казаць праўду, "Нашу Ніву" не чытаю, і, вядома, не звярнуў бы аніякай увагі на прыпісаную мне "цытату", каб калега Віктар не абвінаваціў мяне ў плагіяце. І вось цяпер мне, чалавеку, які не мае прыроднай схільнасці да дробнага паскудства, даводзіцца тлумачыць невытлумачальнае. Магчыма, раблю гэта і дарэмна, але ж дужа хочацца падзякаваць за "рэкляму". Дзякуй, спадарове!

Министерство связи Республики Беларусь
ТАЛОН к почтовому переводу
На 100= руб.
От кого Пісьмянкоў Алеся Гладзіміравіча
Адрес г. Мінск-5 вул. Захарова 19
(почтовый индекс и адрес отправителя)

ЛИНИЯ РЕЗА

Министерство связи Республики Беларусь
№ (по реестру ф 11)
ИЗВЕЩЕНИЕ о почтовом переводе № (по ф 5)
На 100= руб.
Кому Редакция газеты "Наша Ніва"
Куда 220050 г. Минск А/С 537
(почтовый индекс и подробный адрес)
Явиться за получением с до
Отделение связи
Обведенное жирной чертой заполняется отправителем

Алесь ПІСЬМЯНКОЎ

P.S. Успомнілася народнае: "Дзякуй на хлеб не намажаш". І таму дасылаю квіток з аплатай. Разумею — МАЛА. Але, паверце, на большае ваша "рэклама" не цягне. Ды й працую я ў "ЛіМе", выбачайце, не за зялёныя.

Вясковая праўда

ГЛУШМЕНЬ

У асінніку, за агародамі, аблюбаваўшы сабе старое тоўстае дрэва, зрабілі гняздо буслы. Зараз буслянка ля Слідцаў — своеасаблівая візітоўка гэтай маленькай чашніцкай вёсачкі, калі не лічыць указальнік на павароце, які дарожнікі напісалі, вядома ж, з памылкаю: "Сліццы".

Вёска на крыжах. Бойкія дарогі на Новалукомль, на Лепель. Аўтобусы шастаюць, можна сказаць, адзін за адным. Не паварочваецца язык назваць Слідцы "глыбінкаю", бо зусім жа побач абодва гарады — і Чашнікі, і Новалукомль. Язык не паварочваецца, а вочы бачаць і самі не вераць таму, што ўбачылі... Вярнуўшыся з камандзіроўкі, я доўгі час заставаўся пад яе ўражаннем, расказваў знаёмым, сябрам. Цяжкая, гнятлівая, чорная энергетыка аніяк не магла пакінуць мяне. І прыгожая наская назва "Слідцы" пакрысе ў маёй свядомасці станавілася імем агульным, сімвалам нядбайнасці, непрагляднай апатыі, сімвалам жывога чалавечага сметніка...

А здаля выглядала ўсё даволі аптымістычна: буслянка, наезджаная добрая гравійка ўздоўж вёскі, аж да возера, прыгожага, маляўнічага, рыбнага і... пахілыя, лядашчыя хаціны паабапал дарогі, што быццам спаборнічаюць, якая з іх хутчэй забурыцца ў зямлю, разваліцца. Некаторыя з іх, відавочна, пакінутыя гаспадарамі, але не ўсе. Кажуць, улетку сюды збіраецца народ, бывае шмат моладзі. Нават цяжка гэтаму паверыць, бо чаму ж тады столькі падвор'яў тут ператвораны ў помнікі-сметнікі, у бур'яновыя джунглі? Няўжо моладзі, якая збіраецца тут летам, цяжка ўзяць у рукі касу і ачалавечыць сваю бацькаўшчыну?

Вось хата, у якой, мне сказалі, жывуць мужык і жонка — алкашы. Самі ходзяць па суседзях на калым, трэба ж за нешта піць. А веранда ў хаце (калі гэта можна назваць верандаю і хатаю) урасла ў зямлю па самую страху, дах прагніў і пагрозліва завіс. Не тое што ў хату зайсці, на падворак ступіць агідна, усё ў бур'яне, у смецці.

Адзіны на ўсю вёску катэдж стаіць тут "белаю варонаю", каго палохае сваёю прыгажосцю, каго змушае зайздросціць па-чорнаму. Кажуць, тутэйшы, карэнны чалавек будуе. Я б тут на яго месцы не будаваўся. Сярод усеагульнага сметніку? Лепей ужо бліжэй да возера, далей ад людскога вока і ад чорнай энергетыкі.

Відавочна, глушмень — гэта не назва канкрэтнае вёскі, не яе геаграфічнае становішча. Глушмень — стан чалавечай душы. Я не кажу пра кветкі ў палісаднікі ці пра нармальную планіроўку на ўчастках, я не кажу пра платы, на якіх рэдка ў каго тут, у Слідцах, можна запыніць вока, не тое што залюбавацца. Я кажу, што людзі баяцца саміх сябе, баяцца прызнацца, што нехта з іх некалі граў, спяваў альбо ткаў, вышываў. Ды і не засталося тут, бадай, такіх умельцаў. Хіба ж пляшкай пахвалішся...

Наводзіш аб'ектыў фотаапарата, а людзі і пальцам не паварухнуць, каб накінуць свяжэйшую світку ці кашулю, каб на фотаздымку выглядаць прыстойна. Што гэта? Неахайнасць? Абыякавасць да сябе, непашана да іншых? Альбо нейкае ачмурэнне напаўзло на людзей? Напіцца і забыцца... Але ж не ўсе так нізка апускаюцца ў гэтым нялёгкім жыцці, не кожны шукае паратунку ў бутэльцы...

У ЦЕСНАЦЕ І Ў КРЫЎДЗЕ

Міхаіл Харкевіч нікольки не сумняваецца: буслы ў Слідцы сёлета прыляцяць абавязкова. Каму, як не яму, ведаць — буслянка ж акурат за яго агародам. Кожны год прылятаюць. Там, у асінніку, ляжаць яго дровы, велізарны груд. Каля хаты дроўцы складзены акуратненька, пад шнур. Па-гаспадарску. Не, у Слідцах ніхто не стане пярэчыць: Міхаіл — чалавек гаспадарлівы, дбайны. Бывае, прыкладваецца да чаркі? Здараецца. У вёсцы без яе мала хто абыходзіцца, хіба інваліды. Але ж не забулдон. Каб быў забулдонам, хіба насек бы гэтулькі дроўцаў, хіба абгарадзіў бы, хай сабе і тынком, агародчык ля хаты, хіба выкапаў бы глыбозную копанку ля хлява, знарок для індакачак, якія важна ходзяць у яго на падворку? Урэшце, хіба будаваў бы новую лазеньку? Лазеньку, праўда, пакуль толькі абымшыць удалося. А яшчэ ж трэба і столь, і падлога. Трэба дзесьці дошкі фугаваць.

— Вы тут аб праблемах пытаецеся, — кажа Міхаіл, — ды шмат праблем. Вось хаця б адна з іх... Дзе можна дошкі парэзаць? Ды няўжо ў Чашнікі дзеля гэтага везці? У саўгасе, чуў, на піларамі нават святло колькі разоў адключалі за няўплату.

Дошкі ды недабудаваная лазенька — не адзіная праблема ў маладой сям'і Харкевічаў. Самім жыць фактычна няма дзе. Матчына хата, здавалася б, і нічога сабе, абшаляваць бы, падгледзець. Ды вось бяда, маленькая яна, цесная. А якніяк пяцёра душ у хаце: маці, саміх двое, двое дзяцей. Жывуць у цеснаце і ў крыўдзе.

Хаця, здавалася б, крыўдаваць надта няма і на каго. Жывуць на жончыну зарплату (тая працуе на свінакомплексе) ды на матчыну пенсію. Міхаіл не працуе пакуль нідзе, апрача як на ўласнай гаспадарцы.

— А дзе працаваць? — пытаецца. — Хіба назад у саўгас ісці, у якім усё развальваецца? За капейку зноў лямку валачы? Каб ведаў, дзе тут паблізу моцныя гаспадаркі ёсць, далібог, узялі б ды і пераехалі. Што нас тут, у Слідцах, трымае?

А пакуль не пераязджаюць, а сур'ёзна мараць выкупіць дом у суседа, які во таксама падаецца ў Барысаў і дом хоча прадаць, па чутках, за тысячу даляраў. Ды дзе столькі даляраў возьмеш?

— А ці дадуць нам хаця якую пазыку на будаўніцтва? — пытаюцца ў мяне гаспадары.

— Баюся, што не, — адказваю. — Вам ужо абодвум за трыццаць.

Зноў бачу расчараванне ў вачах. Крыўдуюць. На каго ж вы крыўдуеце? Дзе ж вы раней былі? Чаму не будаваліся?

Міхаіл прывёз жонку Алену з арміі (служыў на Поўдні). Дзяўчына трапілася гаспадарлівая, увішная, талковая. Людзі кажуць, што гэта яна, маленькая, на выгляд непрыкметная, трымае ў руках Міхаіла, каб не распіўся, трымае вялікую гаспадарку — а ў Харкевічаў і конь, і карова з цялушкаю, і куры, і свінні, — даглядае дзяцей. Усюды паспявае. Дзеці — пяцікласніца Аня і на год малодшы за яе Алег — адзіная будучыня гэтай невялікай вёсачкі. Бегаюць пакуль у школу, у суседнія Пачаевічы. Сёння бегаюць, а заўтра? Раптам і сапраўды не вытрымаюць Харкевічы ды з'едуць адсюль у свет. На кім будзе вёска трымацца? На дачных унуках? На гэтых дзе сядзеш, там і злезеш. Ды для іх Слідцы і не бацькаўшчына зусім, а ўжо, выходзіць, дзедаўшчына (ці не ад слова "дзядоўнік", якім парасла радзіма і абкасіць які не даходзяць рукі ў гарадскіх унукаў?).

ХУТЧЭЙ БЫ Ў "РОЎ"...

Родныя сёстры-бабулі жывуць па суседстве. Хаты Ганны Лядніцкай і Соф'і Галаван стаяць поруч, адно гора гаруюць, аднолькава ў ім несуцешныя. У Соф'і Іванаўны дзяцей няма ўвогуле, у Ганны Іванаўны яны далёка, адна дачка ў Віцебску, другая ўвогуле ў Расіі.

— Не хочуць дзеці прыязджаць, — прашамкала баба Ганна бяззубым ротам, выпаўзшы з кійком на ганак. — Ат, хутчэй бы ўжо ў "роў", чымся такая жытка.

У "рове" — вясковыя могілкі.

— Туды заўсёды, бабуля, паспеем. Што ж так нявесела гамоніце?

— А чаму тут радавацца, дзетка? Дроўцаў во няма. Пляменнікі-п'янтосы лазеньку маю разабралі на дровы. Спалілі. Прасіла іх: не чапайце, хай будзе. Не паслухаліся, не сваё ж. А зараз во і маю вербінку на дровы парэзалі, толькі пянёк застаўся.

На двары — пара грудочкаў дроўцаў, тоненькіх, як былінкі, стаіць жалезны "казёл", на якім дзве кабеты, маладзейшая і старэйшая, "калымяць" у бабулі — пілуюць танюткую палку лучковай двуручкаю. Напілаваўшы, кабеты носяць тыя дровы бабулі ў... калідор. Там у яе імправізаваны "дрывотнік". А што зробіш, калі іншых будынін, апрача пахілай хаты, у яе ўжо й не засталося.

Самотны век у самотнай хаце. Бабуля сама яшчэ зварыла сабе рысу, балазе, печка ў яе грэе добра. Зварыць зварыла, а есці не ела.

— А я, дзетка, заўсёды так: есці не хачу, вару толькі што для прыліку. Катоў вунь пакармлю.

Апрача катоў бабулі Ганне карміць няма каго. Мужа таксама ўжо дваццаць пяць гадоў як не трэба карміць, бо "пайшоў у роў".

— Алкаголік быў, памёр да часу, — не хавае сваёй бяды бабуля.

Такая вось бязрадасная, нягеглая старасць. Каго ў ёй вінаваціць? Напэўна ж, толькі лёс. Маладосць, працавітая, сялянская, засталася ў рамачках, за шклом, на сцяне. Старасць жа яе не патрэбна нікому, нават уласным дзецям, не кажучы пра пляменнікаў-алкашоў. Жывеш за мокрую анучу — кожны аб цябе імкнецца ногі выцерці.

Выйшла да мяне са сваёй хаты-шпакоўні і баба Соф'я, Ганніна сястра.

— А што ж вы ў маю хатку не зайшлі? Паглядзелі б. У мяне вунь жыве пляменнік-алкаш... Нічога ў мяне няма. Можа б, гасударства якую помач дало?

— Ды я ўжо чуў пра вас, людзі расказвалі, — пачаў я апраўдвацца, як раптам сусед заступіў дарогу, ціха прашаптаў:

— Не слухайце вы яе. Яна і сама з тым пляменнікам не супраць чарку кульнуць.

Як варам ашпарылі мяне тыя словы. Зірнуў на згорбленую яе постаць, на зморшчаны твар — ведама ж, чалавеку за восемдзесят — і не паверыў сваім вушам. Няўжо? А мо са зла сусед казаў? Чаго не бывае, жывучы побач, мо курыца якая перайшла дарогу? Хай гэта застанецца на яго сумленні.

Але ж калі тое было праўдаю... Калі і напрыканцы жыцця васьмідзесяцігадовыя палезлі ўжо ў бутэльку... Тады мо і праўда гэтаму свету трэба сысці ў нябыт? Людзі сыдуць у "роў", а як жа буслы? Яны ж без людзей загінуць...

Уладзімір МІХНО

Чашніцкі раён

Аднатомнік Наталлі Арсенневай

У папулярнай кніжнай серыі "Беларускі кнігазбор" выйшлі "Выбраныя творы" знакамітай беларускай паэтэсы XX стагоддзя Наталлі Арсенневай, якая больш за 50 гадоў пражыла ў эміграцыі (ЗША) і творчасць якой у савецкія часы была пад забаронай. Найбольшы раздзел кнігі склала яе лірыка. Чытач пазнаёміцца таксама з паэмамі і вершаванымі апавяданнямі паэтэсы. У раздзеле "Драматургія" друкуецца лібрэта яе оперы "Усяслаў Чарадзей", а ў раздзеле "Пераклады" — перастораная Н. Арсенневай "Песня пра зубра" Міколы Гусоўскага. Надзвычай цікавыя ўспаміны паэтэсы, у якіх яна расказвае пра ўсё сваё вялікае жыццё (толькі шасці гадоў не дажыла яна да 100). Добра дапаўняюць раздзел успамінаў гутаркі з Наталляй Арсенневай журналістаў, а таксама яе лісты да дзеячаў беларускай культуры. У "Дадатку" падаюцца ўспаміны і згадкі пра Н. Арсенневу Г. Бураўкіна, Р. Жук-Грышкевіч і інш. З аднатомніка выбраных твораў культурніцкая грамадскасць Беларусі ўпершыню мае магчымасць пазнаёміцца з усёй разнастайнасцю творчай спадчыны Наталлі Арсенневай, паэтэсы з роду рускага паэта Міхаіла Лермантава.

Н. КУДРЭЙКА

Раман пра арышт Берыі

Напісаць гэту кнігу падбіў Анатоля Сульянава Васіль Быкаў. Занадта цікавыя рэчы пра нашых нядаўніх правадыроў, якія ледзь не стагоддзе трымалі ўсіх нас у жаху і строгім падпарадкаванні, расказаў яму была лётчык-знішчальнік, а цяпер генерал-маёр у адстаўцы.

"Арестовать в Кремле" — так назваў свой гісторыка-дакументальны раман Анатоль Сульянаў. У аснове кнігі, якая выйшла ў выдавецтве "Беллітфонд" — асоба Лаўрэнція Берыі, ахвярамі ведамства якога сталі мільёны бязвінных грамадзян Савецкага Саюза.

Чытача не можа не зацікавіць адыёзная асоба былога галоўнага кэдэбіста вялікай краіны. Напрыклад, аўтар прыводзіць спіс 214 жанчын, якіх Л. Берыя згвалціў (школьніц, заслужаных артыстак, пісьменніц, спартсменак, лётчыц-гераінь і г.д.). У кнізе падрабязна расказваецца, як гэта адбывалася, як адлоўліваліся ахвяры сексуальнага маньяка.

Цікава, што падчас вайны Л. Берыю была даручана арганізацыя вытворчасці ракет і асваення космасу.

З вялікай цікавасцю чытаецца падрабязны расказ аб затрыманні і арышце Берыі ў 1953 годзе.

У кнізе, напісанай на аснове карпатліва сабраных дакументаў і расказаў удзельнікаў тых падзей, шмат месца адведзена і іншым вядомым асобам — І. Сталіну, Л. Троцкаму, К. Варашылаву, В. Молатаву, Л. Кагановічу, М. Хрушчову, А. Гітлеру, маршалам Тухачэўскаму, Шапашнікаву, Жукаву і інш.

Беларускаму чытачу цікава будзе даведацца і пра "дзейнасць" берыеўскага выдзвіжэнца Лаўрэнція Цанавы, які ўзначальваў КДБ Беларусі.

З кнігай А. Сульянава пра нашу трагічную гісторыю не пашкодзіла б пазнаёміцца кожнаму. Таму што акрамя ўсяго — яна заклікае нас моцна падумаць пра тое, каб падобнае больш не паўтаралася ў будучым.

К. АЛЯКСАНДРАЎ

"Роднае слова", № 3

І. Бароўская ў артыкуле "Усе мы родам з дзяцінства" разглядае песенную лірыку В. Шніпа, а лірыцы Н. Мацяш прысвечаны развагі С. Калядкі "Вернасць радасці". "Мова ў сістэме адукацыі" — тэма выступлення М, Яленскага і Р. Саматыя. Лёс і творчыя набыткі А. Гаруна знайшлі адлюстраванне ў матэрыяле Т. Грамадчанкі "Радкі з любові народжаных слоў". Змешчаны таксама артыкулы А. Павільча "Дыдактычны і выхаваўчы патэнцыял твораў царкоўнага пісьменства XI—XIII стст.", С. Гараніна "Літаратурны працэс на мяжы эпох: ад ранняга да позняга Сярэднявечча" (заканчэнне), В. Дылеўскай "Навукова-метадычныя падыходы да ўзаемазвязанага вывучэння роднай і замежнай літаратур у школе", В. Смыкоўскай "Экалагічнае выхаванне школьнікаў пры вывучэнні апавядання Івана Пташнікава "Алені", Т. Ляшчэні "Анатоль Багатыроў", А. Шамрук "Пра творчасць Эдуарда Астаф'ева", У. Рынкевіча "Графіка Альфрэда Ромера", Г. Ісакава "Пра мастацкае жыццё Віцебскага краю (канец XIX — пачатак XX ст.)", Л. Храмянковай "Тут нарадзіўся Напалеон Орда...", А. Карлюкевіча "На літаратурнай карце Чэрвеншчыны". Публікуюцца вершы Н. Мацяш, А. Гаруна, Х. Жычкі, А. Емяльянава, А. Вялюгіна, С. Дзяргая, І. Снарскай.

КРЫТЫКА

А крыніцы бруяцца...

Прызнаюся: браў у рукі "Дарункі роднай зямлі", чарговы зборнік "Бібліятэкі часопіса "Маладосць" з пэўнаю насцярогаю. Большасць імёнаў у ім былі мне незнаёмыя. І ўсё ж цікаўнасць перамагла: хто ж яны, тыя браткі-беларусы, што жывуць у Літве? Ды яшчэ стараюцца нешта рабіць на літаратурнай ніве — пішуць, пакрысе сям-там друкуюцца.

Пераважная большасць з іх нарадзілася ў Беларусі, але па волі лёсу апынуліся ў Літве. Сабрала іх творы пад адну вокладку загадчыца кафедры беларускай філалогіі Віленскага педуніверсітэта Лілія Плыгаўка. Прадстаўляючы дваццаць імёнаў чытачам Беларусі, яна ў прадмоўцы-візітцы агаворваецца: "Спіс тых, хто творыць па-беларуску, далёка не поўны". І я, не паспеўшы азнаёміцца са зместам зборніка, ужо адчуў удзячнасць Лініі Леанідаўне за самаахвярны ўчынак. І вельмі ярка ўявіў сцэнку, якую яна апісвае: убачыла "слёзы на вачах Веры Хамянок, калі яна чытала верш, прысвечаны роднай вуліцы ў Мінску — Сляпянскай". Бачыла складальніца і хваляванне Марты Лекаравічэне, якая хоць і мела ўжо літоўскае прозвішча, але вельмі прасіла надрукаваць яе пад сваім — Ганчарова.

І было ў "замежнікаў" такое вялікае жаданне — надрукавацца ў Беларусі, што ўсе дваццаць адабраных прыслалі ў "Маладосць" калектыўную, завераную ў натарыуса заяву: ад ганарару адмаўляюцца на карысць рэдакцыі!

"Віленшчына з'яўляецца вельмі унікальным шматкультурным раёнам, дзе перапляліся лёсы, народы, мовы, культуры, — піша Л. Плыгаўка. — Многія жыхары ў побыце карыстаюцца некалькімі мовамі, пішуць таксама на некалькіх мовах... Таму творчасць некаторых аўтараў прадстаўлена вельмі сціпла".

Хто ж яны, шчасліўчыкі, што трапілі ў калектыўны зборнік? Яны змешчаны ў кнізе ў алфавітным парадку. Але я дазволю сабе (і папрашу дазволу ў аўтараў і чытачоў), прапусціць наперад старэйшын, ветэранаў — каму пад восемдзесят ці за восемдзесят. А сярод іх найпершую — **Веру Шостак**. Нарадзілася яна ў Заполлі (Наваградчына). Далейшыя вехі біяграфіі: скончыла сямігодку ў маёнтку "Карэлічы", потым вучылася ў вядомага Барыса Кіта ў Віленскай беларускай гімназіі. Перад самай вайной працавала настаўніцай беларускай мовы. Пасля вайны пераехала ў Вільню, паступіла ў педінстытут на факультэт англійскай мовы. Выкладала англійскую мову аж да пенсіі. Зараз — самая актыўная ўдзельніца беларускага культурнага руху на Віленшчыне. Зборніку "Дарункі беларускай зямлі" прапанавала свае ўспаміны аб сустрэчах з Максімам Танкам у гады ранняй маладосці. Першы раз — у Віленскім універсітэце, куды прыязджаў ён і Наталля Арсеннева. Яўген Іванавіч быў "цікавы хлопец" з ільнянай чупрынай, як чытаў свае вершы, увесь час устрэсваў чубам. Група гімназістак разам з Верай, якія былі запрошаны на вечар, не так слухалі вершы, як пасмейваліся і абмяркоўвалі асобу паэта. Другі раз сустракалася з ім на вечары ў гімназіі. Гасцям паказалі сваю самадзейнасць, танцы. Выступалі Максім Танк, Забэйда-Суміцкі і Янка Станкевіч. Яны цікавіліся маладымі паэтамі гімназіі. Вера нават танцавала з паэтам, і ён падараваў ёй пазней нумар часопіса "Шлях моладзі" са сваім вялікім фотаздымкам і подпісам: "Паважанай Веры на доўгую памяць". І нават пацалаваў.

Прачытаў я гэтыя, напісаныя з гумарком, успаміны, і стала шкада, што такія кароткія. А пэўна ж, спадарыні Веры ёсць яшчэ шмат чаго расказаць з таго далёкага часу, бо і сама яна пісала тады гумарыстычныя вершы.

Андрэй Чэмер больш за шэсцьдзесят гадоў займаецца літаратурай і публіцыстыкай. Ён выпускнік Наваградскай беларускай гімназіі, магістр эканамічных навук, аўтар васьмі кніг. Сярод іх — манаграфія пра былую гімназію, зборнік вершаў "За калючым дротам", нарысаў "Выбраныя Богам", адзін з іх прысвечаны акадэміку Барысу Кіту. Дэбютаваў А. Чэмер у літаратуры аповесцю, змешчанай у 1936 годзе у часопісе "Шлях моладзі", заняўшы прызавое месца.

У зборніку "Дарункі беларускай зямлі" змясціў некалькі вершаў, у тым ліку два, прысвечаныя памяці Ларысы Геніюш, мужнай і нястомнай змагаркі за вольную Беларусь. Цяжкім уздыхам гучаць яго радкі з рэквіема-ўспамінаў:

У цёмным тумане
Схаваны наш лёс...
Я помню цябе, як была маладая:
Як ты расцвітала,
І талент твой рос...

І ўжо як балючы, сардэчны ўскрык былога гулагаўца:

"Ларыса! Ларыса!
Куды ты бяжыш?!
Куды ты нясеш свой
скрываўлены крыж?"
. . . . . .
Пайшла безаглядна...

Нямала давялося пабачыць, перажыць за доўгія гады і **Міколу Паўлоўскаму**. Служыў колісь у польскай арміі. Пры абароне Варшавы ў 1939 годзе трапіў у палон да немцаў. Адбываў прымус-працу ў пасляваенны час, якою "ўзнагародзілі" яго пры Саветах. А ў Вільні ён жыве з 1946 года, у розны час друкаваўся ў розных выданнях, у тым ліку на старонцы "Беларус Віленшчыны" ў газеце "Эхо Литвы".

І наяве, дый нават у сне
Не забыцца хвілін тых пакутных.
І вярнуцца так хочацца мне
Да радзімых мясцін...
непрысутных.

Сярод яго вершаў, змешчаных у разглядаемым зборніку, ёсць і такія, пад якімі стаяць пазнакі: "Чэнстахова-лагер. 1939".

Але нягледзячы на вельмі паважаны ўзрост, не-не дый вырвецца юнацкае:

Не глядзі на мяне,
Не чытай з маіх воч,
Я скажу табе сам усё чыста:
Праз твой мілы пагляд
Дзень мне робіцца — ноч,
А калісь мігацеў ён празрыста.

Пятро Малафей жыве ў Шальчынінкаі. Па адукацыі журналіст, па прафесіі — педагог. Ён заснавальнік Беларускага культурнага цэнтра ў раёне і яго нязменны кіраўнік. Піша вершы даўно, друкаваўся ў розных выданнях Літвы і Беларусі. Піша пра людзей, пра лепшую палову чалавецтва — жанчын. Не выветрываецца з яго памяці вайна, абпаленыя ёю гады дзяцінства. Вабіць яго і далёкае гістарычнае мінулае нашай радзімы.

Пясняр, разарві свае путы!
Паўстань і былінай услаў
Рагнеды красу і пакуты,
І мужнасць тваю, Усяслаў!
Далёкія, блізкія продкі,
Хто край бараніў і жывіў —
Паўстаньце на час хоць кароткі,
Паўстаньце з агню і крыві!

Як мала мы ведаем сваю гісторыю, як не цікавімся ёю! Вельмі спадабаўся мне нарыс Пятра Малафея "Алесь Савіцкі" — пра нашчадка аднаго з паўстанцаў К. Каліноўскага. Гэта беларускі Робін Гуд. Яго жыццё, дзейнасць, паўстанцкая барацьба супраць царскага самаўладдзя абрасла легендамі. Алесь Савіцкі ўжо ў семнаццаць гадоў у дасканаласці ведаў не толькі беларускую мову і ўсе яе дыялекты, але і польскую, украінскую, рускую, французскую, яўрэйскую. Паэт — напісаў паэму "Фея вясны", мастак і незвычайна таленавіты акцёр. "Пераўвасобіцца ў расійкага ўрадніка, польскага шляхціца, яўрэя-гандляра, селяніна або бабулю — было для яго звычайнай забавай", — піша П. Малафей. Загінуў Алесь Савіцкі каля в. Краснае пад Гомелем. У час апошняга бою з карнікамі (сотня "дзікай дывізіі") выносіў з-пад куль сябра, і некалькі куль пранізалі яго самога.

А я чытаю пра ўсё гэта ды толькі ўздыхаю: вось дзе герой для вялікага, займальнага і павучальнага серыялу! Але ж мы, як сказаў класік, "ленивы и нелюбопытны". Нават тыя мізэрныя сродкі, што вылучаюцца на культуру, кіно, тэлебачанне, уталкаваць добра не можам, трацім на абы-што, абы-куды.

Пад шэсцьдзесят гадоў падбіраецца **Адольфу Бурынскаму**. Нарадзіўся ён у в. Жамайтэлі Віленскага раёна. У 1984 годзе пераязджае на пастаяннае жыхарства ў Свіраны, на сядзібу, дзе колісь нарадзіўся Францішак Багушэвіч. І ці не пад уплывам нашага класіка, хоць сам электрык па адукацыі, пачаў пісаць вершаваныя апавяданні, гумарэскі-байкі на побытавыя тэмы. Тры з іх і прадстаўлены ў зборніку: "Плата за паслугу", "П'янка суседзяў", "Няўдалае жыццё".

А цяпер колькі радкоў пра самых маладых удзельнікаў гэтага, як цяпер модна казаць, "праекта". Гэта студэнткі педуніверсітэта Алена Альховік, Міхаліна, Марта Ганчарова, Агнешка Юхневіч, Ірына Рэўко і Наталля Хацей. Ёсць у іх творчасці агульнае, што аб'ядноўвае іх, як філалагічная адукацыя, прыналежнасць ад аднаго пакалення. Аднолькавае амаль у іх імкненне спасцігнуць тонкасці беларускай мовы, авалодаць паэтычным майстэрствам. І шкада, што **А. Альховік** прадстаўлена ўсяго адным вершам, **Агнешка Юхневіч** — двума невялікімі, **Наталля Хацей** — адным абразком "Светлы ўспамін аб леце", пра лета ў сваім абразку расказвае і **Ірына Рэўко**, што патыхае ўжо крыху школьніцтвам.

Марта Ганчарова аддала ў зборнік чатыры свае вершы, няроўныя па якасці, з моўнымі шурпатасцямі. Запамінаецца апошні — "Званы" такімі радкамі: "Кожны вечар каля рэчкі слухаю званы Літвы, а ў вачах не гаснуць свечкі храмаўроднай стараны".

Больш сталай у сваёй творчасці здалася мне **Міхаліна**. Яе лірычная гераіня ўжо нямала зведала ў жыцці, перажывае душэўны надлом, а то і адчай, часам чакае нават нейкага фатальнага, трагедыйнага канца. Гэтыя ж матывы і ў яе празаічных імпрэсіях, але ўжо не такая безнадзейнасць, бо

Бясконцае кола смерці.
Вечнае кола жыцця.
Што душы згараюць — не верце!
У душах жыве працяг.

Ёсць сярод аўтараў зборніка і творцы, якіх можна аднесці да сярэдняга пакалення. І зноў жа большасць з іх — жанчыны.

Які гэта невыносны для сэрца і душы стан, калі, наведаўшы на бацькаўшчыне маці, трэба зноў вяртацца ў Літву!

Для маёй дачкі — усё ж радзіма,
Для мяне — чужая старана! —

піша ў вершы "Граніца" **Валянціна Вільчынскене**, а " ў самой душа крывёй сачыцца". У другім вершы — "Пісьмо маці"

Дарога ў дзяцінства

Анатоль Бутэвіч (а яшчэ здабыткі яго творчыя і псеўданімам Максім Валошка падпісаныя) зрабіў ужо ў літаратуры досыць шмат. Хаця і арыгінальных яго кніжак выдадзена, здаецца, усяго тры. Але ж ёсць мастацкія пераклады. На рускую мову з беларускай — кнігі Аляксандра Капусціна, Уладзіміра Ліпскага, на беларускую з польскай — творы Станіслава Лема. А таксама — пераклады, якіх нямала было змешчана ў перыёдыцы. Перадусім гэтым — рэцэнзіі, артыкулы, нарысы.

А зараз вось — творы, адрасаваныя дзецям. Частка з іх сабраная ў кнізе "Расстайны пах асоту". Назву зборніку дало аднайменнае апавяданне. А адкрывае кнігу аповесць "Інстынкт, або Прысак кахання і жарства пакут". З яе, пэўна ж, і трэба пачынаць размову пра новую кнігу пісьменніка Анатоля Бутэвіча. Аповесць досыць лаканічная, сціслая, мо, калі так можна выказацца, стрыманая ў сваіх аб'ёмах. Аўтар, здаецца, баіцца зацягнуць свой аповед і тым самым нешта парушыць. Але гэта, як пасля разумееш, зусім не загана ў дадзеным выпадку. Анатоль Бутэвіч імкнецца багацейшай зрабіць вызначаную ім мастацкую прастору, максімальна насыціць яе эстэтыкай жыцця, катэгорыямі пакут, сумненняў і перажыванняў. Досыць просты і традыцыйны сюжэт абраны пісьменнікам. Анжэле, вучаніцы сёмага класа, падабаецца Раман. А хлопец... Словам, многае павінна патлумачыць ужо сама яго знешнасць: "Не, не пакрыўдзіла прырода Рамана ні прыгажосцю, ні ростам, дала востры язык і непаўторна-неспатольную ўсмешку. Гэтай усмешкай, як палачкай-выручалачкай, як чароўнай адмычкай карыстаўся ён дзе толькі можна і няможна. Нават з самых складаных і, здавалася б, безвыходных сітуацый яна выводзіла яго пераможцам, абязззбройваючы праціўніка, незалежна ад полу, узросту, месца і колькасці.

З-за гэтай чароўна-зваблівай усмешкі стаў Раман нават канкурэнтам Дзі Капрыа, тытанікавая папулярнасць якога ўсімі колерамі постэраў і часопісных выразак свяцілася са сцен дзявочых пакояў, смяялася з-пад вокладак школьных дзённікаў, на ўсю моц гучала песнямі з тэлэкранаў і розных музычных цэнтраў.

Якіх толькі прычын не выдумлялі дзяўчаты, каб рассмяшыць Рамана, прымусіць яго смяяцца альбо хоць бы усміхацца. Ведаючы гэткую сваю самакаштоўнасць, Раман годна і ашчадна, як сквапны рыцар, яе выдаткоўваў, не абдзяляючы, аднак, нікога — няхай зайздросцяць, карыстаючы з ягонага багацця, няхай прыдумваюць, як дабіцца ўсмешлівай ласкі".

Анжэла пакідае родны горад, едзе з бацькамі за мяжу. І тут ужо Анатоль Бутэвіч выбудоўвае арыгінальны сюжэт, канструіруе змест з лістоў, з перапіскі Анжэлы з сяброўкамі. Раман як быццам знаходзіцца недзе на заднім плане. Часам нават, чытаючы лісты чатырнаццацігадовай дзяўчынкі, неўпрыкмет задумваешся: "А ці каханне ў яе было? А ці не перабольшвае пісьменнік?.." І тут жа ловіш сябе на думцы: а калі няма кахання, то чаму ты, старонні назіральнік, услед за Анжэлай перажываеш — і за яе жыццёвыя, зусім не імгненныя перажыванні, трывогі, сумненні?.. Чаму як быццам разам з Анжэлай перажываеш за Рамана. У фінале аповесці высвятляецца, што хлопчык разам з бацькамі павінен прыехаць у той жа горад, "дзе жыла зараз роспачна-заклапочаная Анжэла..." А перад гэтым яшчэ і пісьмо-шыфраграма прыйшло ёй ад Рамана.

Што найболей прываблівае ў аповесці "Інстынкт..."? Анатоль Бутэвіч ставіцца да сваіх герояў як да людзей дарослых.

Бутэвіч А. Расстайны пах асоту: Аповесць, апавяданні: Для сярэд. і ст. шк. узросту / Маст. В. Сакалоў. / — Мн.: Юнацтва, 2000.

— яшчэ і гаркота, і боль, бо "мовай чужой краіны ён пра Айчыну гавару". "Ён" — гэта малой дачушцы.

Алена Пяшко-Базюк — магістр педагагічных навук, у сваёй творчасці яна строгі традыцыяналіст. Дый у жыцці, відаць, таксама. Па мастацкім узроўні яе вершы здаліся мне таксама няроўнымі. Дый ці бывае інакш. Ніводзін паэт не можа страляць толькі "у дзесятку". Памятаю, як адзін з мэтраў нашага прыгожага пісьменства (пухам яму зямля!) казаў: "Калі ў зборніку паэта есць хоць пару добрых, моцных вершаў, значыць кніга ёсць, адбылася, і яна вартая ўвагі". І верыцца ў тое, **што** паэтэса адрасавала маладым (дый сабе таксама):

Свой дух мы падтрымаем самі
І здзейснім многа добрых спраў.
Што будзе край наш
ганарыцца намі
І тыя, хто не раз нас папракаў.

Тэлежурналістка з Вільні **Таццяна Сапач** на літоўскім тэлебачанні робіць беларускія перадачы. Часта сустракаецца з людзьмі, суперажывае, калі чуе іх расказы пра сваю долю, пра жаданне вярнуцца на радзіму. У цесным спляценні іх і сваіх пачуццяў узнікаюць вершы — "Я так люблю той край, дзе наша месца, я ведаю, што значыць: сэрца рвецца... Але цябе прашу — не ад'язджай".

Вера Сляпянская-Хамянок па адукацыі юрыст. Яе паэта яе ведаюць ужо чытачы "Голаса Радзімы", "Літаратуры і мастацтва", "Рэха Літвы", у зборніку "Дарункі бацькоўскай зямлі" цэлая падборка яе вершаў — "Успаміны", "Асенні дождж", "Смутак", "Жыць, каб быць", "Лістапад", "Сумленнасць". Яны поўныя журбы і маркоты, "Настальджыя каналья" не дае спакою. Шукаючы лепшага месца пад сонцам "бегла ў сінюю даль", але — "не хапае паветра ў прасторах, не хапае любові, святла". І міжволі паўстае лёсавызначальнае пытанне — "Ці жывая яшчэ, ці жыва?"

Андранік Антанян, ён жа Андрэй Антонаў, скончыў Віленскі педуніверсітэт, а потым у магістратуры Віленскага універсітэта абараніўся па тэме "Неалагізмы і наватворы ў беларускай літаратурнай мове 1980—1990 гадоў". Вядомы ён і як літаратурны крытык. А ў "Дарунках роднай зямлі" выступіў як "хакеіст". Праўда, не той, што ганяе клюшкаю шайбу... Аддаючы даніну модзе, культывуе на нашай глебе трохрадкоўі накшталт японскіх хоку. Прыжываюцца яны ў нашым клімаце не вельмі, але што-нішто спрабуе зелянець. Прывабна, на мой погляд, выглядаюць такія "раслінкі":

Раптам прачнуўся.
Як ад дотыку маці.
Зыходзіць поўня.

Або такая —

Выйшаў на ганак.
Кап... Кап... — кроплі са страхі.
Учарашні дождж.

Лілія Сазанавец прадстаўлена ў зборніку двума апавяданнямі: "Мая споведзь" і "Пасля размеркавання". А ўвогуле друкавалася раней у часопісах "Маладосць", "Крыніца", у газетах "Чырвоная змена", "Народная воля", у амерыканскіх выданнях.

Але вернемся да вышэйназванага апавядання "Мая споведзь", бо яно варта ўвагі. Напісана яно ад імя хлопца, які нечакана-нежадана нарадзіўся у 16-гадовай маці. Рос "хлопчыкам для біцця", нелюбімым. У сталыя гады, не знаходзячы месца ў жыцці, кінуў работу, марнаваў дні беспрацоўным. Аднойчы, сам таго не жадаючы, учыніў забойства дзяўчынкі, а падставіў усё так, што ледзь не сеў за краты зусім другі. Зло, пасеянае ў яго душы змалку, дало такія ўсходы... Але чалавечае, што засталося на донцы душы, змусіла яго на споведзь — расказаць, як усё здарылася.

Ёсць у зборніку і прадстаўніца такога жанру, як крытыка — **Леакадзія Мілаш**, настаўніца Віленскай беларускай школы імя Ф. Скарыны. Яе "ўражанні ад прачытанага" — "У стомленасці ёсць трае імя" — не столькі ацэнкія, як лірычныя заметкі. І можна толькі пазайздросціць Леаніду Дранько-Майсюку, што ў рукі маневіта Л. Мілаш трапілі яго зборнікі вершаў "Акропаль" і "Стомленасць Парыжам". Ну хто б з крытыкаў мог яшчэ гэтак усклікнуць у экстазе: "Чытаючы і перачытваючы вершы Леаніда Дранько-Майсюка, адкрыла для сябе душу чыстай, узвышанай, духоўнай, філасофскай, вечнай паэзіі. Гэта не проста вершы, а кожны з іх — мініяцюрны лірычны раман. А ўсе разам утвараюць Гімн Каханню, Каханай, Жанчыне".

Брава, бравісіма — і Леаніду, і Леакадзіі!

Складальніца зборніка "Дарункі бацькоўскай зямлі" Лілія Плыгаўка паставіла **Алега Аблажэя** першым — "на адкрыцце". А я знарок прыхаваў яго на заканчэнне — як заключны, магутны акорд. Творы яго вартыя гэтага.

Але спачатку крыху пра самога. Родам з Навагрудчыны. Вучыўся малявацъ ажно трынаццаць гадоў, у тым ліку ў Літоўскай мастацкай акадэміі. У 1997 годзе ў Варшаве выйшаў зборнік яго твораў "Седзм баек..." (так-так, ён і па-польску піша). Нібы адказваючы на пытанні своеасаблівай анкеты, прызнаецца: "Не люблю самога працэсу пісання". Але мне здаецца, што гэта хутчэй поза, бо яго рука ўпэўнена трымае не толькі пэндзаль, але і пяро. А яшчэ ён прызнаецца — "Люблю жанчын", ім, каханню прысвечаны не адзін твор.

Багаты той, хто мае шмат.
Ды не ў каханні.
Дзе адно сэрца значыць
больш, чым сто,
Чым тысячы, мільёны сэрцаў,
дзе ўсмешка
Як ясны дзень, і дзе
твой сум — як ноч.
І ты сама — Сусвет.
І я — твой раб, і я — твой уладар.
І я — найбагацейшы
пасярод багатых.

Алегу Аблажэю падуладны не толькі вольны верш, але і той, што "з рыфмамі":

Але ж твой позірк — ён і тут
І рай і пекла спалучае.
І пасярод зямных пакут
Душу ратуе ад адчаю...

Падборка яго твораў у зборніку самая вялікая. Асобным раздзелам ідуць яго "Броўнаўскія думкі" (1980—2000). Я не паленаваўся падлічыў колькасць прапанаваных афарызмаў-мудраслоўяў — 120!

Мо і праўда тое, што ён не любіць "самога працэсу пісання", прывялі да такой канцэнтрацыі, згусткаў, разумовых успышак?

Прачытаем-паўторым некаторыя, услухаемся, удумаемся у іх. Многія гучаць так злабадзенна-папераджальна!

"Хочаш забіць у сабе усё жывое — вучыся гаварыць многа і прыгожа".

"Каб вырвацца ў мастацтве наперад, часам трэба аднаго — не спяшацца".

"Добра быць калючым — менш небяспекі. Але і пагладзіць не зможа ніхто."

"Мастак у такім жа даўгу перад народам, як і народ перад мастаком".

"Што горш: калі ёсць народ, а няма правадыра, ці калі ёсць правадыр, а няма народу?"

"Горкі хлеб мастака: ён здабываецца продажам сваіх дзяцей".

"Свабода слова ўключае і права на маўчанне".

"Калі хто спасылаецца на народ, ён мае на ўвазе: "Народ — гэта тыя, ухто думае так, як я".

"Самае паскуднае для мяне — маршыраваць "у нагу". Але яшчэ мярзотней — "у нагу думаць".

Але хопіць, усіх яго мудрот не перакажаш. Шкада, што ён, мастак і паэт, амаль не друкуецца ў беларускіх выданнях. А як бы хацелася пазнаёміцца з гэтым творцам больш шырока!

...Бруяцца беларускія крынічкі на Віленшчыне. І будзем спадзявацца, што яны не засохнуць!

Павел МІСЬКО

Пісьменнік, наколькі гэта ўдаецца, унікае ў іх чатырнаццацігадовых, псіхалогію. Яны, Раман, Анжэла, іх сябры, — дарослыя людзі, не меней сур'ёзныя, чым іх бацькі.

І ў аповесці, і ў апавяданнях пісьменнік максімальна выразна акрэслівае ролю, вышыню духоўнай гармоніі дзяцей як індывідуумаў. Няма ў дзіцячай прозе ўчарашняга, дагматычнага захаплення нашымі пісьменнікамі ўзаемаадносін калектыву і асобы. Ёсць асоба, якая згодна ўзроўню сваёй выхаванасці, унутранай культуры здолее і калектыў, і другую асобу поруч, поплеч з сабою ацаніць і заўважыць.

У апавяданнях Анатоля Бутэвіча ёсць такія падзагалоўкі, якія нельга абмінуць: "Рэфлексія першага ліставання" ("Знаемства ля сіняга мора"), "Рэфлексія першага пацалунка" ("Я буду помніць цябе"), "Рэфлексія першых запросін на танец" ("Я чую музыку..."), "Рэфлексія першай закаханасці" ("Расстайны пах асоту")... Гэта, відавочна, характарызуе выбраны пісьменнікам шлях як шлях лірычнай, эмацыянальна-настраёвай прозы, шлях, з якога, лічы, пачыналася беларуская сучасная проза, шлях, якім і зараз не баяцца ісці да спасціжэння галоўных мастацкіх і жыццёвых ісцін многія і многія пісьменнікі. Але ж пра само слова "Рэфлексія": "...Роздум, поўны сумненняў, хістанняў, аналіз сваіх думак і перажыванняў..." Відавочна, гэтым азначэннем і кіруецца Анатоль Бутэвіч, будуючы, выладжваючы "апавяданні дзяцінства". Пісьменнік не з'яўляецца суддзёю для сваіх герояў, адпаведна — для ўсіх падлеткаў. А гэта ці не галоўнае (і ў педагогіцы, і ў літаратуры) — быць роўным з дзецьмі, пазбягаць усялякай дыдактыкі.

Завяршае кнігу "хутарская рэфлексія" "У кожнага свае Баяры, або Спатканне з котлішчам майго маленства" (нарадзіўся Анатоль Бутэвіч у Баярах Нясвіжскага раёна). Пісьменнік вяртаецца дадому, трывожыцца яго сэрца ўспамінамі. Выяўляецца ужо традыцыйная для прозы А. Бутэвіча рыса: развагі, развагі, развагі... Развагі пераможаваны, перасыпаны сумненнямі. Пісьменнік, здаецца, нешта шукае. Спакваля разумееш: яго, Анатоля Бутэвіча, пошук патрэбен усім нам. Яшчэ болей — усім нам, хто вырас там, у вёсцы, на хутары, хто і надалей будзе жыць у стане заўсёднага ўспаміну пра "котлішча... маленства". Невыпадковае і з'яўленне ў "хутарской рэфлексіі" згадкі пра "Зорачкі" Сяргея Новіка-Пеюна. Сяргей Новік-Пяюн нарадзіўся ў 1906 годзе ў вёсцы Лявонавічы Нясвіжскага раёна і з'яўляецца земляком Анатоля Бутэвіча.

Калі толькі яны, родныя, не спяць,
Калі йшчэ й цяпер
на зорачкі глядзяць,
Данясеце ім, пакуль не бліснуў свет,
Зоркі мілыя, сыноўскі мой прывет.

Вандроўка пісьменніка на радзіму падаецца якраз да месца ў гэтай кнізе — у "Расстайным паху асоту". Анатоль Бутэвіч ведае, чым завершыць свой дыялог з юным чытачом.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

Нашы ў Балгарыі

Сёлета напрадвесні у брацкай Балгарыі выйшаў у свет зборнік паэзіі ў перакладзе на балгарскую мову нашага вядомага паэта Сяргея Законнікава пад сімвалічнай назвай "Шлях душы". Да гэтага былі публікацыі перакладаў з яго паэзіі ў перыёдыцы у калектыўных зборніках.

Выданне ўспрынята літаратурнай грамадскасцю Балгарыі з жывой цікавасцю. Вось, напрыклад, вытрымка з інфармацыі, змешчанай у літаратурнай газеце "Български писател" ("Балгарскі пісьменнік") за 27 сакавіка гэтага года:

"У зале "Надзея" сталічнай бібліятэкі адбылася прэм'ера кнігі "Шлях душы" беларускага паэта Сяргея Законнікава. Вядучая Ялена Алекава адкрыла вечарыну і дала слова паслу Рэспублікі Беларусь у нас Аляксандру Пятрову, які гаварыў пра развіццё стасункаў у духоўнай сферы між нашымі дзвюма краінамі за апошнія гады... Старшыня таварыства дружбы "Балгарыя — Беларусь" Стэфан Паптонеў падзяліўся уражаннямі ад лірыкі свайго беларускага сябра. Найдзен Вылчаў зрабіў агляд балгара-беларускіх культурных сувязей ад самага іх узнікнення да нашых дзён... Сярод прысутных былі міністр культуры праф. Бажыдар Абрашаў, Благавеста Касабава, якая напісала прадмову да кнігі, Эўцім Эўцімаў, Драгамір Шопаў, славацкі балгарыст Эміл Кудлічка, культурная грамадскасць..."

У водгуках на кнігу прагучалі высокія ацэнкі таленту беларускага паэта, адзначаны асаблівасці яго лірыкі, яе філасафічнасць, зпітаванасць з жыццём народа. Таму "праз старонкі гэтай кнігі, — піша наш даўні сябра Стэфан Паптонеў, — мы расхінаем душу паэта, які прыходзіць сказаць нам, што нашая праваслаўная свечачка пранесена праз стагоддзі, што яна гарыць і не дагарае... Прыходзіць сказаць, што як бы ні была распятая гэта душа, ад яе пакутаў нараджаецца надзея на перамогу над сіламі зла".

Благавеста Касабава ва ўступным слове да кнігі піша (вытрымкі):

"Асноўны, дамінуючы акцэнт у "Шляху душы" — гэта Радзіма. Для Сяргея Законнікава яна паняцце складанае, гэта пупавіна яго нага жыцця, карагод прыроды... любоў: любоў пяшчотная, ласкава настальгічная, з прыемным рамантычным прысмакам мінулага — ягоныя бяссонні і маральна катарсісныя дні".

Поспех перакладной літаратуры залежыць не толькі ад мастацкіх якасцяў арыгінала, а і ад майстэрства перакладчыкаў. Гэта прызнае балгарская даследчыца Благавеста Касабава ў сваёй прадмове да "Шляху душы": "Лічыцца, а напэўна так яно і ёсць, што пры перакладзе паэзія страчвае частку водару сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці, а таксама самабытнасці аўтара. "Шлях душы" Сяргея Законнікава ў максімальнай ступені захаваў не толькі дух і колеры беларускіх бярозавых гаёў і духмяных зёлак, а й пакуты беларускай душы..."

Паспрабуем супаставіць пераклады, пададзеныя ў падборцы ў газеце "Балгарскі пісьменнік" за 27.01.2002 г., з арыгіналамі. Творы змешчаны ў такім парадку:

"Прашу — не тузайце душу..."; "Пакуль жыве мая бяроза"; "Над Прыпяццю"; "Лісце кінуў у неба мой гай залаты"; урывак з паэмы "Цівалі" — "Сон машыніста Калейкі".

Паэзію немагчыма перакладаць слова ў слова. Важна, каб адпавядаў памер радка і каб у межах страфы выявіліся думкі і вобразы, якія зыходзяць з арыгінала.

"Прашу — не тузайце душу. / Прашу, пагодзімся на гэтым: / Я проста думаю, пішу. / Я размаўляю з белым светам"...

У перакладзе (Моля, без драми излишни...") — пераклад Ст. Паптонева — невялічкае адхіленне ад арыгінала у першым радку, у першым слове: у аўтара першае слова "прашу" — націск на другім складзе; у перакладзе першае слова адпавядае аўтарскаму — "моля" (прашу), але націск тут на першым складзе. Пры чытанні гэта неяк неўпрыкмет скрадваецца:

"Моля, без драми излишни, / моля, без да повтарям — / аз просто мисля и пиша / и с белия лист разговарям... (Даслоўна: прашу, без залішніх драмаў, прашу, каб я не паўтараў — я проста думаю і пішу, і з белым аркушам размаўляю.)

Змястоўнасць першай страфы: адразу ўзнікае вобраз чалавека мэтанакіраванага, незалежнага, упэўненага ў сваіх творчых сілах. Вялікіх накладак няма. У арыгінале аўтар размаўляе "з белым светам", у перакладзе — размаўляе "з белым аркушам". Сэнс той жа.

Асноўны змест у заключных радках: "Хоць не знасіць мне галавы / У краі здрайцаў і прыблудаў. / Цішэй вады, ніжэй травы / Не быў ніколі і не буду..)." У перакладзе: "Не ми се вие свят от това, / но си имам и аз присъда. / По тихо вода и трева / не сьм бил, нито ще бьда". Здаецца, у перакладзе няма патрэбы. Тут усё амаль слова ў слова.

І самыя апошнія радкі, дзе выказваецца годнасць чалавека: "Я ў вас нічога не прашу. / Я аддаю сваю душу. / Ды, не зважаючы на гэта, / І у тым, што дыхаю, пішу, — / Заўсёдная віна паэта"/. Пераклад: "И за нищо не моля вас, / отдавам душата си, но / ви обръщам внимание сетно — / в това, че дишам и пиша аз, / е цялата вина на поета".

Годнае, самасцвярджальнае прызнанне, і у перакладзе перададзена ўсё дакладна, нязмушана. Нездарма Ст. Паптонеў прайшоў вялікую школу беларусістыкі. Плёнам ягоных прыездаў да нас сталася яго кніга мастацкіх нарысаў "Беларусь — белая балада", цыкл вершаў "Бярозы, я ў палоне ў вас", нарэшце, ягонае старшынства ў таварыстве "Балгарыя — Беларусь".

Найдзен Вылчаў, мабыць, раней за Ст. Паптонева пазнаёміўся з беларускай літаратурай, бо ў кнізе балгарскай паэзіі ў перакладзе на беларускую мову Н. Гілевіча "Ад стром балканскіх" (1965 г.) у біяграфічнай нататцы зазначана: "З'яўляецца актыўным перакладчыкам з беларускай мовы і папулярызатарам беларускай літаратуры ў Балгарыі". У "Шляху душы" змешчаны лепшыя пераклады Н. Вылчава з твораў С. Законнікава. Нашу ўвагу прыцягнуў пераклад яго лірычнага верша "Пакуль жыве мая бяроза". У перакладзе кідаецца ў вочы неадпаведнасць загалоўка арыгінала: "Брезичко моя" ("Мая бярозка"). Ці апраўдана, ці дапушчальная такая вольнасць у мастацкім перакладзе? У аўтара гаворка ідзе пра бярозу — вялікую бярозу, у перакладчыка яна ператварылася ў маладую бярозку. І па-балгарску твор можна было б назваць "Докато ще живее брезичката ми", але тады загаловак не ўклаўся б у памер вершаванага радка. Пэўна, мае рацыю перакладчык: бярозка, маладая бяроза мае лепшыя жыццёвыя перспектывы.

Паэт размаўляе з бярозай, як з жывой істотай, у ёй вытокі яго сілы духу, настрою, натхнення. Верш напісаны ў энергічным, выразным памеры, дакладным рытме. І перакладзены дакладна, у ім захаваны ўсе параметры, усе нюансы і глыбіня думкі: "Жыві, бяроза!.. / Светлым болем, / Шчымлівай радасцю звіні... / На гэтым свеце / нас з табою / Адны / трымаюць карані".

"Над Прыпяццю" — твор, прысвечаны трагічнай падзеі, катастрофе на ЧАЭС. Напісаны ён са шчымлівым болем за наш народ, які найбольш пацярпеў ад выбуху. Верш створаны ў размераным рытме, вобразны, з мноствам нюансаў і дэталяў, якія ўзнаўляюць рэаліі трагічнай падзеі. Пераклад Зоі Васілевай зроблены спрактыкаванай рукой, прафесійнай.

У кнізе як і пераклад вядомага паэта Маркі Ганчава. Гэта мініяцюра рэфлексійнага характару "Лісце кінуў у неба мой гай залаты...".

Вострадраматычная паэма С. Законнікава "Цівалі" асноўнымі часткамі ўвайшла ў кнігу ў перакладзе Ялены Алекавай. У раздзеле "Сон машыніста Калейкі" адлюстроўваецца адзін з самых драматычных момантаў нашай гісторыі, які асвятляецца ў прыведзенай тут даведцы: "Перад вайною па загаду наркома Л. Кагановіча за "сабатаж" была расстраляна вялікая група беларускіх чыгуначнікаў..." "Сон машыніста Калейкі" — гэта жудасны ўспамін пра тое, як яму давялося весці састаў з людзьмі на смерць. Пазнаёміўшыся з гэтым поўным драматызму, творам С. Законнікава, балгары даведаюцца, што давялося перажыць нашаму народу ў часы сталінізму. "Рады вітаць цябе на нашай зямлі"," — пісалі балгарскія газеты. А мы пажадаем нашаму земляку, прызнанаму творцу і ягоным творам шчаслівага шляху ў замежжы.

Уладзімір АНІСКОВІЧ

"Бібліятэчныя тайны"

Менавіта такую назву мае кніга Ірыны Арахоўскай, прысвечаная дзейнасці фундаментальнай бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. З нагоды з'яўлення выдання ў галоўным корпусе БДУ адбылася ўрачыстая прэзентацыя. Усім, хто прыйшоў выказаць павагу і ўдзячнасць аўтарцы, быў прапанаваны невялічкі экскурс па старонках кнігі.

Ірына Уладзіміраўна аддала любімай справе 47 гадоў жыцця. Пры чым трыццаць з іх прысвечаны працы ў бібліятэцы галоўнай навучальнай установы краіны. Усё, што адбывалася ў бібліятэчным жыцці за гэты немалы перыяд, знайшло адлюстраванне на старонках кнігі.

З шчырай павагай і цеплынёй аўтарка ўзгадвае тых, хто ў свой час зрабіў значны ўклад у развіццё фундаментальнай бібліятэкі БДУ. Сярод такіх людзей, несумненна, першы рэктар установы Уладзімір Пічэта, які "пастаянна знаходзіў магчымасць у цяжкія для універсітэта часы аплачваць рахункі на набыццё літаратуры і бібліятэчнага абсталявання".

У раздзеле "Яго Вялікасць Чытач" адным з цэнтральных персанажаў з'яўляецца цяперашні рэктар БДУ Аляксандр Казулін, які падчас студэнцтва быў адным з самых актыўных чытачоў.

Раздзел "Залатыя россыпы" цалкам прысвечаны калегам — бібліятэкарам, іх цікавай і вельмі адказнай працы, майстэрству стварыць у чытальнай зале чароўную атмасферу.

Застаецца зазначыць, што кніга атрымалася цудоўнай не толькі па змесце, але і цікава афармлена. І хоць тыраж выдання не такі вялікі, можна з упэўненасцю сказаць, што "Бібліятэчныя тайны" заслугоўваюць самай высокай адзнакі — чытацкага прызнання.

Кацярына МАРГОЛЬ

"Беларуская думка", № 3

Пра тое, чым жывуць сёння культурна-асветныя работнікі Асіпоўшчыны, пра загадчыка Асіповіцкага раённага аддзела культуры В. Налівайку расказвае ў нарысе "Работа без выхадных" А. Марціновіч. Змешчаны вершы Н. Маеўскай і працяг "Ненапісанай аповесці" І. Пташнікава. Творчы партрэт У. Глушакова "У згодзе з міласэрнасцю і высакароднасцю" напісала А. Яскевіч. Э. Скобелеў ("Усёмагутнасць і бяссілле прарокаў") рэцэнзуе кнігу С. Князева "Кіраванне: мастацтва, навука, практыка". Прарэктар Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры Р. Бузук выступае з артыкулам "Праблемы ўспрымання спектакля". "Бульбяная школа" М. Шэлехава — магчымасць пазнаёміцца з думкай расійскіх настаўнікаў пра 12-гадовую школу. Прапануюцца палемічныя нататкі А. Рогалева "Свабода і дэмакратыя: карлікі і гіганты". Галоўны рэдактар "БД" У. Вялічка выступае з публіцыстычным роздумам "Спружыны бяздоннай смуты". А адкрываецца нумар словам старшыні Беларускага саюза жанчын Н. Ермаковай "Жанчына — гарант здароўя нацыі".

"Малая сакавіца — 2002"

У Маладзечне прайшоў першы гарадскі фестываль дзіцячых драматычных калектываў "Малая сакавіца — 2002". Фестываль быў арганізаваны Маладзечанскім Цэнтрам пазашкольнай работы пры дапамозе Мінскага абласнога драматычнага тэатра.

Прагледзеўшы 10 конкурсных спектакляў, журы вызначыла пераможцаў. Галоўны прыз "Малой сакавіцы" атрымала Тэатральная студыя школы мастацтваў г. Маладзечна "Кіпень" за спектакль "Паўлінка". Былі ўручаны дыпломы і ў іншых намінацыях: "Лепшая роля другога плана, "Лепшая галоўная роля"... Па-за конкурсам фестывалю сярэдняя школа № 7 г. Маладзечна атрымала ганаровую грамату ад літаратурнага аб'яднання "Ad marginem" за прафесійны падыход да тэатральнага мастацтва.

Уладзімір МАРТЫНЕНКА

ПАЭЗІЯ

Васіль ЗУЁНАК

Прытча

Карцела: не адстаць ад моды.
Ды не здзівіў — ні свет, ні муз.
Шукаў саперніцтва з прыродай,
Цяпер — прыняць малю ў саюз.

Я знаю моц і славу слова,
Ды ўжо не бог яно, відаць, —
Нам Госпад даў яго асновы,
А мы іх мусім разгадаць.

Вось і стараемся,
як можам,
Гукаем, а сусвет маўчыць...
Прашу:
"Дапамажы мне, Божа..."
Ды прытчай ён пачаў вучыць:

"Адвеюць зерне ад паловы
Над полем веснім жаўрукі —
І, не ўвасобленая ў слова,
Бруіцца песня праз вякі..."

●

Беларусы, памолімся Богу —
Таму, пра якога казаў Караткевіч:
"На Беларусі Бог жыве..."
Значыць, ёсць ён у нас —
Як са шчасцем паўнюткі келіх?
І такога болей няма ні ў кога:
У нашых спевах
І ў нашых дрэвах,
На нашай ніве
І ў нашым жніве,
У нашай траве
І ў нябёс сіняве,
У галашэннях
І ў суцяшэннях... —
На Беларусі
Бог жыве...

Толькі Бог наш нейкі адметны:
Нібы скарбнік
бедаў сусветных,
Што для нас адных прыбярог,
Бог трагічны і Бог самотны,
Як і мы, з гэткім
лёсам гаротным:
Мы гаруем і з намі Бог...
Як гарох
Пры вялікай дарозе:
Хто ні йдзе —
кожны раз ушчыкне
Ды яшчэ й папікне.
А як не —
Мы і ўсцешымся той перамозе...
Быццам Бог наш
заўсёды ў абозе.
Не на покуці, а ў парозе...

І аднак —
Памолімся Богу,
Беларусы: ён з намі, ён наш —
Беларус на зямлі беларускай,
Не прымолены з-за мяжы,
Не міраж з балбатнёй у прыкуску.
Ён чакае,
Калі ж пажадае
Беларус — сам сабе не чужы —
Ў хаце з Богам шчаслівым
Жыць.

Курапаты

ПРАЕКТ ПОМНІКА

Каго бараніць
Беларускі люд
Ідзе ў гарадскі прылесак?
Каго бараніць? — няма іх тут... —
Прасуе мазгі
Беларусам прэса.

А следам — бульдозер
Прасуе зямлю,
Цякуць з-пад каткоў
Гудронныя плёсы...
"Няма..." —
І вярнуцца іх не ўмалю —
Пакутныя душы
Пакутнікаў лёсу...

Тут толькі рвы —
Працягам турмы.
А душы —
Яны адляцелі на волю...
І глушаць памяць
Матораў грамы,
І душыць дарога
Пятлёй кальцавою...

І я зразумеў —
Хоць і грэх на душу,
Можа, бяру, —
Хай, нібыта праз сэрца,
Праз Курапаты
Кладуць шашу, —
А ўсцяж —
Хай лес крыжоў узнясецца!..

Сцяна крыжоў, —
Каб хто ні ішоў
І хто ні ехаў па гэтай дарозе,
Супакаення пасля не знайшоў —
Ні ва ўласнай душы,
Ні ў Бозе...

Зрок

Міколу ЕРМАЛОВІЧУ

У гісторыі свой закон:
Той ніколі не жаў, хто сеяў.
Заставаўся нашчадкам плён —
"Іліяды" і "Адысеі".

Нарадзіўся сейбіт і ў нас,
Ды не выйшаў
з сявенькай у поле:
Рана зрок ягоны пагас,
Ахінула цямрэчаю доля.

Ды не стаў уладарнікам змрок:
Не зламаў, не схіліў,
не раструшчыў.
Быў за ўрокам урок — кожны крок:
Светлай памяццю
быў відушчы.

Над стагоддзямі крылаў узмах
Адкрываў яму далягляды.
Беларускай гісторыі шлях
Ён абраў не дзеля парадаў.

Праз адчай і завалы маны
Ён навобмацак прабіраўся.
Чуў, як звоняць продкаў званы,
Каб у цемры народ не губляўся.

Лёс на радасці быў скупы,
Але ж ён і не даў лізасловіць:
Страціў зрок, ды не быў сляпы
Беларускі Гамер — Ермаловіч.

Верыў: праўдай трымаецца свет, —
Летапісец не мусіць быць хлусам.
З тым і жыў — як жыве запавет:
Зрок вярнуць сляпым беларусам...

●

Буяе трава
На дражджах дажджу —
На лысагорскім лецішчы.
Як Брыль вучыў,
На траву гляджу,
Каб адхрысціцца ад нечысці.

Шапоча трава.
Нібыта ў дзяжы —
Пеніцца, падыходзіць...
Ты ёй пра напасці свае раскажы, —
Кажуць, адводзіць.

Ты ёй адгукніся.
Але не прасі —
І не вымольвай замнога.
Яна сама
Знае ўсё аб усім, —
Трава, угодная Богу...

●

Адвакаты —
адводзяць ката
Ад спакуснай катаўскай місіі:
"То хіба ж і Сакрата за краты,
Што з такой геніяльнаю лысінай?"

Адвакаты — сшываюць дратвай
Правасуддзя
ветразі волі.
А два каты: паклёп вусаты
І прысуд — не знаюць патолі...

Адвакаты — адвадзіць ката
Ад вышэйшай стараюцца меры.
Ды — для ката ты ўжо вінаваты
Тым, што ёсць у ката сякера.

Плач па дзвюх апошніх алешынах

Хто мне верне крыніцу
З альшанаю песняй драздовай?
Чорны дрозд майго смутку
Сёння ў сэрцы звівае гняздо,
Плач гайдаюць свой кнігаўкі,
Як бяздзетныя ўдовы,
Сонца ў пыле тарфянішча
Мроіцца чорным груздом...

Вуж, як гуж сырамятны,
Абмяк разагрэта,
Смалякамі тырчаць
Дапатопнай сасны карані,
І на варце пацеюць,
У чырвоных берэтах,
Два манкурты-ахоўнікі —
Альховыя свежыя пні...

●

...І некаму "мама" сказаць...
З эпітафіі

Што гэта будзе — шлях ці небыццё?
Ніхто не скажа, покуль
сам не ўзнаеш, —
Ні роспачы, што белы свет гублясш,
Ні шкадаванняў марных:
"Каб знаццё..."

Жыццё на тое
й дадзена табе,
На тое й забіраецца, напэўна,
Без ведама твайго
і неспадзеўна,
Каб ты не марнаваў яго ў журбе.

Не спакушайся ж радасцю зямной,
Але й нябеснай
не чакай маркотна...
Лісцё з бярозы падае шапотна, —
Схіліся над жыццём, як над труной...

Маўчыць душа, агораўшы спакой,
І цені дзён няздзейсненых блукаюць:
Ці дакараюць моўчкі, ці гукаюць? —
І хто ты ёсць на споведзі такой?..

Гора

"Гора не мёртваму, гора жывым"... —
Гаману памінкі закусваюць...
Адкуль вам вядома? Ці, можа, вы
ТАМ пабылі на экскурсіі?

А можа, якраз-такі наадварот:
Адтуль душа не памерлая
Глядзіць, як пяклуецца ТУТ народ, —
І гора яе невымернае...

Доўгажыхарка

"Час і манаткі збіраць, —
Казала бабка-прарочыца, —
Ды кепска зімой паміраць,
А летам не хочацца.

То — далакопы ў мароз
Як жа магілку мне вырыюць?
То — слухаю песню з бяроз:
Шпакі вяртаюцца з выраю...

Нібы на вакзале якім —
Паміж зімою і летам я:
Гляджу, як ідуць цягнікі,
Сяджу, безбілетная..."

Ліпень

Дарога — нябесная лесвіца —
Гайдаецца ў зыбкай смузе.
Зямля — Перунова равесніца —
Спяшае наўслед у тузе.

Спякотнай глядзіць афрыканкаю
Еўропа ў высокі зеніт.
Жаўрук аблачынай-фіранкаю
Заштурвае хранку блакіт.

А ліпень духмяную накрыўку
Ўзрывае над брагай густой,
І лета па самую макаўку
Нырнула ў мядовы настой.

КАВА ДЛЯ ДАМАВІКА

АПАВЯДАННЕ

Раіса БАРАВІКОВА

У яе быў Дзень нараджэння. Сёння. Халодны дзень. Павіншавалі на працы, у маленькай ашчаднай касе, дзе яна трэці год працуе касіркай, — вунь яны, пяць чырвоных гваздзікоў стаяць на століку, а яна, трыццаціпяцігадовая, ляжыць на канапе і блізка прыстаўленым тэлефонам, — можа, хто пазвоніць?! А раптам? Раптам... званок! "Гэта я, не пазнаеш?.. А я помню. Сёння твой дзень, хачу цябе бачыць..." "Хто гэта?" — радасна выдыхне яна і пачне "ўспамінаць"... Хаця, што згадваць?! З апошнім, можна сказаць, выпадковым знаёмым яна развіталася два месяцы таму назад. Гм-м, развіталася! Проста выгнала і ўсё. Твар у яго быў нахабны, не інакш прымерваўся да кватэры. Відаць, было зручна завярнуць з шклянкай, каб не на вуліцы, не ў скверыку... А ў яе што, закусачная?!"

Прыкрылася коўдрай. "У мяне не закусачная. От, ляжу сабе ціха, ніхто не глуміць галаву, а можна і ўстаць. Адзінае, чамусьці вельмі сябе шкада і асабліва ў святочныя дні". Яна прыкусіла ніжнюю губу. Дурніца, ды хіба табе рабіць няма чаго! Дзе пыласос? Трэба падняцца, хутка прайсціся па дыване, каб ні пылінкі, потым выцерці пыл з мэблі, тое-сёе памыць... Нарэшце, узяцца за вячэру — спаць...

Глыбей нацягнула коўдру, вочы заплюшчваліся. Посуд! На кухні стаяць брудныя кубачкі з недапітаю кавай, непамытая кававарка... Але ўсё заўтра, заўтра...

Яна стаяла пасярэдзіне пакойчыка. Ага-а, пыласос... вунь у кутку. Толькі замест таго, каб падысці да пыласоса, падышла да акна. Знаёмая прывакзальная плошча. Тры вочкі святлафора — зялёнае, жоўтае, чырвонае... Маці, калі разменьвалі іхнюю старую чатырохпакаёвую кватэру, чамусьці была супраць гэтага месца. Нават спрабавала адгаварыць яе — маўляў, шумна, спакою не будзе. А некалі замуж выйдзеш, дзіця народзіцца, не засне малое. Хацелася рассмяяцца... Маці і цяпер раніцай, калі пазваніла, каб павіншаваць яе, пасля звычайных у такіх выпадках слоў, павучальна сказала: "Калі ёсць хто, дык сяброўкі не запрашай, сяброўкі тут не дарадчыцы... Пакуль цвёрда ўсё не завяжацца, сяброўкі блізка не падпускай. Адаб'юць! Разлучаць!" Дзівачка маці, што завяжацца? Ёй увесь час здаецца, што калі б не сяброўкі, яна не заседзелася б у "старых дзеўках" у сваёй асобнай кватэры. Каб гэтага не здарылася, дзеля яе, уласна кажучы, і рабіўся размен.

— Ужо не той узрост, каб жыць пры бацьках, — сказала тады старэйшая сястра, — яна знаёмага запросіць, а вы ў шчыліну падглядваць будзеце! Сучасныя мужчыны ў тую хату, дзе старыя бацькі не пойдуць! Жанчыне ў трыццаць пяць гадоў трэба жыць адной, асобна.

І маці пагадзілася з сястрою. Гм-м, пагадзілася.. Зялёнае... жоўтае.. чырвонае... міргаюць вочкі святлафора. Вось што... Яна адвярнулася ад акна. Вячэра? У халадзільніку пельмені гастраномныя, кавалак сыру. Ды што прыдумляць, калі на вакзале ёсць буфет! Можна выпіць кефіру, з'есці які бутэрброд, і не трэба пасля мыць ніякага посуду, толькі апранушча, прайсціся па свежым паветры... Накінула паліто на хатні халацік, — у буфеце ж не распранацца! — хутчэй па звычцы падвяла чорным алоўкам вочы, падфарбавала вейкі. Усё! З пад'езда выйшла не спяшаючыся — дыхаць паветрам, дык дыхаць, — і неўзабаве злілася з людскім патокам, несціханым і мітуслівым (людзі ж тут, на прывакзальнай плошчы, у асноўным прыезджыя), а ёй можна і не мітусіцца, ёй няма куды спяшацца.

У вакзальным буфеце яна стаяла ў чарзе за высокім мужчынам у скураной кепцы, нацягнутай на самыя вочы, і звярнула на гэта ўвагу толькі таму, што ён моўчкі прапусціў яе ўперад.

— Вы што? — не зразумела.

— Хм-м... нічога! Я не спяшаюся.

— Я таксама... — але звярнулася да буфетчыцы. — Кефір, адну шклянку, і два бутэрброды з сырам.

— Каву з малаком не бярыце, — пачулася ззаду. — Лепш мінералку. Кава халодная.

Гаварыў мужчына ў скураной кепцы, яна гэта адчула, не азіраючыся.

— Што далей? Два бутэрброды з сырам?.. — нецярпліва паўтарыла прадаўшчыца.

— Каву з малаком і яшчэ піроЖнае. Можна эклер.

Працягнула прадаўшчыцы грошы, з талеркай, шклянкай кефіру пайшла да свабоднага століка. Кава! Яшчэ трэба ўзяць каву!

— Ваша рэшта і кава, — мужчына ў кепцы паставіў на столік шклянку з кавай, паклаў побач рэшту, пайшоў да стойкі. Праз хвіліну вярнуўся са шклянкай мінеральнай вады.

— Вы не супраць? Дарэмна адмовіліся ад мінералкі...

Пахнула тытунём. Яна зрэдку і сама была не супраць узяць цыгарэту, але тут быў нейкі асабліва непрыемна-рэзкі пах. Моўчкі [illegible] са шклянкі з кефірам.

— Значыцца, не супраць?

Ёй хацелася абурыцца, [illegible]! Падняла вочы. Мужчына шырока ўсміхаўся. Зубы былі пракураныя, ці мелі жаўтаваты колер ад прыроды.

— А вам пасуе!

— Што пасуе?

Яна не хавала раздражнення. Узяць і перайсці за іншы столік? Столікі ўсе занятыя... Зноў падняла вочы на мужчыну. Што яму трэба ад яе?

— Пасуе плямка ад кефіру вось тут... Ды не нервуйцеся вы! Проста не люблю вакзалаў. Быў няўдалы дзень...

— Дык надумалі прычапіцца да мяне? Нібыта ад гэтага ў вас з'явіцца любоў да вакзалаў!

Яна адставіла кефір, хутка праглынула сухі бутэрброд, запіваючы кавай з малаком, якая сапраўды была халодная і нясмачная. Эклер загарнула ў сурвэтку.

— Спяшаецеся? Пойдзеце на паветра ці ў залу чакання?

— Куды-куды? — ёй хацелася крыкнуць: якая зала чакання, да чаго тут зала, калі насупраць ейны дом, ейная кватэра! Але стрымала сябе, павярнулася і пайшла. Ненармальны! Абы прычапіцца!

Ён дагнаў яе ля перахода, кепку яшчэ глыбей нацягнуў на вочы.

— Адной не сумна?

Спынілася. Паглядзела на яго зверху ўніз. Святло ад ліхтара нібыта выхоплівала мужчыну з цемры. Божа! Куртка расшпілена, шалік з паабрыванымі кутасамі і гумавікі! Зялёныя гумавыя боты з шырокімі халявамі. Прайдзісвет! Напэўна, п'е... у адзіноце... во-о і твар непаголены! Толькі цяпер звярнула на гэта ўвагу. Ёй чамусьці падумалася, што да яе заўжды чапляліся менавіта такія, да непрыстойнасці абыякавыя да сваёй знешнасці і, як выяўлялася пасля, без выключэння ўсе пачынаючыя алкаголікі: Наліў — выпіў, выпіў — наліў!.. Гэтага яшчэ не хапала!

— Доўга будзем стаяць?

Божа, ён пасміхаецца! Спрабуе зрабіць надзвычай лагодны выгляд. І тут яе як прарвала:

— Ды што вам трэба ад мяне? Ідзіце прэч! Мне непрыемна вас бачыць! Я спяшаюся. Спяшаюся дадому... Я хачу адпачыць! У мяне сёння Дзень нараджэння. Вы сапсавалі мне вечар!..

Ён нахіліўся да яе.

— А-а?! У такім разе вечар толькі пачынаецца. Хм-м. Дзень нараджэння са шклянкай кефіру... — і ціха, ля самага твару: — Як хочацца кавы... сапраўднай гарачай кавы... без цукру!

...Яны падыходзілі да яе дома. "А зрэшты, што ж у тым кепскага, калі я і запрашу яго на каву, — думала яна. — Ну паабрываныя кутасы на шаліку, ну гумавікі з шырокімі халявамі, на калене латка на джынсах, — гэта яна заўважыла ў падземным пераходзе праз плошчу, — а так і нічога сабе... Нават залішне далікатны. На злодзея не падобны, ды і ўвогуле, што ён можа зрабіць мне ў маёй кватэры?! Суседзі, тэлефон... У любы момант можа патэлефанаваць маці, альбо сястра. Не замуж жа за яго ісці, ды і пры чым тут паабрываныя кутасы на шаліку, латка на джынсах, можа, ён і вельмі харошы чалавек".

— Мы прыйшлі.

Двор, куды яны заварочвалі, быў цёмны, змрочны.

— Жывяцё... Дзіўна, многае забываецца, — казаў ён, — а вось гэты будынак я добра запомніў, яшчэ ў дзяцінстве, не думаючы, што буду запрошаны сюды на каву. Можа, таму, што на ім гадзіннік? Я ж сам мінчанін. Кватэра ў Зялёным Лузе. А жыву ў вёсцы... А вы тут, пад гадзіннікам. Цік-так, цік-так... Не цікае?

— Яшчэ як цікае! — хацелася адказаць ёй. — Трыццаць пяць націкала. — Але маўчала. Думала. Кватэра ў Зялёным Лузе. Мінчанін. Жыве ў вёсцы. Можа, хворых бацькоў даглядае? Можа, так... На дачы! А работа? Дзе ж ён працуе? Доктар? Настаўнік? Непадобна!

Моцна грукнулі дзверы.

— От, зябка, не прытрымаў!

Ён узяў яе за локаць, гарачэ задыхаў у патыліцу.

— Чаго ж цёмна?! Пад'езд без святла зара...

Боты ягоныя цяжка тупалі. На хвіліну з'явілася нерашучасць. Ці добра яна робіць, што вядзе яго? Зрэшты, каву мог бы выпіць і дома, калі мінчанін. Навошта напрасіўся да яе? Вось і дзверы. Вочы прызвычаіліся да цемры, адкрыла кватэру хутка. Уключыла святло, сказала, каб здымаў куртку. Успомніла пра свой хатні халацік:

— Даруйце, вы госць неспадзяваны...

Ён толькі пасміхнуўся. Сцягнуў кепку, моўчкі зняў куртку. Яна заўважыла, што ў яго прыгожыя вочы і валасы.

— Боты сцягну, не супраць? — нарэшце азваўся ён.

Згодна кіўнула. Каб не замінаць яму ў цесным пярэднім пакоі, пайшла на кухню. Кубачкі! Тэрмінова трэба памыць кубачкі і кававарку! Пачала мыць. Чула, як ён прайшоў у пакой. Затрымаўся хвіліну. Ідзе да яе...

— Адразу за каву? — пасміхнуўся. — Аб'яву ў газету яшчэ не давалі?

— Якую аб'яву? — яна не зразумела.

— Звычайную. Маладая жанчына прывабнай знешнасці хоча знайсці партнёра па жыцці, мае сваю кватэру.

— У вас і жарты!

Задумалася. Хм-м... Толькі ўчора думала яна пра гэтую аб'яву. Стрымлівала адно: няма вышэйшай адукацыі, прэстыжнай працы, а гэта, як казала сяброўка, для сучасных мужчын таксама іграе не апошнюю ролю. Калі прагматызм, дык ва ўсім... Прывабнай знешнасці і кватэры мала, проста касірка ў ашчаднай касе не гучыць! Дыплом, як фасад...

— А вы што, цікавіцеся аб'явамі ў газеце? — паглядзела на яго.

— Ды не, — ён абапёрся на вушак. — Неяк аднойчы натрапіў. Жанчыны дзіўны народ: усе, якадна, пішуць: "Маю прывабную знешнасць". А тут трэба зацікавіць. Нешта зусім нязвыклае... Скажам, гатую толькі адну страву: вельмі смачную качку з яблыкамі, альбо: вяжу цудоўныя каптурыкі для нованароджаных...

— Качкі з яблыкамі ў мяне няма, толькі кава... — яна развяла рукамі. — А што гэта вы пра аб'явы? — расцягвала словы. — Скуль вы ўзялі, што я адна... тая самая адзінокая жанчына?

— Трэба быць сляпым, каб гэтага не бачыць. Бр-р-р... ды ў вас кожная рэч у доме крычыць пра адзіноту. Вось сюды, калі ласка!

Ёй здалося, што ён падхапіў яе на рукі, а ён проста ўзяў за руку і пацягнуў у пакой. Спынілася на парозе. Глядзела на сцены, на знаёмую мэблю, потым запытальна на яго.

— Паказаць? — ён падышоў да шафы. — Божа, якое сіроцтва! Тры створкі, гэты халодны паліраваны бляск... А вы зрабіце вось гэтак!

Павярнуў ключ у шафе, прыадчыніў дзверцы. "О-о, якое багацце!" Яна ўся сцялася. Што ён робіць?! Навошта? Ён пацягнуў да сябе край зялёнай сукенкі, стукнуў дзвярамі, зашчаміўшы гэты краёк...

— Ну вось цяпер іншая справа! Я бачу, што ў доме жыве жанчына. Яна, між іншым, прышчаміла край сукенкі, якую вешала ў шафу. Яна некуды спяшалася. Прыгожая сукенка. Вельмі! Жанчына павінна любіць сукенкі. Яны шыюцца для яе. Яны павінны яе ўпрыгожваць, але іх трэба ўмець насіць. А калі яшчэ такі твар, як у вас! Вы паглядзіце! Гэты зялёны краёк, як ветразь! Ён вабіць і ляціць... ляціць да свайго берага. Падыдзіце, сядзьце на канапу.

Яна падышла. Села. Ён адгарнуў з яе лба грыўку.

— О-о, ну, вядома, я гэтак і думаў! Цудоўны лоб! Незвычайна прыгожы лоб. А вы яго — пад грыўку! Не трэ-э-эба! Усё, што прыгожае, павінна быць навідавоку.

Яна спрабавала адгарнуць грыўку назад, адвяла ягоную руку.

— Разумею. Вам нязвыкла. Дарэмна! Грыўка вас псуе. Палова праспекта ходзіць з грыўкамі, а вам трэба адкрываць лоб. У вас маленькія прыгожыя вушкі. Калі вы не будзеце падводзіць вочы гэтым чорным тлустым алоўкам, а толькі злёгку пакладзяце цені — лепш зялёныя злёгкім карычневым — у вас будуць вельмі выразныя вочы. Вам, дарэчы, падабаецца зялёны колер?! Мне падаба... гэта мой — любімы...

— Кіньце! — яна падхапілася з канапы. — Вы прасілі напаіць вас кавай! Трэба ж яе паставіць.

— Чакайце. Пакінем вас. Вернемся да кватэры. Тэлевізар у кутку, — усё зразумела, каб можна было ляжаць на канапе! Вельмі зручна. Ляжыш і глядзіш! Не трэба ляжаць — гэта засмоктвае. Трэба стварыць нязручнасць. Значыцца, пераставіць яго вось сюды... — і ён пацягнуў тумбу з тэлевізарам.

"Раскладны стол-кніга. Яму тут не месца!" — [illegible] да яе. І стол "ехаў" да супрацьлеглай сцяны. "Кветкі, гваздзікі... як пяць алавяных салдацікаў напагатове! Ды не трэба іх разам! Тры пакінем тут, а па адным вось сюды, у тую шклянячку і збаночак!" Ён яшчэ нешта перасоўваў, перацягваў, перастаўляў. Пакой на вачах змяняўся, быў яе і не яе. Нарэшце, ён спыніўся, выцер лоб рукою.

— У мяне ўсё! Кава гатова?

Яны пілі каву на кухні, так хацелася яму, там больш [illegible]. Яна сказала, што не хоча, каб усе размовы круціліся толькі вакол яе, ну, а што ж ён?! Ёй гэта цікава.

— Я? Я... нічога! З дзяцінства малюю. Тое-сёе выстаўляў, але гэта так... не Эль Грэка! Зараз у вёсцы. Старшыня знаёмы работу прапанаваў. За тры кавалкі [illegible] залу ў Доме культуры трэба аздобіць. На тры сцяны — палотны! Я, вядома, пагадзіўся і амаль усё выканаў. Прыгожа. А вось тры кавалкі прапанаваў аддаць на вяндлярню. Для калгаса і працоўнага сялянства. Пачнуць біць вепручкоў сваіх, хай вэндзяць каўбасу. Хм-м, не хоча старшыня, у яго іншыя думкі. А як жа харч для насельніцтва?! Колькі можна вяскоўцу ў горад за каўбасою ездзіць? А-а!

Яна падлівала каву. Вяндлярня... Каўбасы... Ён, аказваецца, малюе з дзяцінства. Ёй шкада было сукенку, зашчэмленую дзвярамі, і муляў вочы тэлевізар. Вядома, не на сваім месцы! Гэта раздражняла. Ён дакрануўся да яе рукі.

— Вы паслухайце. Нядаўна іду на бульбу разам з жанчынамі. Мерзнуць пётачкі, рукі стынуць, усе навіны вясковыя перагавораны, адна нервовасць! І ініцыятывы ніякай! На наступны дзень я ім плакат прынёс. Ноч маляваў. Дыні, бананы, апельсіны, вінаград, ананасы... "Вось гэта, — кажу, — ананас. Ён расце ў Афрыцы. А ў нас свая Афрыка і свой ананас. Гэта, кажу, бульба наша. Дык, давайце, і стаўцеся да яе, як да ананасаў!" Я вас, пэўна, натаміў... Кава выпіта?

— Ды не, ёсць яшчэ. Наліць?

— Дзякую, дастаткова.

Яна сабрала кубачкі на маленькі паднос.

— Гэта пасля памыецца, а зараз, можа, тэлевізар?

Ён пасміхнуўся.

— Хм-м, тэлевізар? А навошта вы сказалі "Пасля памыецца"? Не... Жанчына павінна сказаць мужчыну іншае. І ведаеце што?

— Што? — яна насцярожылася.

— Кава! Застаецца кава ў кававарцы. Можа, хай пастаіць да заўтра? Гэта для... дамавіка. І ўсё! І ў мяне няма адчування, што адзінота засмактала вас да "пасля памыецца"... Абыякавасць пры адзіноце — страшная рэч! Ну, а наконт дамавіка... Вы, наколькі я разумею, тут... нядаўна. Яго ўзялі з сабою?

— Каго гэта яго?

— Дамавіка! Значыцца, не ўзялі... А трэба ж было, як пераязджалі, адчыніць сумачку і прамовіць: "Ну, мой дамавік, скачы сюды... Паедзем у новае жытло". Не сказалі, не ўзялі... Цяпер дзесь бадзяецца. Кепска яму без вас.

Ён падняўся.

— Вы збіраецеся ісці? — нечакана спалохана вырвалася ў яе.

— Не... ісці не збіраюся. Цягнік у мяне ў сем гадзін раніцы, ды гэта ўжо і неістотна.

Пранізліва, як сірэна, зазваніў будзільнік. Расплюшчыла вочы: сем гадзін раніцы. Уключыла святло начніка. Абвяла вачамі пакой... шафа бліснула ўсімі трыма створкамі, як агромністая льдзіна. У кутку стаяў тэлевізар. Пяць гваздзікоў здаля чырванелі ў вазе. Паднялася з канапы, прайшла на кухню. На стале на маленькім падносе стаялі кубачкі і нямытая кававарка і ў той жа момант яна закрычала... Не, гэта відавочна ёй не прымроілася, не ўдалося: за сталом на табурэтцы сядзеў хтосьці, ці штосьці маленькае і жудаснае. Памешвала тоненькай ручкай каву ў кубачку і пакалыхвала ножкамі, абутымі ў зялёныя боты з шырокімі халяўкамі... Яна яшчэ чула свой крык, а прывід, як з'явіўся, гэтак і знік. І ўсё ж, гэта было!.. Было! Яна бачыла...

Дзесьці праз месяц ёй закарцела памяняць кватэру. Сяброўка паабяцала пазнаёміць яе з чалавекам, які ўмомант зробіць любы абмен. І вось гэтае знаёмства адбылося. Яны стаялі ля ўваходу ў метро... Яна — з гладка прычасанымі валасамі, што толькі падкрэслівала ейны прыгожы лоб, і ён — высокі, усмешлівы, гаваркі, яшчэ даволі малады мужчына.

— Ніякіх праблем, — запэўніваў ён. — Хочаце ў Зялёным Лузе, хочаце на Паўднёвым Захадзе... Я — спец па абмене, як для вас, за самы малы працэнт!

І голас яго быў такі прыцягальна мяккі, і позірк свяціўся такой лагоднасцю, адным словам, гэтае вымушанае знаёмства абяцала быць вельмі і вельмі прыемным... Гэта яе хвалявала надзвычай. Сэрца білася, білася, ды так моцна, што слухаючы гэтага, яшчэ амаль незнаёмага мужчыну, яна не звярнула ніякай увагі на даволі моднае скуранае кепі, нацягнутае ледзь не на самыя вочы, і зялёныя боты з кароткімі шырокімі халяўкамі.

Ёсць такое каралеўства!

Мая Чырвоная — вялікая выдумшчыца. Менавіта гэта вызначэнне апошнім часам усё часцей уплятаецца ў абавязковы набор ганаровых эпітэтаў, якімі звычайна характарызуюць яе настаўніцкую дзейнасць. І сапраўды, М. Чырвоная, педагог сальфеджыо 1-й Мінскай музычнай школы імя Л. Александроўскай, — не толькі ўдумлівы і спрактыкаваны настаўнік, не толькі дасканалы знаўца прадмета, які яна выкладае, але й чалавек, у сваёй дзейнасці цалкам далёкі ад руціны і коснасці. Складаную тэарэтычную дысцыпліну, якая амаль для ўсіх музыкантаў-пачаткоўцаў усё адно што вышэйшая матэматыка, яна падае ў лёгкай, займальнай форме. Вучні схопліваюць і глытаюць музычныя правілы нібыта гуляючы, з ахвотай. Пры гэтым, як паказвае практыка, іх веды ў выніку аказваюцца грунтоўнымі і дазваляюць паспяхова працягваць музычную адукацыю, не атручваючыся "ядам" нудотнай тэорыі.

Летась на паліцах кнігарняў з'явілася і вокамгненна была раскуплена, пацвердзіўшы нашы прагнозы (гл. "ЛіМ" за 11.05.2001 г.), "Вясёлае сальфеджыо" М. Чырвонай — вершаваны аповед пра асноўныя правілы і паняцці музычнай граматы. Сёлета імгненна разляцеўся і паўторны тыраж гэтай кніжкі. Але тым часам нарадзілася новая — "Музычнае каралеўства", — зноў-такі, зробленая ў супрацоўніцтве з выдавецтвам "Чатыры чвэрці".

Гэта вясёлая казка ў вершах. Пра тое, як "нотки — славные трещотки", "три регистра — три министра" ды іншыя жыхары казачнага музычнага каралеўства вырашылі, нарэшце, скласці музыку. Пры гэтым кожны з іх пачаў выхваляцца адно перад адным сваімі вартасцямі, спрачацца і даводзіць, што ён — самы лепшы, самы годны і неабходны. У спрэчках, як вядома, нараджаецца ісціна. Вось і М. Чырвоная "адшукала ісціну", умудрыўшыся ўціснуць у кожны маналог-пахвальбу максімальную колькасць тэарэтычнай інфармацыі для маленькіх чытачоў. Гэта інфармацыя засвойваецца міжволі, як славуты 25-ы кадр, — бо захапляючыя падзеі казкі імкліва разгортваюцца!

Чытаючы гэты яскравы аповед, я зноў і зноў захаплялася ўменнем М. Чырвонай гаварыць пра складаныя рэчы на даступнай і зразумелай мове, захаплялася яе талентам рыфмаплёта і незвычайным пачуццём гумару. Тым, якую колькасць спецыфічнай літаратуры яна пераарала, каб скласці, напрыклад, унікальны раздзел "Хто будзе выконваць музыку падчас свята", дзе найпадрабязным чынам расказана аж пра 35 (!) музычных інструментаў. А менавіта — дадзена іх поўнае знешняе апісанне, ахарактарызаваны асаблівасці гучання і гісторыя ўзнікнення, прыведзены прозвішчы кампазітараў і назвы твораў, у якіх той ці іншы інструмент саліруе. І ўсё гэта — вершамі, прычым, зноў-такі, з поўным захаваннем сюжэта і інтрыгі казкі!

Адным словам, "Музычнае каралеўства" — выдатны ўзор спалучэння сур'ёзнага зместу і займальнай формы аповеду. У выніку — двайная карысць: дзеці чытаюць казку, а заадно засвойваюць тэорыю музыкі. Але ў кніжцы ж ёсць яшчэ і малюнкі-размалёўкі, якія кожны маленькі чытач можа аздобіць на свой лад. Плануецца таксама і выданне "Музычнага каралеўства" на аўдыёкасетах. Мая Чырвоная ўжо запісала тэкст кніжкі на аўдыёстужку і мяркуе праілюстраваць яго гучаннем адпаведных музычных інструментаў.

Кніжку "Музычнае каралеўства" ахвотна купляюць не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі (прыкладам, у Пецярбургу, куды трапіла частка тыражу), яе асобнікі трапілі на Украіну, нават у Францыю, Германію, Польшчу, Ізраіль.

Вольга БРЫЛОН

Навучыць прафесіі творцы

РОЗДУМ ПРА БЕЛАРУСКУЮ МАСТАЦКУЮ ШКОЛУ, ЯЕ НАДЗЕІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

XX стагоддзе прынесла беларускай мастацкай культуры шмат самых разнастайных і безумоўных здабыткаў. (Пра цяжкія страты, наіўныя ілюзіі і горкія расчараванні — размова іншая). Сярод найбольш важкіх дасягненняў нацыянальнай культуры ў прасторы мінулага стагоддзя — стварэнне беларускай *мастацкай школы*. Менавіта ў другой палове і напрыканцы XX стагоддзя ў Беларусі склаліся не проста прафесійныя, але і ў значнай ступені адмысловыя, сапраўднага еўрапейскага кшталту *школы тэатральныя* (тут найперш вылучаецца акцёрская школа); *выяўленчых мастацтваў* (графіка, жывапіс, манументальна-дэкаратыўнае мастацтва, скульптура); асобных відаў дызайнерскай творчасці. У 90-я гады XX стагоддзя нарадзілася ў сценах нашай акадэміі і беларуская *кінашкола*, і яе першыя крокі абнадзейваюць...

Сярод славутых беларускіх творцаў і настаўнікаў, што калісьці закладвалі трывалы падмурак, а потым рупліва, з энтузіязмам будавалі своеасаблівыя "паверхі" нацыянальнай мастацкай школы, вылучаліся Еўсцігней Міровіч, Канстанцін Саннікаў, Дзмітрый Арлоў, Уладзімір Маланкін, Валянцін Волкаў, Віталь Цвірко, Андрэй Бембель, Аляксей Глебаў, Іван Ахрэмчык, Анатоль Анікейчык, Пётр Крохалеў, Павел Любамудраў, Валянцін Гусеў, Павел Масленнікаў, Віктар Тураў і многія іншыя дзеячы тэатральнага і выяўленчага мастацтваў, кінематографа. Мы шануем іх памяць і ў меру сваіх магчымасцей імкнёмся развіваць і ўзбагачаць назапашаны вопыт разнастайных мастацкіх школ.

Можна з упэўненасцю сказаць, што новае стагоддзе і тысячагоддзе Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў сустракае з моцным педагагічным патэнцыялам.

Па-першае, ёсць самае галоўнае, вырашальнае — высока-прафесійны прафесарска-выкладчыцкі калектыў, які здольны вырашаць (і ён сёння вырашае!) самыя складаныя задачы ў падрыхтоўцы творчых, навуковых і педагагічных кадраў. Так, на тэатральным факультэце сёння працуюць народныя артысты Беларусі Л.Бжазоўская, Б.Луцэнка, В.Раеўскі, заслужаныя дзеячы мастацтваў У.Забэла, Д.Іванова, Л.Манакова, А.Яфрэмаў, заслужаныя артысты Беларусі З.Белахвосцік, Ф.Варанецкі, У.Грамовіч, М.Кірычэнка, У.Мішчанчук, вядомыя рэжысёры Р.Баравік, А.Гарцуеў, Я.Громаў, В.Грыгалюнас, В.Катавіцкі, А.Ляляўскі, Р.Таліпаў, Б.Утораў, прафесары А.Каляда, І.Курган, А.Шагідзевіч і многія іншыя вопытныя тэатральныя педагогі. На мастацкім факультэце свой багаты творчы вопыт перадаюць народныя мастакі Беларусі Б.Герлаван, М.Данцыг, заслужаныя дзеячы мастацтваў М.Кірэеў, У.Савіч, У.Тоўсцік, лаўрэаты Дзяржаўных прэмій Беларусі А.Арцімовіч, А.Бараноўскі, В.Славук, іншыя вядомыя мастакі — В.Альшэўскі, У.Вішнеўскі, А.Дранец, У.Зінкевіч, Р.Кароткін, А.Ксяндзоў, У.Слабодчыкаў, А.Фінскі, Ю.Хілько і інш. На факультэце дызайна і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва выкладаюць славуты прафесар П.Семчанка і яго вопытныя калегі — Н.Аладава, А.Атраховіч, А.Барташэвіч, В.Бартлава, Л.Бярозкіна, В.Гаўрылаў, Л.Дзягілеў, Э.Жакевіч, М.Казарог, Р.Клімін, І.Конан, А.Красінскі, І.Марозаў, Н.Махнач, Л.Міронава, П.Свентахоўскі, В.Семянько, К.Стрыкелева, Л.Церах, К.Шаранговіч і інш. Шмат вядомых навукоўцаў выкладае на кафедры гуманітарных дысцыплін і кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў — дактары навук С.Вінакурава, У.Конан, А.Сабалеўскі, кандыдаты навук М.Баразна, Э.Герасімовіч, Л.Зайцава, В.Каламіец, І.Крук, Б.Лазука, С.Лакішык, Э.Петэрсон, Н.Юўчанка і інш.

Па-другое, ёсць трывалая і даволі вялікая цікавасць моладзі да творчых прафесій (і гэта ў наш наскрозь прагматычны час!), што пацвярджаецца высокім конкурсам у час уступных экзаменаў.

Па-трэцяе, ёсць пэўны міжнародны аўтарытэт беларускай мастацкай школы (пра гэта яскрава сведчаць перамогі нашых выкладчыкаў і студэнтаў на шматлікіх фестывалях, конкурсах, выстаўках, пленэрах і іншых творчых акцыях) і адпаведны попыт на міжнародным рынку адукацыйных паслуг.

Адначасова ёсць, зразумела, і складаныя, пакуль нявырашаныя праблемы, якія перашкаджаюць больш плённай дзейнасці Акадэміі мастацтваў на ніве падрыхтоўкі і выхавання творчых, навуковых і педагагічных кадраў. Самая застарэлая і цяжкая з такіх праблем — відавочная слабасць матэрыяльна-тэхнічнай базы. Гэта хранічны недахоп плошчаў для аўдыторый і майстэрняў, адсутнасць сучасных тэхнічных сродкаў навучання, недастатковае фінансаванне вучэбнага працэсу і іншых навуковых і творчых патрэб. Я ўжо не кажу пра вострыя сацыяльныя праблемы, якія носяць агульны характар: нізкая заработная плата выкладчыкаў і іншых супрацоўнікаў акадэміі; у значнай ступені сімвалічная стыпендыя студэнтаў і аспірантаў; немагчымасць забеспячэння інтэрнатам усіх іншагародніх студэнтаў, адсутнасць жылля для маладых выкладчыкаў.

Але і ў такіх складаных умовах калектыў акадэміі за апошнія гады здолеў не толькі захаваць свой патэнцыял, але і адчувальна яго ўмацаваць, узбагаціць новымі падыходамі да арганізацыі навучальнага і выхаваўчага працэсу. Так, былі створаны новыя кафедры на тэатральным факультэце (кафедра рэжысуры, кафедра сцэнічнай мовы і вакалу), на факультэце дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (кафедра малюнка, жывапісу і скульптуры). Некаторыя з'явы ў жыцці акадэміі за гэты час пазначаны словам *упершыню*: створаны Савет па абароне кандыдацкіх дысертацый па спецыяльнасці "тэхнічная эстэтыка і дызайн"; пачаў выходзіць уласны штогадовы альманах "Запіскі Беларускай акадэміі мастацтваў", падпісаны шэраг пагадненняў аб супрацоўніцтве з творчымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Расіі, Украіны, Германіі, Польшчы, Францыі, і яны пачынаюць прыносіць свой відавочны плён. Значна актывізавалася навуковая і выдавецкая дзейнасць: штогод праводзяцца міжнародныя і рэспубліканскія навукова-творчыя канферэнцыі; шэраг выкладчыкаў з поспехам абаранілі кандыдацкія дысертацыі (і зараз працуюць над доктарскімі); прыкметна павялічылася колькасць апублікаваных манаграфій, вучэбных дапаможнікаў, хрэстаматый і іншых выданняў. Творчыя, навуковыя і педагагічныя дасягненні супрацоўнікаў акадэміі адзначаны шэрагам высокіх дзяржаўных узнагарод: медалямі, ганаровымі званнямі, Дзяржаўнымі прэміямі і спецыяльнымі прэміямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, іншымі ўзнагародамі міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў, выставак, конкурсаў.

Яшчэ адна праблема, якую удалося вырашыць уласнымі намаганнямі за апошні час: наладжана студэнцкае харчаванне, больш таго, кожны пяты студэнт дзённай формы навучання зараз харчуецца *бясплатна* за кошт акадэміі. Гэта стала магчымым дзякуючы таму, што мы пакрысе вучымся *зарабляць* уласныя грошы. Асноўная крыніца нашых заробкаў — платныя адукацыйныя паслугі: тут і павелічэнне прыёму студэнтаў на платнай аснове, у тым ліку і замежных; і адкрыццё (зноў упершыню ў гісторыі акадэміі) падрыхтоўчых курсаў на ўсіх трох факультэтах. На чарзе — адкрыццё ўласнага выдавецтва, якое дазволіць больш эфектыўна вырашаць праблему друкавання вучэбнай, метадычнай, навуковай і іншай літаратуры і адначасова зарабляць на выдавецкіх паслугах. У далейшых нашых "камерцыйных" планах — стварэнне эксперыментальнай вытворчасці на базе некаторых кафедраў факультэта дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, потым — уласнай арт-галерэі. Таксама наспела неабходнасць у рэфармаванні (з улікам сучасных рэалій і аб'ектыўных патрабаванняў) Студэнцкага тэатра. У перспектыве — стварэнне Вучэбнай тэлестудыі, якая можа быць не толькі выдатнай базай навучання студэнтаў, але і падрыхтоўкі арыгінальнай высокапрафесійнай тэлепрадукцыі з камерцыйнымі мэтамі.

Шчыра прызнаюся: пішу гэтыя радкі пра "платныя паслугі і камерцыйныя праекты" з некаторым унутраным псіхалагічным дыскамфортам. Вельмі ўжо складаная, у нечым і супярэчлівая гэта праблема: *творчасць, мастацкая школа* з аднаго боку і... *грошы* — з другога. Але тут нічога не зробіш, рэаліі сённяшняга жыцця (і, па ўсім відаць, жыцця заўтрашняга) прымушаюць шукаць і знаходзіць вырашэнні надзвычай актуальнай і вострай праблемы фінансавання дзейнасці Акадэміі мастацтваў.

Зразумела, асноўная, галоўная роля ў фінансаванні акадэміі належыць дзяржаве. Але трэба прызнаць і другое. Дзяржаўных сродкаў, на вялікі жаль, хранічна не хапае на шматлікія, разнастайныя вучэбныя, творчыя, навуковыя, выхаваўчыя, сацыяльныя, матэрыяльна-тэхнічныя і іншыя неабходныя патрэбы. Адсюль узнікаюць новыя праблемы і цяжкасці.

Тым не менш, патэнцыяльныя магчымасці ўсяго калектыву акадэміі, назапашаны прафесійны вопыт і традыцыі ў арганізацыі навучальнай справы даюць падставы заставацца аптымістам і з пэўнай надзеяй глядзець на далейшыя перспектывы беларускай мастацкай школы ў прасторы XXI стагоддзя.

Тут варта адразу падкрэсліць адну важную акалічнасць: "заставацца аптымістам" — гэта значыць быць у пастаянным творчым пошуку, шмат працаваць, быць нацэленым на

Іх мала: 15 працэнтаў...

Ці ёсць сэнс у наш час аддаваць сваё жыццё музыцы? Можа, лепш працаваць у камерцыі? Ні для кога ж не сакрэт, як доўга трэба вучыцца музыканту і потым карпатліва працаваць. Цяжка назваць яшчэ нейкую прафесію, падрыхтоўка да якой вымагала б штодзённай упартай працы з дзяцінства. Безумоўна, гэта дае шмат для развіцця і ўзбагачэння душы. Ну, а для тых, хто жыве побач і такой працай не займаецца? На іх погляд, мы, музыканты, сапсавалі сабе дзяцінства, а многія з нас пазбавілі дзяцінства і сваіх дзяцей. Нездарма кажуць, што прафесія музыканта — гэта спадчынная хвароба.

Вечнае пытанне: што больш патрэбна чалавеку — добрае аддзенне, ежа, матэрыяльныя выгоды ці багацце душы? Тыя нашы суайчыннікі, хто выбірае духоўнае багацце, застаюцца зазвычай з пустой кішэняй, а тыя, хто выбірае матэрыяльныя выгоды, — спрытна ўладкоўваюцца ў жыцці, мае тоўстую кішэню і пасміхаюцца з нашай духоўнасці. Дрэнна і так і гэтак. Для жыцця зямнога патрэбна і тое, і другое.

Ці можна мірыцца з сітуацыяй, калі музыкант, які нястомна працаваў, авалодаў сваёй унікальнай прафесіяй, ніколі не заробіць сабе на кватэру?

Ведаю канцэртмайстра, якая ў сталым узросце пакінула прафесію і пачала рэкламаваць касметыку. У хуткім часе яна апранула і абула сваю сям'ю, абставіла кватэру, набыла машыну і гэтак далей. Студэнт Беларускай акадэміі музыкі, кінуўшы вучобу на апошнім курсе, неўзабаве зрабіў кар'еру... "бізнесмена". Гандлюючы на рынку, ён аднойчы сустрэў там свайго былога педагога, прафесара, і з усмешкай прэзентаваў яму аправу для акуляраў, якую той не мог купіць на сваю "прафесарскую" зарплату. Ці ж гэта не прыкра? А наогул, колькі добрых, таленавітых музыкантаў пакідае нашу краіну і працуе за мяжой, дзе іх прафесія шануецца і цэніцца значна вышэй!

Некалькі гадоў таму маскоўскія статыстыкі вылічылі, што 15% насельніцтва самааддана будзе займацца любімай працай, нягледзячы на мізэрную зарплату, 65% — пры ўмовах добрай зарплаты, астатнія не будуць працаваць ні пры якіх умовах. Што рабіць? Спадзявацца на тыя 15%, гатовых незалежна ад заробку працаваць на карысць нашай культуры, духоўнасці? Духоўнае жыццё, музыка патрэбныя чалавеку! На маю думку, чым больш людзей будзе цікавіцца і займацца музыкай, тым менш будзе злачынцаў. Але як зрабіць, каб прыгожае кранула душу кожнага?

Мы маем шмат музычных школ і школ з музычным ухілам. А што дае простая музычная школа? Як там вучаць? Чаму большасць дзяцей, скончыўшы музычную сямігодку, больш ужо не дакранаецца да

дасягненне пастаўленай мэты. Іншымі словамі — быць у руху (рух — жыццё!..), не баяцца памылак, эксперыментаў, верыць у поспех сваёй справы.

Напрыклад, беларуская акцёрская школа на працягу XX ст. прайшла адмысловы шлях развіцця. Але гэта развіццё ў асноўным абапіралася на тэхналагічныя асновы акцёрскай творчасці. Сёння нельга не бачыць новых, часам экзатычных фарбаў і адценняў у шматколернай палітры айчыннага сцэнічнага мастацтва, якія ўзніклі як пад натуральным уплывам унутраных законаў творчага развіцця, так і пад моцным (а часам і агрэсіўным) націскам самых разнастайных мастацкіх з'яў, тэндэнцый, стыляў і напрамкаў усяго сусветнага і перш за ўсё еўрапейскага тэатра. Менавіта ў 90-я гады XX стагоддзя перад беларускімі дзеячамі тэатра паўстала задача прынцыповага значэння: з аднаго боку, захаваць уласныя творчыя здабыткі і нацыянальныя традыцыі, з другога — плённа ўспрымаць навацыі іншых тэатральных культур свету. Вырашэнне гэтай надзённай задачы даецца айчынным майстрам вельмі і вельмі цяжка, што мы і бачым у стракатым тэатральным працэсе нашых дзён. Пры тым што ў асяродку тэатральных педагогаў (і не толькі беларускіх, але і нашых калег з Расіі, Украіны, Польшчы і іншых еўрапейскіх краін) не заціхаюць вострыя дыскусіі вакол заўсёды актуальнай прафесійнай праблемы: *як* і *чаму* вучыць будучага майстра сцэны, якія павінны быць тэрміны навучання акцёрскай прафесіі. Тут наогул меркаванні самыя радыкальныя і супрацьлеглыя: ад двух да шасці гадоў. І ў кожнага з бакоў свае досыць важкія аргументы. Свае складанасці і цяжкасці паўсталі ў новым стагоддзі і перад беларускай мастацкай школай. Некаторыя з іх параўнальныя з тымі, што я ўжо выказаў пра тэатральную школу. Гэта — магутны, калі не сказаць ураганны, подых заходняй маскультуры з яе бязлітаснымі законамі рынку. Сённяшнія студэнты мастацкага факультэта (як, дарэчы, і факультэта дызайну) вучацца не толькі ў сваіх настаўнікаў, але яны адначасова вучацца (у некаторай ступені падсвядома, неўпрыкмет) у самых разнастайных мастацкіх салонах з іх канкрэтным рублёвым і валютным падыходам у вызначэнні каштоўнасці творчых задум і здзяйсненняў... Заўважу, гэта прынцыпова новая акалічнасць у жыцці сучаснага беларускага мастацтва (і, натуральна, мастацкай школы!), якая рэальна пераўтвараецца ў неад'емную частку агульнай еўрапейскай культуры. З аднаго боку, можна толькі парадавацца такой інтэнсіўнай інтэграцыі. З другога — нельга не ўбачыць у гэтым сур'ёзнай пагрозы для нацыянальнага выяўленчага мастацтва, яго адметнасці і самабытнасці. Такая небяспека пагражае і беларускай мастацкай школе ў XXI стагоддзі...

Глыбока перакананы: будучыня, перспектывы беларускай мастацкай школы звязаны перш за ўсё з выкананнем асноўнай умовы — заставацца менавіта *школай*. Школай *акадэмічнай*. Мяне асабіста задавальняе прынцыповая пазіцыя прафесарска-выкладчыцкага складу Акадэміі ў падыходах да захавання і развіцця лепшых традыцый акадэмічнай школы (пад лепшымі традыцыямі разумею перш за ўсё рэалістычныя асновы айчыннага мастацтва, яго гуманістычную скіраванасць), да арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу. Гэта самы плённы шлях, бо ён, з аднаго боку, узбройвае студэнта прафесійна, а з другога — дае яму магчымасць праявіць сваю творчую індывідуальнасць і ў рэшце рэшт сказаць нешта новае пра чалавека, яго спрадвечныя пошукі гармоніі і сэнсу...

Безумоўна, асаблівасць нашай акадэміі (у час, так бы мовіць, "штучная" падрыхтоўка будучых майстроў у розных відах прафесійнага мастацтва) прымушае шукаць свае падыходы ў распрацоўцы і рэалізацыі вучэбных праграм. Калі ж гаварыць пра асноўныя мэты і задачы Акадэміі мастацтваў, то яны заключаюцца ў наступных канцэптуальных падыходах, абумоўленых, дарэчы, не суб'ектыўнымі жаданнямі, а аб'ектыўнымі патрабаваннямі часу, законамі развіцця сучаснай цывілізацыі, яе культуры і мастацтва.

Па-першае, акадэмія павінна стаць трывалым падмуркам і асновай *бесперапыннасці мастацкай адукацыі*. Пачатковыя школы мастацтваў, ліцэі, каледжы, вучэльні, падрыхтоўчыя курсы, нарэшце, акадэмія, а далей — адпаведныя курсы перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі (гэта ў першую чаргу тычыцца педагагічных і навуковых кадраў) і так... усё жыццё. *Творча падзінен кожны вучыцца увесь адпушчаны яму тэрмін...*

Па-другое, мы вымушаны ўсвядоміць яшчэ адну важную задачу: акадэмія павінна рыхтаваць не проста *дасведчанага прафесіянала* (гэта таксама вельмі важна!), а творцу *адукаванага* ў самым шырокім сэнсе гэтага слова.

Па-трэцяе, перад акадэміяй стаіць задача практычна асвоіць прынцып *шматузроўненасці* вышэйшай адукацыі. Гэта значыць, што ў нашых студэнтаў павінна быць магчымасць выбару ў атрыманні вышэйшай адукацыі з адпаведнымі тэрмінамі навучання і дакументамі: *дыплом бакалаўра* (вучэбны план разлічаны на чатыры гады); *дыплом спецыяліста* (тэрмін навучання пяць гадоў), *дыплом магістра* (навучанне шэсць гадоў). Зразумела, што адпаведныя вучэбныя планы абапіраюцца на дзяржаўныя адукацыйныя стандарты, што ў сваю чаргу забяспечвае дыпломам Акадэміі мастацтваў міжнароднае прызнанне.

Патрабуе свайго далейшага паглыблення прынцып гуманізацыі вышэйшай адукацыі, больш гнуткага падыходу патрабуе пытанне студэнцкага самакіравання, а таксама праблема правоў і свабод студэнтаў у навучальным працэсе і г.д. *Але пры ўсім гэтым трэба памятаць і пра абавязкі акадэміі перад грамадствам і дзяржавай.*

...Штогод у пачатку ліпеня аўдыторыі і майстэрні Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў напаўняюцца шматгалоссем юнакоў і дзяўчат, што прыехалі з усіх куткоў нашай краіны на своеасаблівае творчае спаборніцтва за права атрымаць студэнцкі білет аднаго з трох факультэтаў — тэатральнага, мастацкага, дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У такія дні — напружаныя, трывожныя, адказныя і адначасова вельмі радасныя — узнімаецца ў душы нейкае асаблівае пачуццё, асаблівы стан, якія цяжка выказаць словамі. Відаць, кожны з выкладчыкаў, хто звязаў свой лёс з жыццём акадэміі, заўсёды перажываў гэту складаную, тонкую і ў нечым шчымлівую гаму пачуццяў. Бо, сапраўды, цікава ж, якая моладзь ідзе ў мастацтва, і адначасова вельмі адказна — у студэнцкія гады навучыць іх прафесіі, навучыць цярпенню, мужнасці і многаму іншаму, што спатрэбіцца потым мастаку ў яго самастойных блуканнях па жыцці і творчасці...

Рычард СМОЛЬСКІ,
рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, доктар **мастацтвазнаўства**, прафесар

МЕРКАВАННЕ

Гайда па райскія яблычкі!?.

27 сакавіка ўсе служкі Мельпамены курылі фіміям сваёй музе ды падымалі чарачку за здароўе яго вялікасці Тэатра. Мы ж, журналісты, пачціва здымаючы капялюшы і рассыпаючы кампліменты, ухвалялі ягоныя здабыткі. Але ўжо назаўтра святочная гарачка адпусціла, і засталіся мы сам-насам з пытаннем — як жа так? Прэм'ер шмат, тэатры працуюць, прэміі падзелены, але сапраўднага ўзрушэння тэатральнай дзеяй няма.

Што самае дзіўнае — акцёры ў нас цудоўнейшыя! Прычым, як засведчылі маскоўскія гастролі віцебскага тэатра імя Якуб Коласа, моцныя, зладжаныя трупы існуюць не толькі ў сталіцы, але і на перыферыі. Сталым майстрам сцэны дапамагаюць талент і вопыт, маладым жа ў нас зараз усюды дарога: дастаткова ўзгадаць маладзежны набытак Купалаўскага і Коласаўскага нацыянальных тэатраў, Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, Гомельскага драмтэатра. ТЮГ на адноўленай эксперыментальнай сцэне паказаў Юлію Палубінскую і Сяргея Чакярэса з кампаніяй ва ўзрушаючай "Гісторыі кахання Паласатага Ката і сеньярыты Ластаўкі". Нядаўняя выпускніца Беларускай мастацкай акадэміі Ніна Сяўніцкая сыграла ў Беларускім дзяржаўным тэатры лялек ролю, пра якую мараць тысячы актрыс — Ранеўскую ў "Вішнёвым садзе". Адчуваючы "подых у патыліцу", актывізуюцца і акцёры-акадэмікі. Вельмі ўдалым прыкладам гэтай актыўнасці сёлета стаў сумесны праект гандлёвай маркі SERGE і Купалаўскага тэатра — спектакль "Дом, дзе спяць прыгажуні" паводле п'есы Дэвіда Генры Хуана. У гэтым вытанчаным псіхалагічным монаспектаклі пра такіх простых і такіх складаных японцаў буйным планам паказаліся Тамара Пузіноўская і Аляксандр Падабед.

Таксама было б памылкай скардзіцца на адсутнасць цікавай сучаснай драматургіі. У апошнія гады тэатры актыўна ўзяліся за п'есы Аляксея Дударава, Алены Паповай, Сяргея Кавалёва. У гэтым сезоне да іх далучыліся свежыя сілы Мікалая Рудкоўскага і Святланы Бартохавай. Нельга не ўзгадаць і такую папулярную зараз асобу, як Андрэй Курэйчык, які замахнуўся ні больш ні менш як на сапраўдную рэвалюцыю ў тэатры. Малады юрыст за фантастычна кароткі тэрмін не толькі напісаў тузін выбітных, па водгуках, п'ес, але і дамогся іх пастаноўкі ў лепшых тэатрах сталіцы.

Здавалася б, галінкі тэатральнага дрэва растуць і квітнеюць, а райскіх яблычкаў на іх як не было, так і няма. Тут не перашкодзіла б узгадаць, на чым жа гэтыя галіначкі ды кветачкі трымаюцца, чыімі сокамі жывяцца. Як там пачуваецца само дрэва, ці перажыве зімовую непагадзь, ці бачыць вясну? Услед за еўрапейскім тэатрам беларускі ўжо колькі год назад вымушаны быў прызнаць: галоўны ў гэтай справе — рэжысёр. З яго і спытаюць. Мінулагодні фестываль тэатральнай моладзі "Надзея" выявіў толькі два прозвішчы маладых рэжысёраў — Паўла Адамчыкава і Сяргея Тарасюка. Усе ж астатнія рэжысёры фестывальных спектакляў — прызнаныя мэтры. У мэтраў — вопыт і ўлада, але ў іх жа — самапаўторы і ўсталяваная эстэтычная сістэма, ад якой не адмовішся адным махам нават пры вялікім жаданні. Атрымліваецца, што маладыя артысты вымушаны працаваць у старой сістэме каардынат. Нязгодныя выпрауляюцца ў вольнае плаванне, як зрабіў гэта Павел Адамчыкаў з групай купалаўцаў. "Больш, чым дождж" — прыгожая стыльная гісторыя без слоў. Але ж без слоў заўсёды лягчэй... Слова ўвогуле зараз не ў пашане, яго замянілі эфектная музыка (чым грамчэй, тым лепш), светлавыя "навароты", адточаная пластыка.

Але, але... Пакуль тэатральныя залы поўныя, ніводзін спектакль яшчэ не асвісталі. Глядач у нас і сапраўды надзіва ўдзячны. Зала з апладысментамі ўстае напрыканцы кожнага — любога! — спектакля. Што гэта — жаласлівае "дык яны ж стараліся" ці вялікая ўзрушаючая сіла мастацтва? Мне гэта больш нагадвае неразборлівасць: што ні дадуць — усё глядач праглыне і пераварыць. Ды і адкуль яму быць пераборлівым, калі лепшага ён не каштаваў ніколі і нават не ведае, што гэтае лепшае ўвогуле магчыма. Эмоцыі ды спецэфекты, якімі так багаты сённяшнія спектаклі, б'юць па пачуццях, не кранаючы душы. Навошта змест, калі ёсць форма... Тут мне адразу прыгадваецца гранічна просты па форме, але геніяльны па змесце спектакль з папросту банальнай назвай, спектакль, які праславіў напачатку 90-х мінскі Альтэрнатыўны тэатр "Камедыя...". Напісаная Уладзімірам Рудавым п'еса і пастаўленая Андрэем Андросікам са студэнтамі тэатральнага інстытута, яна стала дзіўным спалучэннем народнага беларускага гумару з маладым імпэтам і прагай да творчасці "залатога" курса. Кожнаму, нават выпадкова завітаўшаму ў тэатр гледачу, было зразумела: на сцэне адбываецца нешта дзіўнае, спектакль жыве, змяняецца, дыхае. Стварылася унікальная для нашага тэатра сітуацыя: кожны вечар на сцэне разгортвалася творчае спаборніцтва чацвёркі акцёраў: Ігара Забары, Яўгена Жураўкіна, Артура Шуляка і Святланы Нікіфаравай. Спектакль - выбух, спектакль - свята — такім ён запомніўся тысячам гледачоў, якія не пакідалі ніводнага пустога месца ў глядзельнай зале. А на амаль пустой сцэне красавалася яна, тая самая яблынька, з вялікім, прывабным райскім яблыкам. З той пары асаблівага ўраджаю на смачныя тэатральныя "яблыкі", здаецца , і не было...

Юлія ПАЛАЧАНІНА

На здымку: сцэна са спектакля "З Парыжам скончана!"

Фота Г. ЖЫНКОВА

інструмента, не адчувае патрэбу музіцыраваць? Якая прычына: недасканалая сістэма навучання? Нелюбоў настаўніка да дзяцей? Да самой музыкі? Жорсткая, насычаная праграма, якую неабходна выканаць — колькасць эцюдаў, п'ес, санат?

Ведаю дзяўчынку — яна хадзіла ў музычную школу-сямігодку. Поспехі былі выдатныя. Але ж па сённяшні дзень успамінае, што лаянка ды вокрыкі яе настаўніцы былі нязменнымі спадарожнікамі ўрокаў. Гэтая дзяўчынка не зрабілася музыкантам-прафесіяналам, але ж музыка сёння саграе ёй душу. Яна добра іграе на фартэпіяна, скончыла універсітэт культуры, зняла сваю першую дакументальную стужку і піша дзівосныя вершы. Але ж яна — з тых "15 працэнтаў", што працуюць і займаюцца творчасцю пры ўсялякіх умовах...

Мы жывём у цяжкі час, калі грошы пануюць над душой. Ці мы згубім нашы душы і нашу планету, ці выратуемся? "Прыгажосць уратуе свет"... Але што мы бачым у пачатку 21-га стагоддзя? Злачынствы, войны, тэрор, забойствы, невылечныя хваробы...

Музыка можа і павінна адыграць не апошнюю ролю ў ратаванні душы. Толькі грамадству нашаму шанаваць яе трэба больш, больш уважліва ставіцца і да людзей, якія музыцы аддаюць сваё жыццё. Разумею, што простым павелічэннем зарплаты праблемы не вырашыць. Як казаў Д. Мендзялееў, любоў да справы можа і чэрствы хлеб зрабіць мяккім. Ды ўсё ж... Калі палепшыліся б матэрыяльныя ўмовы настаўнікаў, яны, ужо не заклапочаныя штодзённымі жыццёвымі цяжкасцямі, часцей дарылі б дзецям добрую ўсмешку і краналі іх душы, раскрываючы прыгажосць музыкі. І тыя рабіліся б добрымі людзьмі, здольнымі цаніць хараство душы і прыгажосць зямлі больш, чым тоўстую кішэню. А пакуль... Мы рызыкуем страціць і тыя 15% апантаных.

Вольга СІЗКО-ГАБРЫЕЛЯН,
канцэртмайстар і выкладчык Беларускай акадэміі музыкі

Ад рэдакцыі. Настаўнікі музыкі, вучні, бацькі, дзеячы культуры — усе неабыякавыя людзі! Калі вам хочацца паразважаць з нагоды гэтай публікацыі, пішыце ў "ЛіМ". Слова, як той казаў, — таксама ёсць справа.

Аддзел музыкі "ЛіМа"

Вандроўная творчасць перакладу

ВАЛЯНЦІНЕ ШЧАДРЫНОЙ — 75

Аднойчы Валянціна Шчадрына прызналася: — Я доўга не магла прывыкнуць да Масквы. Разумела, што трэба палюбіць гэты горад, бо ў ім давядзецца жыць, гадаваць дачок, шукаць сваю прафесію. Але як жа, як супакоіць Масквою сваю беларускую душу?.. Пачала шукаць адзіноту, садзілася ў электрычкі і некуды ехала. І вось у іх, у гэтых кароткіх вандроўках, і знайшла сваю першую маскоўскую творчую радасць. Пачалі згадвацца кнігі, якія чытала ў дзяцінстве. Гэта былі беларускія кнігі — творы Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Кандрата Крапівы... Вакол гучала руская мова, гаманілі пасажыры, за вагонным акном мільгалі назвы станцый. І раптам адчула, як беларускія класічныя тэксты самой сабе я пераказваю па-руску. Мусіць, з гэтага я і пачалася як перакладчыца, і з гэтага ж і пачалося маё прывыканне да Масквы... Гэты ўспамін сведчыць перш за ўсё пра тое, што жыццё Валянціны Міканораўны Шчадрыной немагчыма ўявіць без беларускай літаратуры, без любові да роднага... Нарадзілася ў вёсцы Вербавічы Нараўлянскага раёна. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працавала рэдактарам вучэбна-педагагічнага выдавецтва БССР, а таксама вучылася ў аспірантуры пры Інстытуце мовазнаўства АН БССР. У 1952 годзе пачалося маскоўскае жыццё, асноўнай вехай якога з'явілася праца ў сакратарыяце праўлення Саюза пісьменнікаў СССР у якасці кансультанта па беларускай літаратуры. Гэта быў час творчасці, час адкрыццяў, доўгія гады сяброўства з вядомымі беларускімі пісьменнікамі, прапаганда іх твораў, бясконцая перакладчыцкая праца. У 1961 годзе Валянціна Шчадрына пераклала на рускую мову апавяданне Васіля Быкава "Шчасце", а пазней у яе перакладах з'явіліся кнігі Алеся Асіпенкі, Алены Васілевіч, Анатоля Кудраўца, Івана Пташнікава, Яна Скрыгана, Уладзіміра Арлова, Уладзіміра Ягоўдзіка, паасобныя творы Івана Чыгрынава і Міколы Купрэева. Найбольш плённым здабыткам Валянціны Міканораўны трэба прызнаць яе працу над раманамі і аповесцямі Уладзіміра Караткевіча. Гэта менавіта ў яе дасканалых перакладах да рускага чытача прыйшлі "Каласы пад сярпом тваім" і "Чорны замак Альшанскі", "Сівая легенда" і "Дзікае паляванне караля Стаха", а таксама запамінальны "Цыганскі кароль"... Валянціна Міканораўна называе сябе маскоўскай паляшучкай, у спадчыну якой пакінута чарнобыльскае Палессе з магіламі бацькі, маці і брата. А яшчэ яна называе сябе маскоўскай суседкай Уладзіміра Дубоўкі (дарэчы, напачатку сямідзесятых часта сустракалася з паэтам). Масква зрабілася роднай назаўсёды. З радасным сумам успамінае Валянціна Міканораўна маскоўскія электрычкі пяцідзесятых. Гэта з таго часу — вандроўная творчасць перакладу.

М. Д-Л.

Надрукавана ў Маскве

Выйшаў з друку чацвёрты нумар маскоўскага часопіса "Дружба народов". Прыемна адзначыць, што ў гэтай кніжцы часопіса змешчана апавяданне Васіля Быкава "Кароткая песня", паэма Леаніда Дранько-Майсюка "Характар Арменіі" (у перакладзе Вікторы Салаўёвай). Дарэчы, гэтая рэч упершыню ўбачыла свет на старонках "ЛіМа". У гэтым жа нумары Любоў Турбіна надрукавала артыкул "Няўлічаная інтанацыя", які прысвечаны творчасці Андрэя Федарэнкі.

Н. К.

ВІНШУЕМ!

Няхай квітнее сад

Адны пісьменнікі актыўна ўдзельнічаюць у тым, што мы называем "літаратурны працэс" — выступаюць на ўрачыстых імпрэзах, ладзяць прэзентацыі, бяруць удзел у дыскусіях.

Іншыя прысутнічаюць у згаданым працэсе толькі сваімі творамі. І гэтага, у прынцыпе, бывае дастаткова, каб прыцягваць увагу і прымусіць гаварыць пра сябе. Бо літаратурны працэс — гэта толькі вытворная з'ява ад літаратуры, апошняя ж, як вядома, ствараецца не ў залах і не на сцэнах, а толькі сам-насам з сабою, у прысутнасці Таго, Хто над намі.

Марыя Вайцяшонак ніколі не рабіла прэзентацый і творчых вечарын. Не песціць яе лёс і кнігамі. Тым не менш апошнім часам пра пісьменніцу ўсё часцей і часцей гавораць, адкрываюць для сябе яе напружаную псіхалагічную прозу, у якой адлюстроўваецца і даследуецца свет сучаснай вёскі, больш складаны за любыя багемна-філасофскія віры.

Марыя Вайцяшонак — з тых, пра каго прынята гаварыць "чалавек складанага лёсу". Напэўна, лепш гучыць займеннік гэтага — "чалавек з біяграфіяй".

Марыя нарадзілася ў 1942 годзе ў горадзе Змяінагорску Алтайскай вобласці. Больш-менш дакладна яна можа назваць толькі год — дату свайго нараджэння Марыя Антонаўна не ведае, не дапамаглі і архіўныя росшукі. Пісьменніца нарадзілася ў сям'і ссыльнага польскага асадніка з Пастаўшчыны. Маці — беларуская сялянка засталася там, у прамерзлай сібірскай зямлі. Гэтак жа, як і бацька. Як і шмат хто з родных. У дзетдоме ўзрост маленькай Марысі напісалі прыблізна, на вока. Пасля была сям'я цёткі , якая ўзяла на выхаванне дзвюх асірацелых пляменніц, што выжылі ў сібірскай высылцы. Пра гэтую сям'ю, пра жыццё ў хаце з земляной падлогай пісьменніца ўспамінае, як пра самае светлае і добрае, што спазнала ў жыцці. І тая любоў да людзей, тое спачуванне да іх, імкненне зразумець і шчырае захапленне кожнай праявай прыгожага, што адгукаюцца ў кожным апавяданні Марыі Вайцяшонак, напэўна, таксама ў вялікай ступені — адтуль. Бо толькі любоў спараджае любоў.

Пасля атрымання сярэдняй адукацыі Марыя Вайцяшонак працавала на Мінскім камвольным камбінаце прадзільшчыцай, адначасова вучылася завочна ў Беларускім дзяржаўным універсітэце на філалагічным факультэце. Пасля універсітэта ў 1972 годзе па ўласным жаданні пайшла працаваць вясковай настаўніцай, хоць быў шанс застацца ў горадзе, неяк больш зручна, на прагматычны погляд, уладкаваць жыццё. Працавала ў школах вёсак Боркі, Роўбіцк Пружанскага раёна, Схоліна, Дунілавічы Пастаўскага раёна, у Мядзелі. З 1974 года — на журналісцкай працы ў "Сельской газете". Увесьчасныя камандзіроўкі "ў глыбінку", лёсы людзей, што паўставалі за кожным лістом, за кожным рэпартажам далі неацэнны матэрыял для будучай прозы. Пазней Марыя Вайцяшонак працавала ў часопісах "Нёман", "Беларусь", у штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва". У Саюз пісьменнікаў Марыя Вайцяшонак уступіла ў 1990 годзе.

Друкавацца пісьменніца пачала з 1959 года. У 1988 годзе выдала зборнік нарысаў "Сярод блізкіх людзей", у 1993 — зборнік апавяданняў "Жанчына перад люстэркам". І вось сёлета — доўгачаканы, але выдадзены без дапамогі дзяржаўных выдавецтваў , у многім выніковы зборнік прозы "Сад цнатлівасці". Размова пра гэтую кнігу — яшчэ наперадзе, і размова грунтоўная і ўдумлівая. Чытачам нашага штотыднёвіка запомніліся апавяданні пісьменніцы, кожнае з якіх — прыкметная з'ява ў літаратурным жыцці. Нездарма Марыя Вайцяшонак у свой час атрымала прэмію "ЛіМа" за лепшую публікацыю года ў жанры прозы. Творы пісьменніцы ў перакладзе на рускую мову друкаваліся ў папулярных маскоўскіх выданнях.

Марыі Вайцяшонак — 60 гадоў. Вядома, пісьменніца можа запярэчыць і адмовіцца ад свайго юбілею, уцячы ад абавязковай для ўсіх рысы — бо не любіць усяго афіцыйнага і абавязковага. Ёсць жа падстава — невядомая сапраўдная дата нараджэння.

Ад усяе душы віншуем нашу сталую аўтарку, цудоўную пісьменніцу і выдатнага чалавека, Марыю Антонаўну Вайцяшонак, з днём нараджэння. Жадаем ёй творчага плёну — каб узрасталі новыя сады, каб новыя і новыя чытачы з'яўляліся ў яе мудрай і кранаючай прозы.

Н.К.

На здымках:
1. У вёсцы Лучай на Пастаўшчыне
2. Фларэнцыя. Італія. 2001 г.

Абразкі

Янка Галубовіч жыве і працуе ў Маладзечне. Ён з'яўляецца аўтарам васьмі кніг прозы. Сярод іх — "Пастарайся стаць чалавекам", "Гронка каліны", "Гром на світанку", "Янотавы абяцанкі" і іншыя.

26 мая Янку Галубовічу споўнілася 60 гадоў. Свой юбілей празаік сустрэў у добрым творчым настроі, пра што сведчаць новыя апавяданні.

Віншуючы з юбілеем, жадаем Івану Іванавічу моцнага здароўя, творчага неспакою і плёну.

Заяц і бярозавік

Хоць на дварэ стаялі апошнія дні сакавіка, але надвор'е не дужа радавала. Нізка над будынкамі вісела неба: цёмнае, ажно вусцішнае. З ацяжэлых хмар безупынку сыпаўся густы снег. У садзе, прыгінаючы долу маладзенькія яблынькі, гуляў вецер, балюча, нібы шротам, апякаў вострымі іголкамі твар.

Хацеў падацца ў лес, па бярозавік, але вырашыў пачакаць да раніцы. "Кажуць, раніца за вечар мудрэй", — суцешыў сябе.

І сапраўды. Як у ваду глядзеў, калі падумаў так. Раніцою прачнуўся, глянуў у акно і заўсміхаўся. Праз хмары сонейка прабілася, і снег ісці перастаў. Толькі лічаныя сняжынкі каля зямлі мітусіліся, выбіралі месца, дзе лепей упасці. У невялікіх лужынках купаліся, ажно заходзіліся ад радасці, шэрыя вераб'і.

У лесе ўжо цвілі пралескі, дзе-нідзе паабапал дарогі жоўтымі агеньчыкамі свяціліся галоўкі гусінай цыбулькі, пераклікалася дробнае птаства, дзесьці наводдаль, толькі рэха па лесе кацілася, барабаніў па сухадрэвіне дзяцел.

За палянкаю, каля невялікага балотца, куды прывяла мяне пакручастая сцяжынка, раслі высокія стройныя бярозы. Часта, ці не першы, тут я спускаў бярозавік. Але на гэты раз мяне апярэдзілі. Ля многіх бяроз ужо стаялі на пяньках, а то і проста на зямлі шкляныя і пластмасавыя пасудзінкі, віселі цэлафанавыя мяшэчкі. І раптам моцна затахкала, забілася ад хвалявання ў грудзях сэрца. Непадалёку, бокам ад мяне, ля шклянога слоіка з бярозавікам сядзеў шэры, з чорнымі кончыкамі вушэй і маленькім пушыстым хвосцікам, які бялеў сняжынкаю, заяц. Ён піў з пасудзінкі бярозавік. А калі ўдосталь паласаваўся ім, стаў лапкай сабе пыску мыць. Абмакне лапку ў бярозавік і далей марафет на мордачцы наводзіць.

Пад нагамі трэснула сухая галінка, і заяц падскочыў, а потым ірвануўся і пабег, не спыняючыся.

Ішоў дамоў і шкадаваў, што спалохаў зайку, хаця не сумняваўся, што ён яшчэ не раз прыбяжыць бярозавікам паласавацца.

Спагадлівы бусел

Стаяла цёплая летняя раніца.

Касіў на поплаве траву.

Трава была густая, высокая, бы той чарот.

Касілася кепска. Каса раз-пораз то цалавала наском зямлю, то пяткай зразала траву ажно да самага пяску. Хоць ад вёскі, з-за пагорка, насычаны пахам кветак, гуркоўнікам і кропам, лёгкімі парывамі налятаў лагодны вятрыска, але і гэта не дапамагала. Пакуль скончыў пракос, змок, як пацук.

Недзе праз гадзіну на поплаў прыдыбаў дзядзька Кастусь, матчын брат, худы, маўклівы, нават сярдзіты з выгляду з вялікім чырвоным — знак вайны — шрамам праз усю шчаку, і работа пайшла спарней.

Калі пакінулі поплаў, дзень хіліўся да скону. Мяккай барвай золата клаліся на макаўкі прырэчных дубоў касыя праменні сонца.

Падышлі да Віліі і вырашылі трошкі пакупацца. Як па камандзе сталі здымаць з сябе штаны, мокрыя ад поту майкі.

І раптам непадалёку ад нас, мо ў метрах дваццаці, апусціўся ля затокі бусел. Апярэнне ў птаха белае з чорным на крылах, а ногі і дзюба доўгія, чырвоныя.

— У гэтага бусла ажно дзве жонкі, — усміхнуўшыся, загадкава сказаў дзядзька Кастусь.

— Як гэта? — здзівіўся я.

— Не спяшайся, зараз сам пабачыш.

Бусел тым часам адшукаў жабу, падняўся на крыло і паляцеў да буслянкі, якая месцілася на верхавіне ўсохлага дуба.

Праз колькі хвілін бусел зноў апусціўся ля затокі. Зноў злавіў жабу, падскочыў на сваіх доўгіх нагах, адарваўся ад зямлі і паляцеў. Але цяпер не да буслянкі на ўсохлым дубе, а ўзяў крыху правей, на пагорак. На ім стаяла старая, амаль без галін ліпа. Таксама з буслянкаю.

— Месяц таму ў нас жудасная навальніца была. Шалеў вецер, дрэвы з коранем вырываў, — працягвае гаварыць далей дзядзька Кастусь. — Бусла з буслянкі на ліпе маланкаю забіла. Так бусел, які на дубе жыве, замяніў яго. І сваіх дзяцей корміць, і пра чужых не забывае. Адным словам, спагадлівае сэрца ў птаха...

А бусел то прылятаў да затокі, то зноў уздымаўся на крыло. Вядома, са здабычай.

Глядзеў на спагадлівага птаха, нават купацца перахацелася, і радаваўся за яго.

А душу зберагла маладую...

Ліст быў як ліст, як большасць лістоў рэдакцыйнай пошты — з вершамі. Здзіўляла іншае: узрост аўтаркі вершаў — спадарыні Окуневай. Юліі Герасімаўне пераваліла на дзевяты дзесятак — нарадзілася яна ў вёсцы Свяча Бешанковіцкага раёна ў сям'і вясковага настаўніка ажно ў 1920 годзе. Вучыцца пачала ў Віцебску, адразу пайшоўшы ў чацвёрты клас. Вышэйшую адукацыю атрымала на літфаку Ленінградскага педагагічнага інстытута імя А. І. Герцэна (скончыла ў 1941 годзе). Працавала ў школах (Баку, Камарын, Лельчыцы, Мазыр, Цешкаў), у Мазырскім настаўніцкім, а пасля педагагічным інстытуце (выкладала сучасную рускую мову, уводзіны ў літаратуразнаўства, выразнае чытанне). Вершы піша з трынаццаці гадоў, але ўсе даваенныя ў вайну згубіліся. На нейкі час вярталася да паэзіі ў 1949 годзе, у 1962—64 гады, азвалася гэтая цяга нечакана ў 1994 годзе, калі пераехала на жыхарства ў Мінск. Першая публікацыя была за мяжой (у 1996 годзе ў перакладзе на англійскую мову), летась і сёлета вершы Ю. Окуневай друкаваліся ў "Нашай ніве" і ў "Родным слове". І вось — "ЛіМ". Аб вартасцях паэтычных спроб Юліі Герасімаўны хай мяркуе чытач. А не надрукаваць іх было б грэшна — хоць бы з павагі да ўзросту аўтаркі і да яе пашанотнай прафесіі педагога-літаратара.

Аддзел літаратуры

Юлія ОКУНЕВА

Але Міхайлаўне ХОДАН
і ўсім, хто прыходзіў
да мяне з дабром

•

Мілыя твары, далёкія, блізкія...
Вас не забыць у жыцці!
Сціплыя, шчырыя
і прамяністыя, —
Хто вам казаў, што рабіць, куды йсці?
Неслі вы ў свет дабрыню і спагаду,
Веру, Надзею, Любоў.
Ў спрэчках са злом не былі вы адзаду,
Трэба было — падымаліся зноў.
Кружацца думкі бурштынавай нізкаю.
Светлыя цені плывуць па сцяне.
Мілыя твары, далёкія, блізкія,
Быццам у німбах стаяць ля мяне.

4.10.2000 г.

Паразуменне

Не частуй і не купляй дарункаў.
Ад нязгоды — не ўпадай ў адчай.
Лепш у сэрцы той куток адзіны,
Дзе жыву яшчэ я, адшукай.

Я часцей за ўсё маўчу у смутку,
Бога за адну цябе малю,
Кожнаю крывінкаю сваёю
Ад бяды цябе я засланю.

Але ты не чуеш і не бачыш,
Не прымаеш, што кажу табе.
Знаю: сэрцам горнешся да згоды,
Розум жа усё чагосьці жджэ.

Без цябе, дачка, мне вельмі цяжка.
Адгукніся сэрцам — праўда ў ім.
Толькі пахіліся — і пабачыш:
Знікнуць роспач і адчай, як дым...

12.10.2000 г.

•

Кіруйцеся ў жыцці
не розумам, а сэрцам:
Яно — ад Бога.
Яно заўсёды адзавецца
На ласку і трывогу.
Жывіце ў згодзе з ім,
Як яно просіць
І як дыктуе.
А розум "супраць" і "за"
Узважыць
І сэрца ваша
Ціха ўратуе.

24.10.2022 г.

•

Не зняважце народ ні помстай,
ні ганеннем, —
І скажа вам пра ўсё, чаго ён хоча.
Ёсць розум у яго, і сэрца ёсць, і вочы,
Адно — знікае шматгадовае цярпенне.

25.01.2002 г.

•

Шмат гадоў па табе я сумую.
Самы светлы ўспамін — гэта ты.
Не маўчы, напішы, зноў прашу я.
Ну хоць разік, але — напішы!

Мы, вядома, даўно ўжо не тыя,
Расхінаецца бездань шырэй.
Але, як і ў гады маладыя,
Ты мне ўсё даражэй, даражэй.

Не кажы, што не хочаш, не можаш
Анічога мяняць у жыцці.
Шмат гадоў ты мне сэрца трывожыш,
Самы светлы ўспамін — гэта ты!

12.10.2000 г.

•

Мы прынеслі яму гваздзікі.
Ён нібыта чакаў:
У яго правай руцэ —
Васількі.
Снег рыпеў пад нагамі,
Запарошваў плечы
І ляжаў на брывах,
на шчацэ.
— Добры дзень! Добры дзень!
З нараджэннем цябе!
Над табой —
сто дзесяты гадок...

І жыве на бацькоўскай зямлі
Бяссмяротны Максімаў радок!

10.12.2001 г.

•

У знямозе, у злосці,
У адчаі, у роспачы, брудзе
Нараджаліся
брыдкія словы —
І жывуць у незабудзе.
Кружляюць у паветры,
Б'юць па тварах, па душах,
Працінаюць наскрозь, як кулі.
Супрацьстаяць ім з дзяцінства
Мушу.
Гады прамінулі,
А яны, неадмытыя,
непрыбраныя,
Мове чалавечай нежаданыя,
Запаўзаюць у кніжкі
І на экраны.
Хто нарэшце паставіць заслон,
Хто скіне брыду пад адхон?!

21.11.2001 г.

•

У гэтым гаршчку
Даўным -даўно
Бульбу варыла мама.
Варыла й капусту
Таксама,
Але бульбу найперш зберагла
Памяць...
Палаў агонь. Вада кіпела.
І бульба зверху ружавела
І нават трошкі падгарала.
Сям'я вячэры ўжо чакала.
Нарэшце на стале гаршчок,
Пры ім — капуста, агурок,
Скрылёк каляндравага сала
(Яго заўсёды не ставала),
Вакол сям'я сядала есці,
І кожны знаў сваё там месца,
Дзяды, бацькі і мы, малыя, —
Тады усе яшчэ жывыя...
Даўно было.
Гаршчок той — напамінам
Аб тым, што адышло,
Ды з памяці маёй не сцерлася,
Вадой скрозь пальцы
Дасюль не працякло.

01.02.2002 г.

ІМПРЭЗЫ

"Запалі імгненне"

Гэтая вечарына стала магчымай дзякуючы нядаўняй паездцы да землякоў паэта Анатоля Вярцінскага. Менавіта тады, калі лепельчане ўшановалі Анатоля Ільча ў гонар яго сямідзесяцігоддзя, і нарадзілася гэтая ідэя — запрасіць мясцовых паэтаў і бардаў у Мінск. А паколькі сярод удзельнікаў юбілейнай вечарыны была і кіраўнік тэатра "Зніч" Галіна Дзягілева, то і месца для выступлення было выбрана на сцэнічнай пляцоўцы тэатра "Зніч" — Чырвоны касцёл.

"Запалі імгненне", — так назвалі лепельскія паэты і барды гэтую вечарыну. І ім сапраўды ўдалося запаліць імгненне сустрэчы (а яна доўжылася больш як дзве гадзіны), сваім высокім натхненнем, цеплынёй і шчырасцю. Калі імёны Іны Мароз і Сташкі Грыніч (Людміла Барадзейка) ужо вядомыя па публікацыях у "ЛіМе" і іншых выданнях, то з большасцю гасцей, сярод якіх былі Ніна Шутава, Святлана Якубоўская, Аляксандр Жураўскі, Міхаіл Тарасаў, Уладзімір Седзін і іншыя, мінчане, якія прыйшлі на сустрэчу, знаёміліся ўпершыню. І ўражанне аказалася вельмі прыемным. Пра гэта засведчылі паэты Леанід Дранько-Майсюк, Навум Гальпяровіч, барды Алесь Камоцкі і Аляксандра Вашчанка, якіх лепяльчане запрасілі на сваё свята.

І свята атрымалася. Свята паэзіі і песні, імгненне, якое дапамаглі запаліць землякам Анатоль Вярцінскі і Галіна Дзягілева.

Н. К.

Жыцця глыбінныя віры

Нямала прыхільнікаў паэзіі Міколы Мятліцкага завіталі ў Музей Янкі Купалы на прэзентацыю яго новай кнігі паэзіі "Жыцця глыбінныя віры". Слова пра паэта сказалі Алесь Пісьмянкоў, народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч (яна ж прачытала і некалькі вершаў М. Мятліцкага), Віктар Шніп, Віктар Праўдзін, Мікола Шабовіч. Апошні не прамінуў магчымасці "выдаць на-гара" і некалькі сваіх пародый на вершы "віноўніка ўрачыстасці", якія былі прыняты, як кажуць, "на ура".

Мікола Мятліцкі пазнаёміў прысутных са сваімі новымі творамі, распавёў пра тое, як пісалася кніга. Напрыканцы сустрэчы вершы паэта прагучалі ў выкананні навучэнцаў Мінскага каледжа сферы абслугоўвання, якія дружна наведалі гэтую цікавую імпрэзу. Яны ж падарылі М. Мятліцкаму цэлую "галерэю" ілюстрацый да яго твораў.

Віктар МІКАЛАЕЎ
Фота М. ШАБОВІЧА

Павіншавалі калегі

Творчасць Міколы Шабовіча добра вядомая яго калегам — педагогам і студэнтам Дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. Танка. Ён пастаянны ўдзельнік усіх паэтычных вечароў і іншых мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў навучальнай установе.

Вось і прэзентацыю сваёй новай кнігі "Падары мне сваю адзіноту", якая выйшла ў выдавецтве "Мастацкая літаратура", Мікола Віктаравіч рашыў правесці сярод сяброў і калег.

Яна адбылася ў зале рэдкай кнігі, куды сабраліся аматары паэзіі, якіх, як аказалася, ва універсітэце нямала.

Вядучы вечарыны галоўны рэдактар Беларускага радыё, паэт Навум Гальпяровіч падзяліўся сваімі ўражаннямі пра творчасць М. Шабовіча. Выступілі прарэктары навучальнай установы Сяргей Кабяк, Валерый Талкачоў, дэкан факультэта беларускай філалогіі Аляксандр Лугоўскі, а таксама сябры-літаратары — Ганад Чаркасян і Кастусь Цыбульскі.

І, вядома, гучалі вершы аўтара кнігі ў яго ўласным выкананні, а таксама песні, напісаныя на яго словы.

Н. К.
Фота І. МАРАЦКАЙ

На радзіме паэта

У Мёрах прайшлі святкаванні з нагоды 60-годдзя паэта Сяргея Панізніка. Землякі шчыра віталі літаратара словам і песняй. Школьная моладзь, калегі па пяры, прадстаўнікі мясцовых уладаў адзначалі важкі ўклад Сяргея Панізніка ў айчынную літаратуру, у справу захавання культурнай спадчыны рэгіёна. Сам Сяргей Сцяпанавіч прадставіў выставу "Радаводныя вытокі", складзеную з уласных архіўных матэрыялаў.

Святлана ГУК

г. Віцебск

"Пацісну я руку герою..."

Сабраліся яны ў сваім Уруччаўскім Доме афіцэраў ахвотна і дружна. Не так ужо і часта адбываюцца тут падобныя сустрэчы. Гэтым разам урачыстасць прысвячалася 120-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа. Ім, нядаўнім школьнікам, цікава было пачуць гасцей з Мінска.

Увяла ў курс справы слухачоў загадчыца бібліятэкі М. Пазнякова і перадала слова старшаму навуковаму супрацоўніку Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Івану Курбеку. Даўні работнік гэтай установы, ён прыгадаў рэдкія факты з жыццёпіса народнага паэта, запыніўся на яго дзейнасці ваеннага часу. За нястомную рупнасць у гады ліхалецця пясняр быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі, а за цыкл вершаў у 1946 годзе атрымаў Дзяржаўную прэмію (тады — Сталінскую 1-й ступені).

З асаблівай увагай слухалі вайскоўцы Міхася Канстанцінавіча Міцкевіча, малодшага Коласавага сына, доктара тэхнічных навук. Ён расказаў пра лёс свайго брата Юркі, які загінуў у першы год вайны. Брат быў добры, людскі і ў сям'і, і да людзей. Прамоўца зазначыў, што сёлета, 1 мая, было б яму 85. Яшчэ Міхась Канстанцінавіч успомніў пра ваеннае бытаванне бацькі ў далёкім Ташкенце.

Хораша далучыўся да сваіх прамоўцаў-папярэднікаў Уладзімір Паўлаў. У 1956 годзе ён служыў у Савецкай Арміі і помніць журботны дзень — 13 жніўня. Вестка пра смерць любімага песняра апякла сэрцы не толькі воінаў-беларусаў. Паэт прачытаў некалькі патрыятычных вершаў.

На заключэнне І. Курбека звярнуўся да абаронцаў Айчыны словамі Якуба Коласа:

Пацісну я руку герою,
Скажу яму, як друг, як брат:
Як многа сілы ў сабе тоіш,
Зямлі вялікай сын, салдат!

"Гэта быццам пра вас, дарагія хлопцы, пісаў вялікі пясняр у пераможным 45-м. Будзьце нашымі абаронцамі толькі ў мірным часе!" — заключыў ён.

Алег КУЛЬЧЫЦКІ

Ушанавалі юбіляра

На філалагічным факультэце Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф. Скарыны адбылася навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная творчасці пісьменніка-земляка Анатоля Бароўскага і прымеркаваная да ягонага 60-годдзя. Пра аўтара кніг прозы і публіцыстыкі "Каліна пад акном", "Азірніся ў каханні", "Цеплыня", "Чорны бусел — белы цень" і іншых гаварылі пісьменнік Васіль Ткачоў, дацэнт педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка, прэзідэнт Таварыства беларускай школы Алесь Лозка, кандыдат філалагічных навук Сяргей Ханеня, студэнты Марына Страха і Марына Азёма, а таксама васьмігадовы ўнук Анатоля Бароўскага Андрэй.

Анатоль Бароўскі вядомы і як мастак. У гэтым яшчэ раз мусілі пераканацца ўдзельнікі канферэнцыі, якім асабліва спадабаліся карціны "Леснічоўка", "Ноч", "Надвячорак", "Узбалотак" і іншыя, якія экспанаваліся на выставе, арганізаванай ва універсітэце.

Васіль БАРХАНАЎ

г. Гомель

Складайце песні, песняры!

Кіраўнікі свабоднай эканамічнай зоны "Гомель-Ратон" падтрымліваюць цесныя сувязі з мясцовымі пісьменнікамі, журналістамі і мастакамі — запрашаюць іх прымаць удзел у розных конкурсах, па магчымасці аказваюць спонсарскую падтрымку ў выданні кніг. І гэтае сяброўства працягваецца. Нядаўна мастачка Святлана Наздрына-Платніцкая перамагла ў конкурсе на лепшую карціну, якая павінна была стаць сімвалам СЭЗ, а вялікай групе журналістаў уручаны прэміі за асвятленне ў сродках масавай інфармацыі дзейнасці "Гомель-Ратона". Кіраўніцтва СЭЗ звярнулася да паэтаў і кампазітараў з просьбай напісаць песню, якая б стала своеасаблівым яе сімвалам. Аб'яўлены конкурс. Лепшая песня будзе ўганаравана грашовай прэміяй.

Васіль ТКАЧОЎ

г. Гомель

Віленскія мроі напачатку дваццаць першага стагоддзя

У Вільні я не быў гадоў з дзесяць — з тае пары, як усталявалася мяжа між Літвою і Беларуссю. Праўда, перад закрыццём мяжы я зрабіў рывок на Свіраны — завяршаў кніжачку "Свіранскія крэскі", і мне хацелася да ўсталявання мяжы сабраць хоць жменьку жывых звестак з радзімы аўтара "Дудкі Беларускай", і я ўгаварыў сына з'ездзіць на Віленшчыну на ягонай васьмёрцы яшчэ бязвізава. І мы з'ездзілі. З тае пары больш не быў ані ў Вільні, ані на Віленшчыне, страціў усялякае ўяўленне, як зараз ладзяцца паездкі ў старажытную беларускую сталіцу, якія ўмовы пераезду на памежжы. Дый да ўсяго не ўсё ў мяне было яшчэ ўпарадкавана з пашпартам. То я, як кажуць, асабліва і не рыпаўся. Але от пачалі гаварыць, што ў самым блізкім часе Літва збіраецца скасаваць ільготу для шасцідзесяцігадовых — бязвізавы праезд на Літву, і гэта мяне неяк актывізавала: трэба з'ездзіць, пакуль гэта льгота ёсць! А тут прыйшла запросіна з Вільні з Таварыства беларускай мовы Віленскага краю прыехаць на адкрыццё памятнай дошкі на радзіме Францішка Багушэвіча. То як было не з'ездзіць! Была добрая нагода пахадзіць па Багушэвічавых Свіранах, яшчэ раз угледзецца ў іхнія абрысы, паслухаць гаворку Францішкавых землякоў, іхнія легенды, паданні.

Я пачаў ліхаманкава наладжваць душу на гэтую паездку. Нарыхтаваў цэлы нататнік пытанняў. Завітаў у літоўскае пасольства, каб высветліць там, ці ўсё ў парадку ў маім пашпарце, ці трэба якісь яшчэ дадатковыя штампы. "Не! — адказалі там. — Нічога пакуль вам не трэба. Купляйце білет і едзьце сабе са сваімі клопатамі!" Гэта мяне акрыліла! От гэтак проста, як даўней было: купляй білет і едзь. І гадзіны праз тры-чатыры будзеш у чароўнай Вільні дыхаць беларускай гісторыяй. А тут яшчэ такая нагода: адкрыццё памятнага знака на радзіме Францішка Багушэвіча. Лепшай нагоды і не прыдумаеш, каб не наведаць Вільню. На гэтую паездку я ўскладаў вялікую надзею. Найперш хацеў наведаць сваякоў стрыечнага Багушэвічавага ўнука Янкі Тарчэўскага, забраць ягонае настальгічнае ліставанне з Хошчна. Планаваў я напаткацца і з колішнімі кушлянцамі Саевічамі. Апрача гэтага, у мяне выспявае кніжачка пра жыццё Францішка Багушэвіча ў Вільні, асобныя старонкі якой ужо напісаны. То не шкодзіла б асвяжыць віленскія ўражанні і аб самой Вільні. Ехаў я ў Вільню з даручэння Таварыства беларускай мовы і меў ад яго не адно заданне. І найперш вёз падбор беларускіх кніг для суседняй з Свіранамі Савічунскай бібліятэкі. Але гэта была чыста тэхнічная рэч. Галоўнае — мая прысутнасць на адкрыцці мемарыяльнай дошкі ў Свіранах. Яе адкрыццё адбылося шостага красавіка. Адкрыў гэтую імпрэзу старшыня Таварыства беларускай мовы Віленскага краю Юрась Гіль вершам "Памяці Мацея Бурачка". На гэтай імпрэзе прагучалі і іншыя вершы і згадкі пра Францішка Багушэвіча, пра родную зямлю, пра вернасць і адданасць ёй. Пра Францішка Багушэвіча згадвалі госці з Мінска, актывісты віленскага Таварыства беларускай мовы: Леакадзя Мілаш, Алег Мінкін, лекар Станіслаў Міхна ды іншыя. З цікавасцю на Багушэвічавай імпрэзе паслухалі вершы свіранскага электрыка Адольфа Казіміра Вурынскага. Уся імпрэза ладзілася пры мемарыяльнай дошцы з выяваю Францішка Багушэвіча пад спеў у высокім небе свіранскага жаўрука. Да гэтай падзеі Таварыства беларускай мовы Віленскага краю рыхтавалася не адзін год, зладзіла не адну вандроўку па Багушэвічавых мясцінах. Віленцы не адзін раз наведалі, апрача Свіранаў, Рукойнаў, Багушэвічавы Кушляны, Жупраны: набіраліся ў гэтых вандроўках Багушэвічавага духу, моцы. Да сваіх палігрымак віленскія тэбэамаўцы далучалі і дзяцей віленскай беларускай школы.

...Зараз на радзіме Францішка Багушэвіча дзве памятныя дошкі пра слынага свіранца. Адна ў саміх Свіранах, другая — у суседніх Савічунах на будынку бібліятэкі. Кожная з гэтых памятак — нібыта святыя абразы. На іх не грэх і маліцца. Абедзве яны і асвечаны. Абедзве будуць выпраменьваць добрую энергію на тутэйшых люд.

У Савічунах імем аўтара "Дудкі Беларускай" названа і адна з вуліц, якраз тая, на якой Савічунская бібліятэка. Адным сваім бокам з шыльдачкай яна глядзіць з прыгорка на Свіраны. Памяць пра Францішка Багушэвіча на ягонай радзіме ўганаравана, здаецца, няблага. Але, як мне падалося, гэта не ўсіх цешыць. Тутэйшыя"ідэолагі" ў гэтым краі культывуюць польскую мову, польскія ідэі, а тут раптам праз сто шэсцьдзесят два гады з'явіўся якісь Францішак Багушэвіч. У тутэйшай бібліятэцы з'явіліся беларускія кнігі. Сярод іх такія — "Адкуль наш род" У. Арлова, "Любіць Радзіму — шанаваць родную мову" А. Белага, два томікі апошніх выданняў самога Францішка Багушэвіча, "Свіранскія крэскі", кнігі С. Давідовіча, ягоныя мастацкія буклеты, навуковыя зборнікі з публікацыямі пра Францішка Багушэвіча. Сярод іх зборнік "Скарыназнаўства. Кнігазнаўства. Літаратуразнаўства" з аўтографам А. Мальдзіса, Новая кніга А. Трусава "Слоўнік беларускіх псеўданімаў", ахвяраваны Савічунскай бібліятэцы Я. Саламевічам...

Дзялюся сваімі думкамі з Юрасём. Ён пагаджаецца, што ў некаторых з тутэйшых, якія пачуваюць сябе за палякоў, такія настроі ёсць. Некаторыя кажуць: "А ці не зашмат ужо тут Багушэвіча?! — Мемарыяльная дошка ў Свіранах, у Савічунах. Апрача ўсяго, яшчэ ёсць і вуліца імя Багушэвіча". А яшчэ віленскія самаахвярнікі мараць, каб Савічунская бібліятэка атрымала найменне аўтара "Дудкі Беларускай". Плануюць якімсьці знакам уганараваць песнярова імя і ў Рукойнскім касцёле, дзе хрысцілі Багушэвіча.

Пакуль у віленскіх самаахвярнікаў усё атрымоўваецца. Яны маюць падтрымку ад беларусы маглі б і проста 25-га сакавіка кожнага года прыходзіць на слынную віленскую Конную і згадваць тут пра жыццё нашага прарока. Ён якраз на Звеставанне, з усёй сваёй сям'ёй, як тыя буслы, і вярнуўся на Радзіму. Было гэта ў 1884 годзе. Шмат іншых мрояў круцілася ў маёй галаве падчас вандроўкі па Вільні. Але пра іх можна іншым разам і з іншай нагоды. Але тое, што Багушэвічава імя да гэтае пары аніяк не ўшанавана ў Вільні, не можа не здзіўляць. Пра гэта мусяць паклапаціцца як беларускія пісьменнікі, гэтак і іхнія літоўскія калегі.

Гэта справа іхняга гонару!

Паміж іншым, Францішкава імя вельмі добра ўганаравана на Украіне. І даўно. А от Вільня пакуль што стоена маўчыць. І несправядліва: беларускі пясняр, жывучы ў Вільні, дбаў пра развіццё горада, яго культуру, тэатральнае і музычнае жыццё. Адну пару нават уваходзіў у гарадское "прысутства" па кватэрным падатку. Нарэшце, не адзін год ён быў летапісцам Вільні. У Вільні ён напісаў лепшыя свае творы, якія дайшлі да нас. Тут ён прычакаў свае першыя кніжкі — "Дудку Беларускую" і "Смык Беларусі". Ацалеў і будынак колішняга акруговага суда, дзе Францішак Багушэвіч практыкаваў адвакатам. То ўганараваць Багушэвічава імя ў Вільні і сам

Летувісцкай улады. От каб яшчэ было ўшанавана Багушэвічава імя ў Вільні, дык і зусім было б добра!

У Вільні Францішак Багушэвіч жыў на вуліцы Коннай — зараз Арклю. Вуліца гэтая ацалела. Не ацалеў толькі той дамок, у якім кватараваў Багушэвіч. Ён, як згадваюць Багушэвічавы сучаснікі, быў на рагавіку Коннай і новых галяў — старога віленскага рынку, які меў назоў адну пару Зожжавага, затым Коннага. То тут якраз можна было б і ўшанаваць памяць слыннага беларуса, балазе, між Коннай вуліцай і процілеглай ёй Усіх Святых склаўся невялікі пляц. У адным з куточкаў яго вельмі дарэчы з'явіўся б і помнік слыннаму колішняму віленскаму адвакату і Праўдашукальніку.

Падчас апошняй пабыўкі ў Вільні я доўга круціўся на гэтым пляцы і думаў, што віленскія Бог загадаў. Дый само Францішкава прозвішча ад слова "Бог"!

Хоць сёлетні год і не юбілейны для Францішка Багушэвіча, тым не менш ягонае імя не сыходзіць з старонак перыядычнага друку, з арэны грамадскага жыцця. Не гэтак даўно імем Беларускага Праўдашукальніка названа і сталічная плошча пры тэатры музычнай камедыі. Ушанавана Францішкава імя клубам "Спадчына" і ў Старых Дарогах. У майстэрнях нашых скульптараў чакаюць выйсця на гарадскія пляцы і вуліцы гатовыя помнікі. От адзін з іх і ўсталяваць бы ў Вільні. Чакае, вядома, усталявання помніка аўтару "Дудкі Беларускай" і сталічная плошча, названая яго імем.

Уладзімір СОДАЛЬ

Фота А. КАЛЯДЫ

ПАМЯЦЬ

Ён адкрыў для нас краіну замкаў

Кожны з нас ведае постаці Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага, Льва Сапегі і Францішка Скарыны, Францішка Багушэвіча і Максіма Багдановіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа. Гэтыя знакамітыя людзі зямлі беларускай жылі ў розны час, але пакінулі свайму народу кнігі, вершы, паэмы, у якіх адлюстравана нашая тысячагадовая гісторыя і дзякуючы якім мы жывём у незалежнай еўрапейскай краіне.

Да такіх людзей адносіцца і вядомы беларускі гісторык, археолаг, публіцыст, грамадскі і палітычны дзеяч Міхась Ткачоў.

Міхась Ткачоў нарадзіўся ў старажытным беларускім горадзе Мсціславе 10 сакавіка 1942 года ў сям'і настаўнікаў. Яго бацька Аляксандр Рыгоравіч, настаўнік пачатковых класаў, загінуў пад Ленінградам у 1942 годзе, так і не пабачыўшы свайго адзінага сына. Маці, таксама настаўніца, гадавала яго разам з другімі дзецьмі з айчымам, былым афіцэрам Савецкай Арміі. Пасля службы айчыма ў Германіі сям'я зноў вярнулася ў Мсціслаў, дзе Міхась скончыў школу.

Пасля школы ён паступіў на гістарычны факультэт БДУ, але паколькі не меў двух гадоў працоўнага стажу, мусіў першы курс вучыцца завочна і да вясны 1960 года працаваць у прыгарадным калгасе. Будучы студэнтам, Міхась пазнаёміўся з беларускімі пісьменнікамі, мастакамі і навукоўцамі. Ён паступова ўсвядоміў сябе беларусам, які мае сваю культуру, мову і гісторыю. Міхась зноў, як калісьці ў дзяцінстве, стаў размаўляць па-беларуску, а сваю дыпломную працу прысвяціў гісторыі роднага горада. Работа была настолькі выдатная, што яе нават рэкамендавалі да друку. Аднак у выдавецтве маладому гісторыку параілі надрукаваць сабраны матэрыял у мясцовай мсціслаўскай газеце, што Міхась і зрабіў.

Потым гэтыя публікацыі не раз перадрукоўвалі і выдавалі за свае некаторыя несумленныя краязнаўцы.

У 1964 годзе Ткачоў скончыў універсітэт і быў размеркаваны ў горад Жодзіна Смалявіцкага раёна. Выкладаў пяць гадоў гісторыю ў новай школе ў ваколіцах горада, дзе вучыліся вясковыя дзеці з прыгараднага саўгаса "Зарэчны". Потым стаў завучам і яшчэ глыбей уключыўся ў школьнае жыццё. Удзельнічаў у спаборніцтвах па валейболе і баскетболе, у мастацкай самадзейнасці, спяваў, танцаваў, граў на гармоніку і складаў прыпеўкі.

З тых часоў Міхась заўжды лёгка знаходзіў агульную мову з дзецьмі, падлеткамі, а пазней і са студэнтамі.

У Жодзіне Ткачоў ажаніўся і жыў са сваёй сям'ёй, жонкай і сынам, у невялічкай прышкольнай старожцы.

Мара стаць сапраўдным гісторыкам не пакідала яго. І ён падаў дакументы ў аспірантуру Акадэміі навук у Інстытут гісторыі. Нягледзячы на выдатна здадзеныя экзамены, яго не хацелі прымаць, і толькі дзякуючы дапамозе пісьменніка, акадэміка, сакратара аддзялення грамадскіх навук Пятра Глебкі Міхася Ткачова залічылі ў аспірантуру на спецыяльнасць "археалогія".

Тэма яго дысертацыі "Ваеннае дойлідства Беларусі XIII — XVIII стст." была вельмі цікавай і зусім недаследаванай. Трэба было працаваць у архівах і бібліятэках, а таксама праводзіць раскопкі. За тры гады аспірантуры Міхась Ткачоў напісаў дысертацыю, прычым на роднай беларускай мове, і паспяхова абараніў яе ў 1972 годзе.

За гэтыя гады ён абследаваў рэшткі 13 каменных абарончых збудаванняў. Гэта Камянецкая вежа, замкі ў Лідзе, Крэве, Гродне, Міры, Гальшанах і іншыя старажытныя ўмацаванні. Паўсюль яму дапамагалі мясцовыя вучні.

Найбольш цяжкія раскопкі ў ліпені 1969 года праходзілі на Навагрудскім замчышчы. Стан замка вельмі засмучаў Міхася Аляксандравіча. На яго тэрыторыі на розных відах транспарту збіраліся аматары пагуляць, якія каля святых сівых муроў, некалі апетых у творах Адама Міцкевіча, пілі гарэлку, гарлапанілі і раскідвалі смецце.

Каб змагацца з імі, Ткачоў атрымаў ад мясцовай міліцыі дазвол паставіць за свой кошт транспартны знак, які забараняў уезд на замчышча. Таксама за сваю аспіранцкую стыпендыю ён зрабіў бляшаную шыльдачку, прываравую да металічнай стойкі, якая паведамляла, што "Навагрудскі замак — помнік культуры X—XVII стст." і ахоўваецца дзяржавай. З дапамогай вясковых вучняў з прыгарадных вёсак Брацянка і Эканомія Ткачоў усталяваў гэты знак на падстаўцы з валуноў ля ўезду на замчышча.

І яны перамаглі. Валацугі больш на замкавую гару не ездзілі. Затое сюды завіталі Уладзімір Высоцкі і яго жонка, славутая Марына Уладзі, якая нават спусцілася ў глыбокі чатырохметровы археалагічны раскоп, каб агледзець старыя муры Навагрудскай вежы.

Доўга потым памочнікі Міхася Ткачова разглядалі аўтограф Марыны Уладзі і Уладзіміра Высоцкага, які на простым канверце напісаў наступнае: "Заўсёды знаходзьце цікавае".

Пасля абароны дысертацыі Ткачоў працягваў вывучаць беларускія замкі і працаваў у Інстытуце гісторыі ў аддзеле археалогіі. Прычым па-ранейшаму жыў з сям'ёй у Жодзіне і мусіў штодня дабірацца да Мінска электрычкай.

У 1977 годзе выходзіць яго першая кніга "Замкі Беларусі", якая адразу зрабіла Ткачова вядомым даследчыкам. Кожны вучань і студэнт, пагартаўшы яе і паглядзеўшы унікальныя архіўныя фотаздымкі і малюнкі, адкрываў для сябе новую Беларусь — краіну замкаў, адлегласць між якімі складала не болей за 20 км.

У 1978 годзе ў Гродне адкрыўся універсітэт, і Міхася Ткачова запрасілі на пасаду дацэнта, а потым і загадчыка кафедры. Там ён нарэшце атрымаў кватэру і жыў разам з жонкай, сынам і малодшай дачкой. У Гродне ён паспяхова піша і абараняе (у 1987 г.) доктарскую дысертацыю "Арганізацыя абароны гарадоў Беларусі XIV — XVIII стст."

Дзякуючы гэтай і іншым працам Міхася Ткачова мы даведаліся пра шматлікіх абаронцаў Бацькаўшчыны ў часы крыжацкай і татарскай навалаў, шматлікіх нападаў на Беларусь царскіх і шведскіх войскаў.

Менавіта Ткачоў расказаў пра славутага гарадзенскага рыцара Давыда Гарадзенскага, стваральніка шматпрыступкавай ракеты Казіміра Семяновіча, гераічную абарону Віцебска, Магілёва, Слуцка і іншых беларускіх гарадоў у XVII ст. У 1989 годзе ён атрымлівае званне прафесара.

Аднак сувязі яго з моладдзю не перарываюцца. Ён шмат гадоў разам з іншымі беларускімі археолагамі даследуе старажытны Віцебск, прычым у раскопках бяруць удзел сотні віцебскіх вучняў і студэнтаў.

12 сакавіка 1986 года ў Гродне ён разам з супрацоўнікамі Інстытута біяхіміі АН БССР і выкладчыкамі літаратуры Гродзенскага універсітэта стварае клуб аматараў гісторыі і культуры Беларусі "Паходня". Пасяджэнні клуба праводзіліся кожны чацвер, на іх збіралася шмат моладзі і людзей рознага ўзросту і рознай адукацыі, якія цікавіліся беларускай гісторыяй. Паступова ў клубе стваралися розныя секцыі па інтарэсах: гісторыка-краязнаўчая, мастацтва, літаратуры і мовы і нават дзіцячая, для вучняў старэйшых класаў.

Перад слухачамі клуба выступалі знакамітыя беларускія гісторыкі, пісьменнікі, навукоўцы. У Гродна прыязджалі Анатоль і Валянцін Грыцкевічы, Адам Мальдзіс, Генадзь Каханоўскі, Мікола Ермаловіч. Давялося не раз сустракацца з сябрамі клуба і адказваць на іх шматлікія пытанні і аўтару гэтага матэрыялу. Вясной і летам сябры клуба выязджалі ў вандроўкі па родным краі, наведвалі старадаўнюю беларускую сталіцу Вільню, унікальны музейны комплекс у вёсцы Гудзевічы Мастоўскага раёна, які стварылі мясцовыя вучні пад кіраўніцтвам вядомага краязнаўцы і настаўніка Алеся Белакоза.

Актыўна праводзіліся і суботнікі, на якіх гродзенская моладзь удзельнічала ў археалагічных раскопках, а таксама расчышчала ад смецця рэчышча ракі Гараднічанкі.

У гэтыя часы пад кіраўніцтвам Міхася Ткачова праводзіліся раскопкі рэшткаў сядзібы, дзе нарадзіўся Кастусь Каліноўскі. Даследчыкам вельмі пашанцавала, яны знайшлі асабістую пячатку бацькі знакамітага змагара за незалежнасць Бацькаўшчыны.

Захоплены хваляй чарговага беларускага адраджэння, Міхась Ткачоў актыўна ўключаецца ў палітычнае жыццё краіны. У 1988 годзе ён уваходзіць у аргкамітэт па стварэнні БНФ, а потым на І з'ездзе БНФ у Вільні абіраецца намеснікам старшыні гэтага ўплывовага палітычнага руху.

У пачатку 1989 года жыхары Гродна вылучаюць Ткачова кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР, і ён выйшаў у другі тур выбараў, нягледзячы на шалёнае супраціўленне мясцовай наменклатуры.

У гэтым жа годзе ён прыязджае ў Мінск, дзе працуе загадчыкам рэдакцыі гісторыі выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя", а з красавіка 1992 года становіцца яго галоўным рэдактарам. Менавіта ён стаіць ля вытокаў такіх унікальных выданняў, як шматтомная энцыклапедыя гісторыі Беларусі, энцыклапедычныя даведнікі "Археалогія і нумізматыка Беларусі", "Архітэктура Беларусі", "Беларусь".

Сам Міхась Ткачоў напісаў у гэтыя выданні сотні артыкулаў па розных аспектах сярэднявечнай беларускай гісторыі, археалогіі і архітэктуры. Міхась Ткачоў плённа працуе і над гісторыяй нацыянальнай сімволікі. Яго артыкул у самай масавай газеце "Советская Белоруссия" "Нацыянальныя сімвалы: Народ і гісторыя", надрукаваны ў кастрычніку 1989 года, прачыталі тысячы грамадзян Беларусі.

Плённа займаецца Міхась і адраджэннем беларускай сацыял-дэмакратыі. У 1990 годзе ён узначаліў аргкамітэт па стварэнні палітычнай партыі БСД, а ў сакавіку 1991 года на ўстаноўчым з'ездзе Грамады абіраецца яе кіраўніком. Партыя адразу становіцца ўплывовай палітычнай сілай і стварае сваю фракцыю ў Вярхоўным Савеце.

Аднак нягледзячы на невылечную хваробу, празмерную працу на палітычным і навуковым накірунках, Ткачоў не забывае пра працу з моладдзю.

У 1990 годзе ён бярэ актыўны аддзел у абмеркаванні праекта "Палажэння аб сярэдняй агульнаадукацыйнай школе БССР", друкуе свае прапановы па стварэнні канцэпцыі нацыянальнай беларускай школы ў "Настаўніцкай газеце", змяшчае ў часопісах "Роднае слова" і "Маладосць" свае мастацка-публіцыстычныя творы, прысвечаныя гістарычным постацям нашай гісторыі Усяславу Чарадзею і Давыду Гарадзенскаму.

Адначасова з гэтым ён піша кнігу апавяданняў па гісторыі Беларусі для пятага класа сярэдняй школы. Аднак цяжкая хвароба нырак, напружанае і складанае жыццё падкасілі гэтага волата нашага адраджэння і 31 кастрычніка 1992 года яго не стала.

Пахаваны Міхась Ткачоў на знакамітых Маскоўскіх могілках. Яго шматлікія сябры на сабраныя народныя грошы паставілі на магіле прыгожы помнік работы вядомага беларускага скульптара Аляксандра Шатэрніка, у цэнтры якога змешчаны барэльеф М. Ткачова на фоне Мірскага замка. Таму, паважаны чытач, калі будзеш на Маскоўскіх могілках у Мінску, не забудзь пакласці да гэтага помніка сціплы букет з белых і чырвоных кветак — колераў нашага адраджэння другой паловы XX стагоддзя, даследаванню якога і прысвяціў свае нядоўгае жыццё славуты грамадзянін незалежнай Беларусі Міхась Ткачоў.

Алег ТРУСАЎ

Аляксей Майсейчык

12 мая 2002 года перастала біцца сэрца выдатнага чалавека, загадчыка кафедры беларускага літаратуразнаўства Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А. Пушкіна, кандыдата філалагічных навук, прафесара Майсейчыка Аляксея Антонавіча.

Аляксей Антонавіч нарадзіўся 4 кастрычніка 1936 года ў вёсцы Гошчава Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Гошчаўскай сярэдняй школы ў 1955 годзе ён паступіў на філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. Пушкіна. Інстытут закончыў з адзнакай і быў накіраваны на працу настаўнікам рускай і беларускай мовы і літаратуры ў родную школу.

У лютым 1966 года А. Майсейчык закончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР.

З гэтага часу і да канца сваіх дзён ягонае жыццё было звязана з Брэстам і Брэсцкім дзяржаўным педінстытутам (цяпер універсітэт). У лютым 1967 года Аляксей Антонавіч абараніў кандыдацкую дысертацыю. З 1975 па 1980 гады А. Майсейчык быў дэканам філалагічнага факультэта. У 1992 годзе яму было прысвоена званне прафесара. За гады працы ва універсітэце прафесар А. Майсейчык узначальваў кафедру беларусазнаўства, а ў апошнія гады — кафедру беларускага літаратуразнаўства.

Сфера яго навуковых і творчых інтарэсаў была звязана з гісторыяй беларускай літаратуры, распрацоўкамі ў галіне тэорыі верша, краязнаўства і рэгіянальнай палескай праблематыкі, даследаваннем творчасці Якуба Коласа, Анатоля Вялюгіна, Міхася Рудкоўскага, Алеся Разанава, Ніны Мацяш, Васіля Жуковіча, Леаніда Дранько-Майсюка, Міколы Пракаповіча, Алеся Каско, Аляксея Філатава і іншых.

На працягу доўгага часу Аляксей Антонавіч узначальваў Брэсцкае рэгіянальнае аддзяленне беларусістаў, актыўна супрацоўнічаў з абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Аляксей Майсейчык быў выдатным педагогам, выхавацелем многіх пакаленняў студэнтаў, настаўнікаў-філолагаў.

Прафесар А. Майсейчык плённа займаўся навуковай працай: ён з'яўляецца аўтарам шматлікіх падручнікаў і дапаможнікаў для студэнтаў ВНУ, настаўнікаў і вучняў сярэдніх школ, артыкулаў у энцыклапедычных і акадэмічных даведніках, актыўна выступаў у рэспубліканскім і мясцовым друку.

Аляксей Антонавіч быў шчырым патрыётам Беларусі, інтэлігентам у самым высокім значэнні гэтага слова, добрым сябрам і дарадчыкам, жыццярадасным і чулым чалавекам.

Светлая памяць пра дарагога Аляксея Антонавіча назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах, памяці сяброў, родных і блізкіх.

Калегі, сябры

ГОСЦІ

Здавён знаёмыя матывы

Многія з гэтых песень здавён былі распаўсюджаныя і на Беларусі — у мястэчках, у гарадах. Да вайны яны гучалі на тэатральных падмостках і па радыё, матывы яўрэйскага песеннага фальклору апрацоўвалі, выкарыстоўвалі ў сваёй творчасці беларускія кампазітары...

Страшныя наступствы мінулай вайны, а потым — нівеліравання нацыянальнай годнасці, што адбіліся ў лёсе як беларусаў, так і прадстаўнікоў іншых народаў, гістарычна з'яднаных на нашай зямлі, — гэтыя наступствы ўсё ж не вынішчылі ў людзях цікавасць да сваіх каранёў, імкненне адрадзіць і захаваць этнічную адметнасць. Сёння жыццё паспрыяла нават заснаванню Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур. Ён чарговы раз пройдзе ў Гродне, і каларытнае мастацтва беларускіх яўрэяў, безумоўна, будзе яркай кветкай у букеце фестывальных уражанняў. Гэта — летам. А нядаўнія ўражанні ад выканання песень на ідзіш звязаныя з канцэртам у Мінску Андрэ Аходла.

"Шалом" — так называлася праграма нашага госця з Польшчы, спевака, рэжысёра і мастацкага дырэктара тэатра "ATELIER" імя Агнешкі Асецкай. У цудоўным інструментальным атачэнні (скрыпка, фартэпіяна, кантрабас, перкусія) багаты на сакавітыя абертоны голас Андрэ Аходла ўспрымаўся як свежая мастацкая з'ява і сярод нешматлікіх сёння сур'ёзных музычных візітаў, і сярод надакучлівых прапаноў шоу-бізнеса.

Песні народныя і створаныя прафесійнымі аўтарамі, — пра каханне, пра родны дом; задуменныя і тужлівыя, танцавальныя і застольныя, — літаральна пражываліся артыстам, які праз дакладную і выразную інтанацыю, тэмпарытмічныя акцэнты перадаваў публіцы эмацыянальны стан і вобраз твора. Ён "прайграваў" кожную спеўную мініяцюру, захоўваючы пачуццё меры, без усялякага сцэнічнага папулізму. А публіка, ужо амаль адвучаная ад нармальных жывых спеваў пад жывы класны і акустычны акампанемент, не стрымлівала свайго захаплення вакальным і драматычным майстэрствам саліста, выбітнай ігрой музыкаў.

Андрэ Аходла, ураджэнец Германіі, жыве і працуе ў Польшчы. Тэатр, які ён узначальвае, месціцца ў Сопаце, дзе, між іншым, штогод ладкуе фэст "Тэатральнае лета". Прэм'ера канцэрта "Шалом" адбылася пяць гадоў таму, атрымала высокія адзнакі ў прэсе.

Самы папулярны ў Польшчы выканаўца песень на ідзіш завітаў да нас дзякуючы ініцыятыве Польскага інстытута — па дарозе з гастроляў у Скандынавіі да Летувы. Канцэрт "Шалом" адбыўся ў зале Беларускай акадэміі мастацтваў.

С. Б.

Суфлёр

ПАДКАЗКІ—АНОНСЫ—ПАРАДЫ АД "ЛіМа"

"Чалавек і грамадства"

У мэтах павышэння ролі тэатральнага мастацтва ў развіцці нацыянальнай культуры, актывізацыі работы па стварэнні новых твораў драматургіі, якія адлюстроўваюць духоўны свет чалавека, яго месца і ролю ў гісторыі і сучасных пераўтварэннях жыцця, міністр культуры Леанід Гуляка падпісаў загад, у якім гаворыцца:

Правесці з 25 красавіка 2002 года па 25 сакавіка 2003 года рэспубліканскі конкурс на стварэнне п'ес для тэатра пад дэвізам "Чалавек і грамадства".

Палажэнне

аб конкурсе на стварэнне п'ес для тэатра пад дэвізам "Чалавек і грамадства"

Мэты і задачы

Мэтай конкурсу з'яўляецца павышэнне ролі тэатральнага мастацтва ў развіцці нацыянальнай культуры, узбагачэнне **рэпертуару** новымі арыгінальнымі творамі драматургіі, якія ў высокамастацкай форме адлюстроўваюць важнейшыя падзеі гісторыі і сённяшні дзень, лепшыя традыцыі, абрады, фальклорнае багацце беларускага народа, раскрываюць духоўны свет чалавека ва ўсіх яго складанасцях і ўзаемасувязях з мінулым і сучаснымі пераўтварэннямі жыцця.

Правядзенне конкурсу мае таксама сваёй мэтай замацаваць і развіць практыку сумеснай творчай працы беларускіх літаратараў і дзеячаў тэатра ў працэсе нараджэння новага арыгінальнага сцэнічнага рэпертуару.

Умовы і парадак правядзення

Матэрыялы для ўдзелу ў конкурсе прымаюцца з 25 красавіка 2002 года па 25 студзеня 2003 года. На працягу двух месяцаў пасля гэтага тэрміну журы падводзіць яго вынікі.

На конкурс прымаюцца шматактовыя п'есы і інсцэніроўкі па творах беларускай літаратуры для драматычнага тэатра, п'есы і інсцэніроўкі па творах беларускай літаратуры для дзіцячага тэатра.

Прадстаўленыя на мінулыя конкурсы драматургічныя матэрыялы паўторна не разглядаюцца.

На конкурс прымаюцца творы, якія не апублікаваны і публічна не выкананы ў Рэспубліцы Беларусь раней афіцыйнага падвядзення вынікаў. Вынікі абвяшчаюцца не пазней 25 сакавіка 2003 года.

П'есы высылаюцца ў 2-х машынапісных экземплярах (першы і другі — у збрашураваным выглядзе) без указання на іх прозвішча аўтара. Замест гэтага на п'есах прадстаўляецца дэвіз аўтара.

Да конкурснага матэрыялу дадаецца паштовы канверт з пометкай аўтарскага дэвізу, у якім павінны быць: прозвішча аўтара (у адпаведнасці з пашпартам), паштовы адрас, тэлефон, месца працы.

Пры адсутнасці канверта з дадзенымі аўтарам матэрыялы, дасланыя на конкурс, не разглядаюцца. Калі замест дадзеных указаны толькі літаратурны псеўданім аўтара, гэта не лічыцца пацвярджэннем аўтарства на прадстаўлены драматургічны матэрыял.

Распячатванне канвертаў, абнародаванне прозвішча аўтараў адбываецца пасля падпісання пратакола аб выніках конкурсу і праводзіцца ў прысутнасці старшыні і членаў журы.

Матэрыялы высылаюцца на адрас: 220004, г. Мінск, пр. Машэрава, 11, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, упраўленне мастацтваў, "На конкурс п'ес для тэатра".

Конкурсныя матэрыялы прымаюцца ў строгай адпаведнасці з устаноўленымі ў сапраўдным Палажэнні тэрмінамі. Дата прыёму работ, што дасылаюцца поштай, вызначаецца па паштовым штэмпелі.

Заахвочванне ўдзельнікаў конкурсу

Пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі і наступнымі грашовымі прэміямі:

у колькасці базавых велічынь

П'есы для драматычнага тэатра

Адна першая — 165
Дзве другія — 125 (кожная)
Дзве трэціх — 100 (кожная)

П'есы для дзіцячага тэатра

Адна першая — 180
Адна другая — 140
Адна трэцяя — 110

П'есы для тэатра лялек

Адна першая — 65
Адна другая — 55
Адна трэцяя — 45

Інсцэніроўкі па творах беларускай літаратуры

Для драматычнага тэатра — тры прэміі ў памеры 60, 55, 40 базавых велічынь.

Для дзіцячага тэатра — тры прэміі ў памеры 65, 55, 45 базавых велічынь.

З мэтай прыцягнення да конкурсу больш шырокага кола ўдзельнікаў устанаўліваюцца 6 заахвочвальных прэмій, у тым ліку: 3 прэміі па 20 і 3 прэміі па 15 базавых велічынь кожная.

Заахвочвальныя прэміі прысуджаюцца рашэннем журы толькі за стварэнне п'ес.

Творы, якія адзначаны на конкурсе, прапануюцца для пастаноўкі ў тэатрах, па факце пастаноўкі набываюцца Міністэрствам культуры з выплатай адпаведнага ганарару, могуць друкавацца (аднаразова) у спецыяльных выданнях Міністэрства без выплаты за гэта аўтарскага ганарару.

Работа журы

Журы не рэцэнзуе для аўтараў прадстаўленыя імі на конкурс матэрыялы. Адзін экземпляр з дасланых на конкурс матэрыялаў застаецца ў яго арганізатараў, другі — вяртаецца аўтару.

Журы пры неабходнасці можа пераглядаць колькасць і памеры прэмій у межах кожнага раздзела, па якім праводзіцца заахвочванне. Пры гэтым перагляду не падлягае агульная сума сродкаў, што выдаткавана на прэміі ў межах кожнага раздзела заахвочвання.

Журы конкурсу прымае рашэнне на падставе адкрытага галасавання, простай большасцю галасоў. Рашэнне журы не падлягае перагляду з боку арганізатараў конкурсу і з'яўляецца правамоцным, калі ў яго рабоце прымала не менш 2/3 членаў ад поўнага складу.

Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу (для тых, хто мае мінскую прапіску):

кафедра альта, віяланчэлі, кантрабаса
дацэнт — 1,5;
кафедра спеваў
дацэнт — 1;
кафедра харавога дырыжыравання
дацэнт — 1;
кафедра баяна, акардэона
дацэнт — 0,5;
выкладчык — 0,5.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання. Заявы і дакументы накіроўваць на імя рэктара на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30.

Даведкі па тэлефонах: 227-49-42; 226-06-70.

ПАРОДЫІ

Павел САКОВІЧ

Хто падтрымае мараторый?

Пішу пра тое, што не пішацца...
Фіранка на акне калышацца.
. . . . . .
"Не пішацца? І не пішы.
Дазволь папуставаць душы".
Васіль САХАРЧУК

А не хочаш — не пішы,
Захавай спакой душы.
Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

Жаданне ёсць, папера ёсць,
Да мелкатэм'е лезе штось...
Што бачу, зноў кладу ў радок.
Ці будзе з верша нейкі толк?
А можа, кінуць, не пісаць,
Каб даць душы папуставаць?
Хоць з месяц ручку не чапаць...
А ўсе ці змогуць пачакаць?
Сябры, баюся, не ў гумбры:
Не падтрымаюць мараторый!

Замест кароў — веласіпеды

Лугам я іду без мэты.
Думна, светла ў галаве...
Бачу, два веласіпеды.
Спачываюць на траве.
Не адзін, не тры, а — два.
І — прымятая трава.
Хведар ЖЫЧКА

Пайшоў на луг перад абедам —
Люблю за статкам назіраць, —
А там, гляджу, веласіпеды
Замест кароў кругом ляжаць.

І ў сне не бачыў гэткі "статак".
Па два ляжаць ва ўсёй красе —
Мужчынскі й дамскі. Да запчастак
Параспраналіся ўсе!

Відаць, я лішні тут, на лузе...
Рамонак рве мая рука.
Стаю й гадаю ў ціхай скрусе:
Ці дасць хто сёння малака?

Наступны нумар штотыднёвіка "ЛіМ" выйдзе 14 чэрвеня 2002 г.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА ЛіМ

ЗАСНАВАЛЬНІК

Саюз беларускіх пісьменнікаў

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА

У 1982 годзе ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

Галоўны рэдактар

Алесь ПІСЬМЯНКОЎ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Вольга БАРАБАНШЧЫКАВА,
Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Алесь ГАЎРОН — *адказны сакратар,*
Уладзімір МАРУК — *намеснік галоўнага рэдактара,*
Яўген РАГІН,
Людміла РУБЛЕЎСКАЯ,
Віктар ШНІП — *першы намеснік галоўнага рэдактара*

АДРАС РЭДАКЦЫІ:

220005, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:

прыёмная рэдакцыі — 284-8461
намеснікі галоўнага рэдактара — 284-8525, 284-7985

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-8204
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-7985
літаратурнага жыцця — 284-8462
крытыкі і бібліяграфіі — 284-7985
паэзіі і прозы — 284-7985
музыкі — 284-8153
тэатра, кіно — 284-8153
выяўленчага мастацтва — 284-8462
фота-карэспандэнт — 284-8462
бухгалтэрыя — 284-8462
Тэл./факс — 284-7965

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра тыднёвіка "ЛіМ"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
(г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79)

Індэкс 63856 Наклад 2226
Нумар падпісаны ў друк 30.05.2002 г. у 17.30

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715

Заказ 1242

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12